беларуская газета Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Мінску штотыднёва

НАША НІВА

№ 37 (75)
16 сьнежня
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

СЁНЬНЯ Ў ВІЦЕБСКУ ПАЧЫНАЕЦЦА СУД НАД ПАЭТАМ СЛАВАМІРАМ АДАМОВІЧАМ

***

Каляды. Посная Куцьця.
Ня піша пісьмаў арганістка.
Вісіць над установай сьцяг
усенароднага фашыста.

У пераходах прадаюць
падпольную літаратуру,
якую ў Вільні выдаюць
мне невядомыя структуры.

Зіма крыху. Сьняжок ледзь-ледзь.
Бамжы акупавалі крамы,
дзе можна целы свае грэць,
наколкі сінія і шрамы.

Зіма! Вярнулася, дальбог!
Іду з прагляду «Мадэрністаў»,
і кліча штосьці за парог,
у запарожжа рэканкісты.

Славамір Адамовіч
Каляды, 1995



Убей Адамовича!

Убей его, возомнившего
себя поэтом, спасителем.
Поэты — всегда посмертные,
доля спасителя — крест.
Птицы поют в клетке.
Убей, раз уж так ему хочется
называться пророком, синоптиком
и змагаром за нацию.

Убей поэтишку, который
достал своим существованием,
катит бочки на президента,
батоны крошит на КГБ.
Птицы поют в клетке...
Ведь что он знает про ненависть,
и может ли его ненависть к тебе
сравниться с твоей к нему?!

Убей, не возись с мизером,
достаточно канителились:
камера для опущенных —
на зоне — верный конец.
Птицы поют в клетке
особенно трогательно,
если им пережечь крылышко,
перебить ножку или ниточкой
перевязать клюв.

Убей, унизь его мать и мову, бля.
Унизь его идеалишки:
все эти правды, родины —
стремленье к тому, чего нет.
Птицы поют в клетке.
Направь на него своих следователей,
прокуроров, судей, надсмотрщиков,
братву, которой по кайфу
поставить его к ногтю.

Пусть раздушат, размажут гниду
с представлениями о порядочности
по шершавой стене карцера,
как интеллигентскую вошь!
Птицы поют в клетке,
поэты — всегда посмертные.
Пусть каждый займется делом.
Убей, президент!

(брат)

Шанец для нацыяналізму

Палітычныя зьмены апошняга месяца ў Беларусі, а таксама іх зьнешнепалітычны кантэкст прыводзяць да значнай зьмены ідэалягічнай сытуацыі ў краіне. Даўно так непрыхавана антыбеларускаю не выглядала пазыцыя Расеі, якая фактычна дала санкцыю на ўсталяваньне ў Беларусі аўтарытарнай дыктатуры. Што атрымліваецца — усе самыя антырынкавыя лёзунгі й дзеяньні, усе самыя неправавыя заявы й акцыі, усе самыя прарасейскія й антызаходніцкія інстынкты ў гэтай краіне сфакусаваліся на адным чалавеку. І ён актыўна выкарыстоўвае ўсе гэтыя лёзунгі, ставячы знакі тоеснасьці паміж усімі пунктамі сваёй праграмы. Зьнешнепалітычная навізна тут — не хаваючыся, запрацавалі зьнешнія чыньнікі.

Хто можа сёньня супрацьстаяць новай дыктатуры ідэалягічна? Камуністы пацярпелі поўны ідэалягічны крах — іхняя партыя структурна супрацьстаіць рэжыму, які ня бачыць месца для ніводнай партыі, але галоўныя лёзунгі камуністаў належаць ужо рэжыму, які больш удала за камуністаў захапіў сацыяльную базу гэтых лёзунгаў. Лібэралы, чыя ідэалягічная пазыцыя ў Беларусі так і не была выразна агучаную, перажываюць пэрыяд псыхалягічна-настраёвага заняпаду. Менавіта гэтаму колу належыць газэтны выраз: «Жыцьцё не ўдалося!» Заангажаваныя сёньняшнім палітычным момантам тыя колы беларускага грамадзтва, якіх не заўжды адэкватна называюць лібэральнымі, ня маюць у сваім сьветапоглядным багажы такіх каштоўнасьцяў як нацыянальная культура й традыцыяналізм. Але гэтыя канстанты маюць ключавое значэньне для нацыяналізму. І сёньня атрымліваецца — выступаючы за традыцыйныя для сябе прынцыпы, беларускі нацыяналізм супрацьстаіць дыктатуры й адстойвае эфэктыўную эканамічную мадэль разьвіцьця грамадзтва. З усіх ідэалёгіяў, што супрацьстаяць дыктатуры, нацыяналізм мае адныя з найбольш моцных пазыцыяў. Абнаўленьне зьнешняга фактару, калі за самымі брутальнымі сіламі ў Беларусі ўжо выразна бачныя іхнія замежныя фундатары, таксама ўздымае значэньне нацыяналізму як ідэалёгіі. Таму прыйдзецца асобна абмеркаваць праблему ідэалёгіі — яе ролю й функцыі ў сучасным грамадзтве.

Радыкальныя цывілізацыйныя зьмены — праз пашырэньне гарызантальных сувязяў, выбух масавых камунікацыяў, пошук эфэктыўнасьці новай дзяржавы прывялі да крызысу старога ўяўленьня пра ідэалёгію як пра глябальную гісторыка-палітычную сыстэму тлумачэньня сьвету. Усё меней месца ў мазаічным постмадэрнісцкім сьвеце застаецца для ўнівэрсалісцкіх канцэпцыяў. Таму адбылася эвалюцыя ідэалёгіі ад глябальнасьці да сукупнасьці калектыўных уяўленьняў, з дапамогаю якіх усталёўваецца ерархія каштоўнасьцяў.

Беларускі нацыяналізм зацікаўлены ў генэраваньні новых ідэяў, у зьяўленьні новых інстытуцыяў — у разнастайнасьці інстытуцыяў. Гэта азначае захаваньне самога цела Беларусі й разьвіцьцё ў ёй грамадзянскай супольнасьці — той самай сукупнасьці ўяўленьняў. Такім чынам, нацыяналізм паўстае як галоўны абаронца й прыхільнік ідэі грамадзянскай супольнасьці, тым самым вызваляючыся ад ужо непрадуктыўнага балясту глябальнасьці ідэалягічнай сыстэмы. Больш таго — нацыяналізм атрымлівае ў сёньняшняй Беларусі шанец для разьвіцьця.

Алег Дзярновіч

Юры Захаранка:

«Я гатовы ўзяць на сябе цяжар адказнасьці»

Карэспандэнт «НН» Алег Дашкевіч зьвязаўся праз тэлефон з Юрыем Захаранкам і ўзяў у яго інтэрвію.

«НН»: Спадар Захаранка, пасьля паразы дэмакратычных сілаў як, на Вашую думку, выглядае пэрспэктыва дэмакратыі ў Беларусі?

Ю.З.: Ніякай пэрспэктывы. З той прычыны, што ня далзена аб'ектыўнай ацэнкі сытуацыі, не адбылося перагрупоўкі сілаў і асэнсаваньня ролі цэлага шэрагу «вясельных генэралаў» палітычнай апазыцыі.

«НН»: Як будуць разьвівацца дачыненьні паміж уладай і той апазыцыяй, якая існуе сёньня, калі апошняя пазбаўленая нармальных інструмэнтаў палітычнай дзейнасьці?

Ю.З.: Калі браць у цэлым апазыцыйны рух, то, без сумневаў, да веснавога і летняга пэрыяду гэты рух будзе пашырацца. На тое ёсьць шэраг фактараў эканамічнага і зьнешнепалітычнага характару. Трэба рыхтавацца да ўсплеску апазыцыі. Але на гэтым этапе ўсё можа скончыцца лякальнымі крывавымі сутыкненьнямі. Хутчэй за ўсё, гэткае разьвіцьцё неазьбежнае.

«НН»: Як думаеце дзейнічаць Вы асабіста?

Ю.З.: Я ня маю намеру насіўна ставіцца да ўсяго, што будзе адбывацца. Я маю намер акрэсьліць сваю пазыцыю дастаткова прынцыпова і, вядома, я гатовы ўзяць на сябе цяжар адказнасьці.

«НН»: Наколькі ўпэўнена пачуваецца рэжым у сілавых структурах?

Ю.З.: Ён і раней ня быў упэўнены ў гэтых структурах, за выключэньнем асобных спэцыдзелаў. Менавіта з гэтае прычыны пачалі стварацца дадатковыя напаўсакрэтныя аддзелы, дзе пачалі атрымліваць пасады асобы з алмарожанымі мазгамі. Што да сілавых структураў увогуле, то ў аснове сваёй яны былі гатовыя працаваць у канстытуцыйным полі.

«НН»: Ці згодны Вы з думкай сп. Баравога пра тое, што рэжым схільны распачаць рэпрэсіі?

Ю.З.: Гэта абсалютна так, бо адзіны спосаб захаваць сваю ўладу, уладу незаконную, падманам захопленую, гэта — вядома ж, рэпрэсіі. Таму ў пэрспэктыве той, хто думае займацца палітыкай і адыгрываць у ёй істотную ролю, мусіць быць гатовым да гвалту, да знаходжаньня ў турмах, да самых розных правакацыяў.

«НН»: Што, на Вашую думку, павінны рабіць тыя людзі, якія бачаць у дзеяньнях рэжыму пагрозу для грамадзтва? Ці ёсьць структура, здольная аб'яднаць гэтую частку народу?

Ю.З.: Тут трэба пачынаць зь перагрупоўкі сілаў. Сёньняшнія лідары ў сваёй аснове — людзі, якія «не трымаюць удар». Ідэалісты-тэарэтыкі ня здольныя павесьці за сабой людзей. Яны мусяць гэта зразумець і сысьці ў другі ці трэці эшалён.

«НН»: Захад адназначна паставіўся да дзеяньняў рэжыму А.Лукашэнкі. Якой, на Вашую думку, будзе рэакцыя Расеі?

Ю.З.: Я і раней казаў, што рэжым Лукашэнкі будзе дамагацца экспарту сваіх дзеяньняў на тэрыторыю Расеі. Генэраваць гэтыя дзеяньні А.Лукашэнка будзе праз так званую нелегітымную палату і праз пэўныя сілы ў Дзярждуме Расеі. Гэта відавочна. Таму расейскія палітыкі ў асобе таго ж Чарнамырдзіна мусяць добра задумацца, што іх чакае ў найбліжшы час. А іх у наступныя паўгады чакаюць вялікія ўзрушэньні, якія будуць сыходзіць ад уладаў РБ. Дэмакратычныя сілы ў Расеі ня здольныя паўплываць на сытуацыю. Сёньня відаць, што сілы недэмакратычнага кірунку як у Беларусі, так і ў Расеі яўна пераважаюць, і ў найбліжшы час пачнуць свой наступ...

Пошта

Шаноўная рэдакцыя «НН»!

Жыву я ў правінцыйным горадзе з назвай Барань, што побач з Воршай. І вось у гэтым мястэчку, дзякуючы бацькам і настаўніцам пачатковых клясаў, адбылася значная падзея, якую ніхто не заўважыў. 23 вучні чацьвертых клясаў выказалі жаданьне працягнуць навучаньне на роднай мове. І як цяжка ні было, але кляса была створаная, і першую чвэрць вучні яе скончылі лепш за іншых. Вы можаце ўявіць, у якіх умовах знаходзяцца гэтыя вучні. Як распавядаў адзін з бацькоў, у клясе было праведзенае апытаньне: 1) хто прымусіў вас (вучняў) ісьці ў беларускамоўную клясу: а) бацькі, б) настаўніца, в) самі; 2) ці згодныя вы перайсьці на расейскую мову навучаньня? На гэта ўсе дзеці адказалі, што мову выбралі самі і перайсьці вучыцца па-расейску адмовіліся. У наступным годзе мая дачушка павінна ісьці ў першую клясу, і я ня ведаю, ці зможа яна вучыцца па-беларуску. Летась адна жанчына таксама спрабавала аддаць сваё дзіця ў першую беларускую клясу, кажуць, была нават у Менску, але нічога не змагла зрабіць.

Увогуле, што робіцца з нашай краінай, хто ў ёй гаспадар? У мяне такое ўражаньне, што беларусаў хутка будуць адлоўліваць ці, што горш, адстрэльваць.

Цяпер у Барані «трасуць» 22-ю школу. Некаму не спадабалася, што дырэктар школы Ю.Нагорны 19 кастрычніка быў у Менску. Я ня ведаю, зь якой нагоды: можа, да «бацькі» на прыём ці, можа, на апазыцыйны мітынг. Мне, аднак, здаецца, што чалавек езьдзіў па сушкі (вельмі яны ў вас смачныя), таму што на мітынгу я яго ня бачыў, хоць усе аршанцы (больш за 20 чалавек) стаялі гуртом. Шкада будзе, калі чалавек пацерпіць празь нейкія там баранкі.

Яшчэ хачу зьвярнуцца да людзей, якія маюць горшы. Вы маеце магчымасьць укласьці грошы ў будучыню, зрабіўшы невялікія навагоднія падарункі 23 вучням 5 беларускамоўнай клясы 15 СШ г. Барані. Грошай трэба няшмат, а рэкляма вялікая, да таго ж, можа, мне лягчэй будзе сабраць бацькоў і стварыць першую клясу для сваёй дачкі.

З павагай, Генадзь Шэпелеў,
Барань

Нацыя памерла. Няхай жыве Нацыя!

Яшчэ няма факту нацыянальнага Адраджэньня, уздыму, а ёсьць факт подступу да апошняга, негвалтоўнай барацьбы за яго.

Славамір Адамовіч

Толькі свабодная і разьняволеная асоба можа прыйсьці да высновы, што ідэя нацыяналізму зьяўляецца адзінай гуманнай ідэяй выратаваньня нацыі. Гісторыя краіны сьведчыць, што толькі ва ўмовах сур'ёзнай арганізацыі нацыяналістычнага руху і праўдзівага інфармаваньня насельніцтва аб мэтадах і мэтах яго дзеяньняў магчыма разбудзіць сьвядомасьць людзей. Толькі гартаваньнем духу, выхаваньнем самасьвядомасьці і прагай годнага жыцьця магчыма адрадзіць павагу і цягу да ўсяго беларускага.

Нацыяналізм — другое дыханьне новай генэрацыі беларусаў, стваральнікаў новага грамадзтва, якое ўздымае беларускую культуру над засохлай кветкай эўрапейскае культуры. Сфармуецца новая структура мысьленьня, новая эстэтычна-культурная плятформа ўзаемаадносінаў паміж людзьмі. З жабрацкае краіны Беларусь ператворыцца ў буйны культурны цэнтар паміж Захадам і Ўсходам са сваімі нацыянальнымі адметнасьцямі, вырываючыся з зачараванага кола на самую вяршыню сусьветных дасягненьняў.

Толькі ў барацьбе за асабістае «Я» прыйдзе асоба да неабходнасьці вызнаньня ідэі нацыяналізму, якая забясьпечыць росквіт і духоўную чысьціню беларускае думкі.

Нацыяналіст верны сваёй краіне. На зьнявагу нацыяналіст адказвае рашуча, з годнасьцю. Абараняючы сваё нацыянальнае ймя, ня квапячыся на чужое.

Сяргей Прылуцкі,
Берасьце

Чаканьне Героя

16 сьнежня 1917 году ў прасторнай і ўтульнай менскай хаце, якая атрымала назву «Гасьцёўня Галубка», адбылася аўтарская прэзэнтацыя верша, які праз пэўны час стаўся сымбалем для многіх пакаленьняў беларусаў. Максім Багдановіч чытаў верш «Пагоня». Багдановіч матэрыялізаваў у слове мрою аб нязломным і велічным гераізме беларуса.

Напярэдадні ўгодкаў «Пагоні» я блукаў па вуліцах Менску, углядаўся ў твары мінакоў і спрабаваў уявіць, што сярод спатканых я магу сустрэць невядомага пакуль беларускага героя.

Што ёсьць гераізм? Я задаваў мінакам адно й тое пытаньне: «Ці ведаеце Вы беларускіх нацыянальных герояў?» Рэакцыя беларуса на такі запыт ня можа быць нэўтральнай, бо на слова «нацыянальнае» беларус не рэагуе спакойна. Гэтае слова выклікае чаканьне правакацыі, яно нагадвае пра вечную нявырашанасьць «беларускага пытаньня». А яшчэ гэтае слова не зусім зразумелае. Таму першая рэакцыя, якую я сустракаў — разгубленасьць.

Пасьля ў лепшым выпадку называлі Кастуся Каліноўскага, у горшым — вельмі нэрвова казалі пра значную ролю А.Лукашэнкі. А ўвогуле беларусы ня надта ахвотна размаўляюць на вуліцы зь незнаёмымі людзьмі. Вось прыклад.

У вечаровым паўпустым вагоне цягніка мэтро я ўголас працытаваў адно з насьценных выказваньняў у бок беларускага прэзыдэнта. А пасьля папрасіў прысутных пракамэнтаваць гэтую цытату. Вельмі хацелася пачуць што-небудзь у абарону ППРБ, адчуць тэндэнцыю ў захапленьні гэтай асобай. У мяне нічога не атрымалася. Нават два міліцыянты, якія разам са мной ехалі ў вагоне, адно сьціпла схавалі вочы. Астатнія людзі прыхільна ўсьміхаліся і маўчалі. Адзін мужчына памкнуўся быў штосьці сказаць, але, убачыўшы дыктафон у маіх руках, асекся. Але, калі я выйшаў на сваёй станцыі, да мяне падыйшоў адзін з пасажыраў, хлопец гадоў дваццаці, які захацеў сказаць у дыктафон усё, што ён думае аб прэзыдэнце. У адказ я спытаў, ці ведае ён нашых нацыянальных герояў. Той адмоўна матлянуў галавой. «Можа іх і не было раней, — сказаў ён, — але, мне здаецца, што цяпер яны абавязкова зьявяцца». Ці можна жадаць таго, чаго ня ведаеш, ці можна мроіць пра тое, чаго ніколі не адчуваў? Можа, беларус не надае належнай значнасьці сваім учынкам? Праз гэта ён ня ўражваецца ўчынкамі іншых. Магчыма.

10 сьнежня ў Менску тварам да сьценкі Нацбанку выстраіўся ланцуг хлапцоў. Праз пэўны час насупраць, каля рэстарацыі «McDonald's» зьявіўся вайсковы аркестар, які выконваў папуры на тэмы ад «Лявоніхі» да «Турэцкага маршу». Паміж гэтымі групамі людзей праехаў лімузын прэзыдэнта, асьветлены плякатам пікетоўцаў: «Дыктатура — гаўно». Краіна адзначала міжнародны Дзень палітвязьняў. Паміж людзьмі па абодва бакі скрыжаваньня йснавала сувязь — улётка-фатаздымак Славамірa Адамовіча са словамі «Ён ня есьць гамбургераў». Пазта Славамірa Адамовіча будуць судзіць сёньня, 16 сьнежня. Першага беларускага палітвязьня будут судзіць ва ўгодкі зьяўленьня верша, які стаўся сымбалем многіх пакаленьняў беларусаў. Гэты дзень пройдзе незаўважаным для большасьці мінакоў, у чые твары я ўглядаўся на вуліцах Менску. Пакуль яны ня маюць патрэбы ў героях. Але што рабіць таму хлопцу, якога я сустрэў у мэтро?

Севярын Квяткоўскі

Заяўлены чарговы пікет

Дэпутаты Менскага гарсавету сябры БНФ Алесь Драніцкі і Уладзімер Несьцер падалі заяўку на правядзеньне пікетаў 23 і 24 сьнежня з 11 да 13 гадзінаў каля будынку Расейскага пасольства. Пікетоўцы мяркуюць пратэставаць супраць падтрымкі Расеяй антыдэмакратычнага рэжыму А.Лукашэнкі.

В.В.

"Наша Ніва" незалежны тыдзёвік

заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар старонак "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таціяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі газэты выдадзенае № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

ЛІСТЫ З-ЗА КРАТАЎ

Справа Адамовіча, чым бы яна ня скончылася, абрастаючы ўсё новымі й новымі дэталямі, ужо стала нацыянальным сымбалем. Сымбалем бездапаможнасьці грамадзтва перад непахісным у сваёй вузкалобасьці рэжымам. Сымбалем, па якім пазнаюць Беларусь у Эўропе, Расеі, Амэрыцы. Сымбалем, па якім мы будзем згадваць сёньняшнюю эпоху. Эпоху ганьбы і цемрашальства. Эпоху, калі навокал вынішчаецца ўсё сумленнае, шчырае, разумнае ў чалавеку. За Лукашэнкам нацыя «мінусуе». Усе лепшыя людзі: спэцыялісты, прафэсура, паэты пакідаюць пасады, затрымваюцца міліцыяй, апынаюцца ў турмах, а на іх месцы прыходзіць «братва», для якой не існуе маралі і спагады. Нацыя «мінусуе», каб дайсьці да апошняе рысы, пасьля якой усё больш неверагодным выглядае ўздым.

Славамір Адамовіч патрапіў у вязьніцу КГБ у красавіку. Супраць яго была ўзбуджаная крымінальная справа паводле трох артыкулаў КК: за распаўсюджваньне закліку да зьдзяйсьненьня тэрарыстычнага акту (арт. 67, ч.1), за спробу пераходу дзяржаўнае мяжы (арт. 80, ч. 1), за нашэньне халоднае зброі (арт. 213, ч. 3).

За час сьледзтва ніхто не давёў, што Адамовіч вінаваты ў гэтых правапарушэньнях. Застаўся толькі верш «Убей президента»... «Спэцыялісты» з КГБ ніяк ня могуць даць сабе зь ім рады. Здагадваючыся пра дух твору, яны ніяк ня могуць зьляпіць зь яго справу аб падбухторваньні да гвалтоўнае зьмены ўлады. Экспэртызы найбуйнейшых літаратуразнаўцаў краіны, якія разам сьцьвярджаюць, што ў вершы няма ніякага крымінału, упарта ігнаруюцца «органамі». Зрэшты, пра справядлівае рашэньне нават няма гутаркі. Нахабна ігнаруючы заканадаўства (ёсьць у каго браць прыклад), сьледчыя з КГБ ізматкроць парушылі працэсуальны кодэкс. Любы з артыкулаў, якія прыпісваюцца Адамовічу, прадугледжвае адміністратыўнае пакараньне (умоўнае пазбаўленьне волі, штраф). Аднак рэжым абраў самую жорсткую меру стрыманьня, нават без суда.

У знак пратэсту супраць абсурднага абвінавачаньня, інфармацыйнае блякады і беззаконнага сьледзтва, 5 чэрвеня Славамір Адамовіч абвясьціў сухую галадоўку. З садысцкай цікаўнасьцю «чэкісты» назіралі, як канае чалавек, не паведамляючы пра тое нават ягонай маці. І толькі на восьмыя суткі, калі паэт знаходзіўся ўжо ў крытычным стане, зь ім дазволілі сустрэцца рэдактару «Нашае Нівы». Цяжкахворага Адамовіча перавезьлі ў шпіталь КГБ, дзе нават лежачы пад кропельніцай, ён быў прыкаваны да ложка кайданамі.

Але на гэтым пакуты паэта ня скончыліся. Пацягнулася доўгая чарада зьдзекаў і зь яго, і зь ягонай маці. Забараняліся сустрэчы, перадачы, мэдыкамэнты... Тым часам сьледзтва расьцягнулася на бясконца доўгія восем месяцаў. Ніякія просьбы, звароты, заклікі з розных краёў сьвету не дапамаглі. Чым больш горача розныя людзі прасілі, патрабавалі, умольвалі ўладу, тым большую асалоду ўлада атрымлівала ад зьдзеку з паэта.

Сёньня ў Віцебску адбываецца суд над беларускім паэтам Славамірам Адамовічам. Чым бы ня скончылася гэтая справа, рэжым ужо назаўжды запляміў сябе нянавісьцю і жорсткасьцю да лепшых сыноў Беларусі.

Сёньня мы публікуем матэрыялы, якія рэдакцыі ўдалося атрымаць ад С.Адамовіча ў апошні перад выхадам нумару момант.

Сябрам, суайчыньнікам, якія сёньня супрацьстаяць рэжыму

Вечар, 15-га лістапада. 76 гадоў назад нашыя дзяды ўзьнялі на Случчыне паўстаньне супраць бальшавіцкага прыгнёту. 14-га лістапада 1996 году прэзыдэнцкая «СБ» піша: «1920 г., 14 ноября – 28 декабря. Антисоветский эсеро-националистический мятеж в Слуцком уезде». Гэта піша выданьне антыбеларускага рэжыму, г.зн. што нашае супрацьстаяньне генацыду працягваецца. У імя каханьня, радасьці свабоды! У імя сьветлай памяці продкаў і годнага жыцьця нашчадкаў мы ахвяруем нашым сёньняшнім, днямі нашага сёньняшняга жыцьця...

Каторы месяц застаюся без нармальнай мэдычнай дапамогі. Праз галадоўку нажыў востры гастрыт. Трэці месяц баляць зубы, але вылечыць таксама праблематычна – няма навакаіну, калі верыць доктару. Абвінаваўчага заключэньня яшчэ не атрымаў. З адміністрацыяй на нажах (патрабую ад вертухаяў людзкіх да сябе адносінаў). За жыцьцё па законе атрымаў пакараньне –пазбавілі перадачаў на месяц.

Дні бягуць – нашыя дні нашага жыцьця. Выжывем! Выйдзем! Будзем разам і на НАШАЙ зямлі! Верыць і змагацца, тады і будзе неабходны вынік.

Чакаем амністыі і рэфэрэндуму, гартуем волю й сьпелім пачуцьцё *нянавісьці. І па 48-м канале віцебскага тэлебачаньня прагна ловім інфармацыю пра падзеі на волі. З газэтаў заходзяць «СБ» і «ЗЮ», рэдка – «Народная газета».

18 лістапада. Было спатканьне з маці. Паказала маю чацьвертую кніжку вершаў – «Каханьне пад акупацыяй». Перадаць не дазволілі. Да чаго ж дзікая сытуацыя – не магу мець пры сабе ўласную кніжку вершаў! І гэта ў эўрапейскай краіне, у канцы 20-га стагодзьдзя!..

Аднаго шкада – не парупіліся мае любімыя жанчыны пакінуць мне нашчадка. Няхай жа застаюцца мае Словы і мае Дрэвы – тут, на зямлі продкаў...

Дзякуй, сябры! Сустрэнемся 25-га ў судзе. Dixi!

Ваш Слáвамір

P.S. 27.11.96 году. Пяць сутак адсядзеў у карцары, адкуль мяне й вывозілі на суд. 25-га адбылося першае паседжаньне працэсу па справе №182. Усё цьмяна і невыразна. Судзьдзя неяк баязьліва коўтае словы, баіцца гаварыць на поўны голас. Тое ж і пракурор. Здымаць на фотавідэатэхніку ў залі суда журналістам не дазволілі. Буду чакаць, пакуль ня зьявіцца адвакат Паганяйла, каб выступіць абаронцам маіх інтарэсаў у названай справе.

S.A.

Як зьнішчалі палескую зорку

Акт

г. Минск 17 июня 1996 года

Комиссия в составе заместителя начальника СО КГБ РБ майора юстиции Фалюка В.В., следователя по ОВД того же отдела капитана юстиции Сокольчика А.П. и следователя этого же отдела старшего лейтенанта юстиции Байкова А.А. составила настоящий акт о том, что сего числа в специальном помещении, оборудованном печью, произведено уничтожение путём сожжения изъятых в ходе обыска, произведённого 22 марта 1996 года по месту жительства Адамовича С.Г., – нарукавной повязки с вышитым стилизованным изображением на чёрном фоне восьмиконечной звезды красного цвета, помещённой в восьмиугольник белого цвета; (...)

– флага, сшитого из двух чёрных и расположенной между ними красной продольных полос, по внешней вертикальной поверхности флага пришита бахрома из материала жёлтого цвета.

В соответствии со ст. 167(2) Ко АП указанные предметы изъяты из гражданского обращения и не имеют значения для дела.

Заместитель начальника СО КГБ РБ
майор юстиции (подпіс) В.В.Фалюк
Следователь по ОВД КГБ РБ
капитан юстиции (подпіс) А.П.Сокольчик
Следователь Со КГБ РБ
ст. лейтенант (подпіс) А.А.Байков

Лірыка строгага рэжыму

* * *

Яркаю бліскавіцаю распалавініла ты днямі мой сон. Вольны дух Случчыны занесла ў казэматы Віцебскае цэнтралі, знайшоўшы мяне на правым баку – цяжка драмаў я. Мышыным гарошкам абвіла ты мяне і расцалавала – не пасьпеў я апамятацца. Зусім як тады – 27-га ліпеня, зусім як тады – на вясельлі ў нашай знаёмай... Ты пакінула белыя падушкі свайго сталічнага ложка, каб убачыць мяне на другім паверсе жалезных нараў камэры шэсьць чатыры строгага рэжыму. Ты зьявілася, каб разам са мною адзначыць дзесяцігодзьдзе нашага знаёмства і восем месяцаў майго ўвязьненьня. Ты нагадала мне, што кветку каханьня нельга стаптаць, калі расьце яна зь нязводнага духу волі да прыгажосьці й гармоніі, што ёсьць, бадай, адно й тое ж. Ты прыйшла, каб даць мне новае сілы. І ты зрабіла гэта. Вярніся цяпер да твайго дзіцяці – яму страшна бяз мамы. Пагушкай яго, як гушкае пушчу цёплы вецер поўдня, як лёгка тарнуе чараты верхаводка пасьля майскай залевы... Няхай маленькая ніколі ня ўведае, як гэта – гушкацца ў вузачку крытай турмы – "крыткі".

Сьпі, каханьне маё. Сьцеражы, сон дачкі, пра якую так мару.

* * *

... І ты была са мною. І цябе я люблю любовямі акіянічнымі. І пішу пра цябе пісьмом Сакрата Яновіча, які па той бок заходняй мяжы цепліць сваю беларускую хату, каб ня ўстыць ад сьцюжы ўсходняй...

Пэўна, мала любіў я цябе на свабодзе – даруй! Пэўна, дзёрзкі быў я бязь меры з табой – на калені ўпадаю! Пэўна, трэба было мне зрабіць гэны крок на твой бераг – ня здолеў ступіць, не патрапіў – шкадую! Але жарсьць наша, быццам бурштын Герадотава мора – глыбока! І ня зьнішчыць яе – кветкай Волі яна прарастае татальна! Веру, ведаю – ты мяня сьніш, ты жадаеш... А калі ты ня сьніш, – ты ня сьпіш, за дачкой назіраеш. Семяжанка мая, беларуска, крывіцкая доля! Завязаўся аднойчы вузельчык – цяпер не парваць. Ды і нельга – так трэба Радзіме. Такая планіда, скрыжалі.

На здымку маці Славамира Адамовіча на пікеце ў Менску 10 сьнежня.

Моцна будзем і многа, і шчыра, і вечна кахаць!..

* * *

А сьмерці няма. І сьценаў каменных таксама. Тым яны не заслона, хто выбраны ў носьбіты духу. Бываюць, аднак, адступленьні. Тады мы губляем самых лепшых, тады мы ўгрызаемся ў грунт... Вось і я не зьбярог ні тваю вышыванку, ні нож твой: вораг зьнішчыў агнём вышываньне, а нож з аслабелай рукі ліхаманкава вырваў... Вораг цешыцца думкай ілжывай, што ён перамог...

Будзь сяброўкай дачцы. Яна вартая добрых пачуцьцяў. Не мадэлька, пустышка, бірубалка пры камэрсанце – дзяўчына крывіцкага роду. Засьцялі ёй пасьцелю дзявочую, хай прысьняцца ёй сны залатыя і вольны ад набрыдзі Край.

* * *

Ружачкі – ты думаеш, гэта маленькія ружы, кветкі, якія прыносяць на спатканьне зь дзяўчынаю. Ах, малады чалавек, не пра кветкі я. Мая ружачка – штучка капрызьлівая, яна ніколі ня вяне. Вяне жыцьцё, трапляючы на ейныя вострыя пялёсткі. Мая ружа – мая зброя самааховы. Вандруе са мною з камэры ў камэру. Халоднае зялёнае шкло, бутэлечка з-пад мікстуры, адбітае дно. Востра. Дастаткова, каб вывесьці са строю ворага. «Ружачка» – зброя паэтаў. Можа адсюль і «ружжо», «акружжа»? І, можа, першымі салдатамі былі паэты?

Я даю маім «ружам» імёны маіх жанчын.

***

Дзьве кветкі раскошныя раскашуюць у душы маёй – кветка Любові і кветка Нянавісьці. Што рабіць – вельмі ўжо яны разбуялі, і нельга вырваць другую, каб не зашкодзіць першай. Кветка Любові – для ўсіх, для жывога навокал, як-то: кузуркі, трытоны, суркі, кажаны, матылі, коні звычайныя, коткі цяжарныя, векшы, рысі пушчанскія, совы, зубры, журавы; людзі разумныя, людзі звычайныя ў горы, з радасьцю, у суме, жанчыны, мужчыны, «зэка», людзі амону, спэцназу, і людзі прыкольныя, простыя людзі і людзі зь вярхоў ЦэКэКа... Кветка Нянавісьці – толькі для ворагаў Краю! Хай жа ня сьпіць пракурор: сынэдрыён!

***

Рома! Дзе ты, агу!.. Рома, ты памятаеш 13-га жніўня 96-га? Што ж ты мне не расказаў пра сваё нялёгкае жыцьцё, Рома – опэр СІЗО-2 г. Віцебска? Можа б я табе чым дапамог, Рома Лазуркін. Я выкурыў твае тры цыгарэты, а ты пасадзіў мяне на малалетку. А потым аказалася, што нарабіў ты няякаснай работы на Цэнтралі, Рома. І за гэты «вытворчы брак» у цябе ўсяго толькі падпіску аб нявыезьдзе адабралі. Кажуць, ты часу дарма не губляеш – у якойсьці фірме юрысконсультам туды-сюды? Але як жа мы, Рома Лазуркін, твае «арыштанты»? Твой наступнік Колька Бабарыкін водку нам ня носіць, а лісты, праўда, бярэ. Пры нас чытае, ухваляе – маўляў, недазволенага ў тэксьце няма –абяцае мамцы адправіць і адпраўляе – у 6-ы аддзел альбо ў сьметніцу. Колька яшчэ зялёны. А безь цябе сумна. Заяджай у 64, мы разгонім табе рамсы за жыцьцё...

... А рэфэрэндум ППРБ выйграў – памыліўся ты. Так што чакаем.

***

Восем месяцаў «крыткі». Яшчэ да суда. Яшчэ «віна» не даказана. Але восем месяцаў турмы ўжо за плячыма. І шостая кніга вершаў ёсьць. «Крытая» – гэта калі ўвесь час у камэры мінус адна гадзіна штодзённай прагулкі. Восем месяцаў – гэта чатыры камэры ў СІЗО КГБ, шпіталь КГБ, тры камэры на Віцебскім цэнтралі і пяць сутак карцэру ў боксе «И». Астатняе – дробязі: глядзім тэлевізар, любім нашых далёкіх жанчын, ненавідзім, каго і ўсе нармальныя людзі, прагнем свабоды...

***

Дзьвюх рэчаў шкада: Толік Сыс прападае – першае. Нашчадка на свабодзе не пасьпеў нарадзіць – другое. Трэцяе... Вось трэцім мы і займаемся – каб людзі нашыя не прападалі самахоць, каб нашым дзецям не пад лавай жыць.

Атрымалася надта пышна, можна і не даваць у друк.

***

Сказана ня мною. Ня так страшны чорт, як яго малюткі. Кураня заводзіцца ў яйку, калі яйка пачынае псавацца. Si circa occidentem rubeseunt nubes, serenitatem futuri dici spondent – чырвоныя аблокі вакол сонца на захадзе абяцаюць ясны дзень.

***

Цяпер і на Цэнтрале гавораць: лепш Пазьняк, чым ніколі.

5 сьнежня 96 году, ноч, Віцебскі цэнтраль, камэра 64.

Малодшаму сяржанту Віталю, сядзельцу 4-й камэры СІЗО КГБ

Сядзіш за скрадзены цэзій,
а мог бы за Беларусь,
маўклівы і негарэзьлівы
барысаўскі беларус.

Яшчэ толькі ўчора быў ты
малодшы сяржант БэА,
у форму як быццам уліты,
як быццам ты ўжо камбат.

Яшчэ толькі ўчора... а сёньня
ты разам са мной сядзіш,
сьціскаеш роспачана скроні,
хістаесься ды маўчыш.

Ты думаў, што шыта-крыта
адбудзецца справа, аднак,
ня выйшла ў цябе са збытам,
і спраўдзіўся дрэнны знак.

І раз ужо так прыйшлося –
давай ня плакаць, ня ныць,
давай рабіць, каб збылося
усё, што павінна быць.

12.08.96

Літва: і з Эўропай, і з Расеяй

Чым больш дакладны разьлік, тым больш моцнае сяброўства

Магістральным кірункам зьнешняй палітыкі Літвы па-ранейшаму застаецца Расея, на долю якой прыпадае блізу паловы зьнешняга гандлю. Ці ня самы істотны аспэкт узаемадачыненьняў дзьвюх краінаў — энэрганосьбіты.

У «Газпраму» няма прэтэнзіяў да Літвы (у адрозьненьне ад Беларусі). Гэта было высьветлена пасьля сустрэчы кіраўнікоў прадпрыемства «Lietuvos dujes» («Літоўскі газ») з прадстаўнікамі расейскага канцэрну. Расейскія пастаўшчыкі задаволеныя тым, што Літва разьлічылася цалкам да канца бягучага году, перавёўшы апошнія з запазычанасьці 20 мільёнаў даляраў на рахунак «Газпраму».

Больш таго, Расея гатовая прадаваць надзейнаму партнэру газ таньней. Сёньня Літва плоціць 78 даляраў за 1000 кубамэтраў газу. «Газпрам» прапанаваў варыянты аплаты — па 75, 73 і 70 даляраў за кубамэтар, у залежнасьці ад аб'ёму закупак.

У наступным 1997-м годзе літоўскія прадпрыемствы, у першую чаргу «Lietuvos dujes» і «Stella Vita», закупяць у Расеі каля 4 мільярдаў кубамэтраў газу, зьменшыўшы закупкі мазуту (з экалягічных меркаваньняў). Газ у Літве таньнее.

Другім істотным аспэктам узаемадачыненьняў Расеі і Літвы застаецца пытаньне дэлімітацыі мяжы. «Мы знаходзімся на завяршальнай стадыі», — такую адзнаку літоўска-расейскім перамовам аб мяжы даў пасол Расеі па асаблівых даручэньнях Абухоў.

Са словаў прэзыдэнта Бразаўскаса, дэлегацыям давядзецца вырашыць пытаньне аб трох спрэчных кропках: гэта — возера Віштыціс, вуйсьце Нёмана і марская мяжа з Калінінградзкай вобласьцю.

Перашкодаю ў перамовах стала радовішча нафты Д-6 у Балтыйскім моры, якое пакуль не аднесенае ні да аднаго з бакоў. Але расейцы самахоць ужо паўтары гады таму заключылі дамову зь нямецкімі фірмамі аб стварэньні кансорцыюму KANT дзеля распрацоўкі гэтага радовішча. «Спадзяюся, што на перамовах дамоўленасьць будзе дасягнутая», — заявіў прэзыдэнт Літвы. Бразаўскас заўважыў, што пасьля ўсталяваньня законнае мяжы ўсё стане на свае месцы, і адносіны з Расеяй выйдуць на якасна новы ўзровень. «Спадзяюся, што тут нам будзе лягчэй, чым з латышамі», — дадаў Бразаўскас.

На чым палягае праблема літоўска-латвійскіх узаемадачыненьняў? Ізноў жа ў нафце, велізарнае радовішча якой было выяўленае ў балтыйскім шэльфе, які да сёньня яшчэ не дэлімітаваны. Латвія ў аднабаковым парадку распачала буравыя работы ў Балтыцы, манапалізавала будаўніцтва супэртэрміналу ў Бутынзе...

На пытаньне журналіста газэты «Летувос рытас» кіраўнік новага ўраду Літвы Вагнорус ахарактарызаваў пэрспэктывы дачыненьняў з Латвіяй наступным чынам: «Я быў бы шчасьлівы, каб не было патрэбы ў такіх перамовах, хоць, верагодна, давядзецца ўсур'ёз падлучыцца да разблытваньня вузла з гэтым нафтавым радовішчам. Адна перавага: над намі, якія заступілі наноў, не вісяць сапраўдныя альбо надуманыя памылкі мінулага».

У справах далучэньня Літвы да Эўрапейскага Зьвязу па-ранейшаму самую істотную ролю грае найбуйнейшы партнэр краінаў Балтыі ў Эўропе — новая аб'яднаная Нямеччына.

Хоць і тут у Літвы нямала клопату. Як толькі нацыя становіцца гаспадаром у сваім доме, яна мусіць кантактаваць на роўных зь іншымі. Жыхары Клайпедскага краю ня могуць даць сабе рады ў сваіх адносінах да нямецкае мінуўшчыны краю, якая налічвала паўтысячы гадоў да 1923 году. Да прыкладу, Шылуцкі раённы савет узьняў пытаньне пра пагрозу германізацыі краю. «У Шылуце адноўлены помнік Г.Зудэрману, хоць у Вільні зьнесьлі нават Пушкіна», — абураецца ў райсавеце прадстаўнік правае кааліцыі. Зудэрман — славуты нямецкі паэт, быў родам з гэтых мясьцінаў. Як і Ёган Гердэр, вядомы нямецкі філёзаф XVIII ст., чыё імя насіла тутэйшая гімназія, дзе, дарэчы, за немцамі былі і літоўскія клясы. Сёньня вакол вяртаньня гімназіі імя клясыка нямецкае філязофіі разгарнуліся баталіі...

Між тым, на дзяржаўным узроўні працэс інтэграцыі Літвы і Нямеччыны йдзе саёй хадою. Толькі што скончылася чатырохтыднёвая інспэкцыя нямецкімі спэцыялістамі літоўскае мытні, абмен дэлегацыямі на ўзроўні МЗСаў, МУСаў і Міністэрстваў юстыцыі, міграцыйнага і мытнага дэпартамэнтаў.

Нямецкія калегі надзвычай высока адзначылі працу літоўскіх крымінальстаў, ладу стварэньня прававое базы і парадак выдачы візаў. Удзельнікі нямецкіх дэлегацыяў сыйшліся на думцы, што не заўважылі істотных перашкодаў на шляху да перамоваў аб бязьвізавым рэжыме. Перамовы пачнуцца ў лютым. Мяркуецца, што дамову аб бязьвізавым рэжыме можна скончыць праз год. Для Літвы гэта азначае ня толькі расчыненьне дзьвярэй у Нямеччыну, але, аўтаматычна, і ва ўсе краіны Шэнгенскага пагадненьня.

Дзеля гэтага Літоўская рэспубліка мусіць выканаць некалькі перадумоваў — далучыцца да Жэнэўскае канвэнцыі аб уцекачах, удасканаліць парадак выдачы пашпартаў усім катэгорыям сваіх жыхароў і... усталяваць жорсткую мяжу зь Беларусяй.

Сяргей Баркоўскі

Здымак Ёласа Казлаўскага "Поўнач. На Захад"

Шпіянаж

КЕПСКІ НАСТАЎНІК ДОБРЫХ ВУЧНЯЎ

Падобна да таго, што «халодная вайна» ніяк ня хоча спыніцца ў адносінах паміж ЦРУ і расейскімі спэцслужбамі. Усьлед за параўнаўльна нядаўнім скандалам, зьвязаным з «супэршпіёнам» Олдрыджам Эймсам, амэрыканскія рыцары плашча і кінжала мусяць расхлёбваць яшчэ адзін, арыштаваўшы з падазрэньнем у шпіянажы свайго чарговага калегу.

Толькі арышт перашкодзіў Хэральду Нікалсану паўтарыць «посьпех» ягонага папярэдніка Олдрыджа Эймса ў заваёве тытулу «супэршпіёна». Бо, са словаў аднаго высокапастаўленага чыноўніка з ЦРУ, ён быў на шляху да таго, каб, пасьпеўшы прычыніць вялікую шкоду нацыянальным інтарэсам ЗША, зрабіцца адным з найбуйнейшых расейскіх шпіёнаў. Спраўдзіліся самыя змрочныя прагнозы сьледчых у справе Эймса — той ня быў апошнім. Прычым Нікалсан таксама займаў даволі высокую пасаду, працуючы ў аддзеле барацьбы з тэрарызмам ЦРУ.

Сваю кар'еру ў ЦРУ Нікалсан пачаў у 1980 г. і паволі, але ўпэўнена прасоўваўся па службовай лесьвіцы. У ягоным паслужным сьпісе ёсьць пасада інструктара аператыўнай работы ў навучальным цэнтры ЦРУ ў штаце Вірджынія. Ён навучаў маладых шпіёнаў рознага кшталту хітрыкам на той выпадак, калі тыя заўважаць, што знаходзяцца «пад каўпаком». ЦРУ не паведамляе, наколькі добрым настаўнікам быў Нікалсан, але відавочна, што на практыцы выкладаную ім тэорыю ён выкарыстаць ня здолеў. Бо ўпершыню ён патрапіў пад падазрэньне менавіта на самым простым паліграфе, які звычайна проста мяпуецца дэтэктарам ілжы — комплексным электронным прыстасаваньні, што складаецца з адмысловых датчыкаў, падлучаных да розных месцаў цела, сыгналы якіх апрацоўвае кампутар. Сваім студэнтам-контрарозьведчыкам Нікалсан распавядаў пра мэтады абману гэтага мудрагелістага прыстасаваньня, прынятага расейскімі (як, дарэчы, і ўсялякімі іншымі) шпіёнамі. Дзеля гэтага перад кожным пытаньнем, што можа выклікаць хваляваньне, яны робяць глыбокі ўдых. Такое ненатуральна глыбокае дыханьне і павінна быць прыкметаю спробы схаваць праўду. Па іроніі лёсу Нікалсан пагарэў менавіта на гэтым.

Як вядома, кожны супрацоўнік ЦРУ абавязаны праз кожныя некалькі гадоў праходзіць сэрыю тэстаў на дэтэктары ілжы. Калі год таму Нікалсан быў у чарговы раз падлучаны да паліграфа, новая і вельмі эфэктыўная кампутарная праграма заўважыла сьляды маны. Праз чатыры дні тэст паўтарылі, і гэтыя сьляды выявіліся зноў. Таму Нікалсану давялося прайсьці паўторную працэдуру адказаў на яшчэ больш мудрагелістыя пытаньні. Спэцыяліст, які праводзіў тэставаньне, заўважыў, што ў гэты час Нікалсан рабіў глыбокія ўдыхі. Экзамэнатар загадаў Нікалсану спыніцца і задаў пытаньне на засыпку: «Ці праўда, што Вы спрабуеце схаваць ад ЦРУ свае кантакты з замежнымі разьведслужбамі?» Нікалсан адказаў «не», а прыбор зноў зафіксаваў штосьці ня тое.

Пасьля гэтага за Нікалсанам на ўсялякі выпадак пачалі сачыць. Пачалі з праверкі ягоных фінансавых справаў. Тое, што выдаткоўваў Нікалсан, сьведчыла на карысьць жыцьця не па сродках. За свой кошт ён рабіў частыя паездкі ў Паўднёва-Ўсходнюю Азію, пасьля чаго на ягоны амэрыканскі банкаўскі рахунак паступалі грашовыя пераводы. У чэрвені Нікалсана высачылі ў Сынгапуры, дзе той жыў у дарагім (300 USD за суткі) гатэлі, дзе распланіўся наяўнымі, што вельмі не характэрна для амэрыканцаў, якія выкарыстоўваюць дзеля гэтага крэдытныя карткі ці падарожныя чэкі. Агенты ФБР усталявалі за Нікалсанам тайнае назіраньне, падчас якога той паводзіў сябе як сапраўдны дылетант, што мог бы пазьвердзіць любы зь ягоных вучняў. Калі ў дзень сустрэчы з расейскім сувязным ён выйшаў з гатэлю, то як навабранец-практыкант пачаў зьбіваць патэнцыяльнае сачэньне, чатыры часы пятляючы па вуліцах гораду, спыняючыся перад вітрынамі крамаў, каб праверыць, што за ім няма «хваста». Пасьля ён спусьціўся ў мэтро і выйшаў назад. Крыху пазьней у той жа дзень ён зрабіў гэткі ж, у стылі кепскіх шпіёнскіх фільмаў, шпацыр. На гэты раз на станцыі мэтро Нікалсан сустрэўся з чалавекам, зь якім прайшоў у напрамку стаянкі таксі, дзе сеў у машыну з расейскімі дыпляматычнымі нумарамі. І ўсё гэта адбывалася на відавоку агента ФБР, які фільмаваў яго на камэру.

Агенты ФБР працягвалі сачыць за Нікалсанам, пакуль, нарэшце, схаванай камэрай не зазьнялі, як ён фатаграфаў у сваім службовым кабінэце сакрэтныя дакумэнты. У момант свайго арышту 16 лістапада ў міжнародным аэрапорце Вашынгтона Нікалсан накіроўваўся на чарговую сустрэчу з расейскім сувязным. Са словаў дырэктара ЦРУ Джона Дойча, шкода, якую зрабіў Нікалсан нацыянальным інтарэсам ЗША, пагэтулькі істотная, што ягоная ўстанова прадпрыме ўсе меры для недапушчэньня паўтору падобнага ў будучыні. Між іншым, дакладна такія ж абвінаваўленьні даваліся кіраўніцтвам ЦРУ блізу году таму з нагоды справы Эймса. Самае сьмешнае, што ўсяго праз 2 месяцы пасьля таго, як апошні быў засуджаны на пажыцьцёвае зьняволеньне, Нікалсан атрымаў ад расейцаў грашовы перавод на 12 тыс. даляраў.

Выпадкі з Эймсам і Нікалсанам дэманструюць зьяўленьне ў ЗША новага віду шпіёнаў пасьля заканчэньня «халоднай вайны». Калі раней радзіму прадавалі пераважна з ідэалягічных меркаваньняў, то цяпер, у адпаведнасьці з законамі свабоднага рынку, гэта робіцца за вялікія грошы. Якраз магчымасьць апошняга катэгарычна адмаўляюць родзічы Нікалсана, якія адгукаюцца пра яго як пра ідэалістычнага, духоўнага чалавека і добрага бацьку. Сябры распавядаюць, што ў часе антывайсковых студэнцкіх бунтаў Нікалсан заставаўся непахісным патрыётам. А пасьля за-

канчэньня ўнівэрсытэту штата Арэгон ён адразу ж пайшоў на службу ў войска, дзе да свайго пераходу ў ЦРУ даслужыўся да капітана. У інтэрвію карэспандэнту амэрыканскага часопіса Time бацька Нікалсана, адстаўны старэйшы сяржант ваенна-паветраных сілаў, сказаў, што «ягоны сын заўсёды быў адданы ўраду ЗША і сваёй працы». Брат Нікалсана, Робэрт таксама аспрэчвае мэркантыльныя інтарэсы Хэральда.

І тым ня менш, 31-старонкавая справаздача ФБР утрымлівае апісаньне шэрагу буйных і нерастлумачаных Нікалсанам паступленьняў на ягоныя банкаўскія рахункі ў агульнай суме 180 тыс. даляраў. Прычым, паступаць яны пачалі менавіта пасьля пагаршэньня ягонага фінансавага становішча, калі Нікалсану пачалю неставаць гадавой зарплаты ў 73 тыс. даляраў. Да 1994 г. Нікалсан працаваў за мяжой пад прыкрыцьцём статуса дыплямата, маючы пры гэтым вялізны службовы дом, дарагую машыну, за казённы кошт пасылаючы дзяцей у прыватныя школы. Пасьля вяртаньня на радзіму ўсе гэтыя ільготы адпалі. У той жа год пасьледаваў развод, што патрабаваў разьдзел маёмасьці і выплату жонцы алімэнтаў у памеры 25% ад гадавога прыбытку.

У мінулым месяцы агенты ФБР заўважылі, як Нікалсан кінуў ліст у вулічную паштовую скрыню. Яго, натуральна, адразу ж дасталі і прачыталі. Там на паштоўцы зь відам месца будучай сустрэчы было сяброўскае пасланьне ад імя нейкага Нэвіла Страчы. Калегі Нікалсана з ЦРУ былі глыбока ўражаныя архаічнасьцю мэтадаў ягонай праны. Прызначэньне сустрэчы праз звычайную пошту, ды яшчэ й з традыцыйнай для даўно мінулых гадоў паштоўкай з выявай месца сустрэчы сёньня можна знайсьці толькі ў падручніках гісторыі разьведвальнай справы. Сучасныя шпіёны карыстаюцца сотавымі тэлефонамі і Інтэрнэтам.

Нягледзячы на ўсе пералічаныя вышэй улікі, яны толькі ўскосна сьведчаць пра віну Нікалсана. Для прызнаньня яго вінаватым патрэбнае сур'ёзнае судовае разьбіральніцтва. Адвакаты Нікалсана настойваюць на дачы ім кампутарных зьвестак з вынікамі тэстаў на дэтэктары ілжы і адкрытай праверкі астатніх матэрыялаў, паколькі, як ужо высьветлілася, адна з улікаў ФБР аказалася сфабрыкаванай. Але якраз адкрыты працэс і палохае кіраўніцтва ЦРУ. Гэта можа выклікаць непажаданае раскрыцьцё цэлага шэрагу звышсакрэтнай інфармацыі. Ведаючы пра слабое месца ЦРУ, адвакаты Нікалсана ўмела маніпулююць гэтым, выгандлёўваючы максымальна выгодныя ўмовы для свайго кліента.

Адзіны вынік справы, што задаволіў бы ўрад, — атрыманьне прызнаньня сваёй вінаватасьці ад самога Нікалсана. Толькі тады паводле амэрыканскага заканадаўства можна ўнікнуць судовага працэсу. У выпадку з Эймсам усё было прасьцей. Той пагадзіўся прызнаць сваю вінаватасьць узамен на абяцаньне ўраду зьняць абвінавачаньні зь яго жонкі. А на Нікалсана паціснуць няма чым. Хіба што паабяцаць яму больш мяккае пакараньне. Але за недахопам улікаў сьмяротны прысуд яму й так не пагражае, пажыцьцёвае зьняволеньне гарантаванае ў любым выпадку. Таму асноўныя козыры Нікалсана нішто — маўчаньне і патрабаваньне судовага разьбіральніцтва. На гэты раз глыбокі ўдых мусіць зрабіць ЦРУ.

Уладзімер Баранч

СТАРОНКА

інфармацыйнае агенцтва НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭННЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Танна прадаецца крыху незавершаны вялікі катэдж у цэнтры Барысава. Пэйджынг 781101, Аб.434

Радыёпрыёмнік "Верас-225" з канвэртэрам у добрым стане прадам ці памяняю. Тэл. 44-44-64

Дакумэнтальныя й мастацкія фатаздымкі зь некаторых сёлетніх дэманстрацыяў (22/VI, 19/X, 17/XI). "Героям" кадра — бясплатна. Таксама мяняю.

Мяняю 2-х пакаёвую кв-ру ў П.Сноў, пл.75/50/12, тэл., 2 лодж., на кватэру ў Менску ці прадам за 9 тыс. даляраў. Тэл. 241-10-04 пасьля 16.00.

34-гадовы беларускі патрыёт бяз шкодных звычак, сьлесар, мроіць адшукаць чулае сэрца беларускамоўнай спадарожніцы жыцьця. Алесь Рымарук. Баранавічы, в.Фралянкова, 36-3.

Беларускія ўмельцы! Ёсьць патрэба саматужна ўзнавіць "Пагоню" на 3-6 тамах "БГЭ" "залатым" цісьненьнем. Тэл. 70-01-87

Хату (20 км ад Навагарадка, 69г. драўляную, калодзеж, сад, гасппабудовы за 1.800$ прадаю. Тэл.(8-01713) 41-3-91

Куплю новую мэблевую сьценку тыпу Заслаўе, Палесьсе ці іншую за безнаяўны разьлік коштам 250-300$. Тэл.(02155) 2-26-71, 2-15-56 (Рыта).

Шукаю дапамогі, каб зьехаць на пастаяннае жыхарства ў Польшчу, ці ў іншую краіну з расейска-беларускамоўным асяродзьдзем: Вайсковец-памежнік, 33 гады. г. Паставы, Галоўпаштамт, да запатрабаваньня, п/д АГЗ N802619

Пазнаёмлюся з замежнай жанчынай дзеля сумеснага жыцьця за мяжой. 33/180/74, в/а, беларус. Разумею польскую, украінскую мовы, знаёмы з англійскай. 211840 г. Паставы, галоўпаштамт, п/д АГЗ N802619

Шукаю спонсара-суаўтара кнігі "Легенды і праўда жыцьця Паўлюка Багрыма". Пісаць: 225320 Баранавічы, Брэсцкая 293/2, 42, Маліноўскаму Міхасю.

Прадаю запісы Данчыка, А.Мельнікава, "Ліцьвіноў", "Нейродюбель", "Ляписов" і інш. Тэл. 49-08-88 Віталь

Прадаю тэксты гурта "Камэлот" з акордамі. Тэл. 49-08-88 Віталь

Тэрмінова прадаецца 2-пакаёвая кватэра ў Смаргоні, Тэл. 3-62-62, Я.Коласа 57/87

Беларускі патрыёт, 22 гады, здыме пакой у родных па духу гаспадароў за сымбалічную плату. Раблю любую хатнюю працу. Тэл. 251-42-56 Хведар

Прадаецца хата. Напрамак Кобрынь-Пінск, 24 км. 43 соткі. Ядорага. Тэл. 223-73-52. Менск. Тэлефанаваць з 18 гадзінаў.

Куплю: лядоўню М-131, б/к. Печ СВЧ б/к — танна. Тэл. 294-16-99.

Шукаю спадарожніцу жыцьця. Незласьлівы, сарамлівы. 55 год. Заікаюся. Інтарэсы інтэлектуальныя. Многае умею. Працую. 220024, Менск, вул. Асаналіева, 13/1, кв.72.

Галіну Аляксееўну Сініцыну зь днём нараджэньня віншуюць сябры-аднадумцы з Воршы. Шчыра жадаем плёну ў працы і аптымізму.

Недзяржаўнае дабрачыннае таварыства аховы жывёлаў запрашае стацца нашым сябрам або спонсарам.

Прадаю аўтамабіль ВАЗ-2101 у добрым тэхнічным стане 1975 г. Куплю канчатковы ўзмацняльнік "Прибой". Тэл. 268-37-32.

Свайго прыватнага настаўніка беларускай мовы Сярожу зь Менску віншуе з Калядамі Таня. Я кахаю цябе!

The Publishers Weekly Bestsellers
Сьпіс бэстсэлераў на 13.12.96

На гэтым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кнігі. Аўтар	Выдавецтва	Колькасьць тыдняў у сьпісе
1	4	Executive Orders Том Клэнсі	Putnam	18
2	9	The Fallen Man Тоні Хілэрман	HarperCollins	2
3	1	Silent Honor Данізла Стыл	Delaconte	24
4	2	The Deep End of the Ocean Жаклін Мітчард	Viking	14
5	6	The Laws of Our Fathers Скот Тараў	Farrar, Straus & Giroux	11
6	3	"M" is for Malice Сью Грэфтан	Henry Holt	6
7	5	The Tailor of Panama Джон Ле Карэ	Knopf	8
8	8	The Notebook Нікалас Спаркс	Warner	9
9	7	The Third Twin Кэн Фолет	Crown	13
10		My Gal Sunday by Mary Higgins Clark	Simon & Schuster	1

@1995 Cahners Publishing Company

САМЫЯ ПАПУЛЯРНЫЯ П'ЕСЫ НА БРАДВЭЇ
25 ЛІСТАПАДА — 12 СЬНЕЖНЯ 1996 ГОДУ

Месца	П'еса	Тэатар	Кошт квіткоў на лепшыя месцы
1.	Rent	(Nederlander)	$70
2.	Bring in 'Da Noise, Bring in 'Da Funk	(Ambassador)	$67.50
3.	The Phantom of the Opera	(Majestic)	$70
4.	Chicago	(Richard Rodgers)	$70
5.	The King and I	(Neil Simon)	$70
6.	Les Miserables	(Imperial)	$70
7.	A Funny Thing Happened On The Way To The Forum	(St.James)	$70
8.	Beauty and the Beast	(Palace)	$70
9.	Grease	(Eugene O'Neill)	$67.50
10.	Master Class	(John Golden)	$45

З 20 па 22-е! У Менску! І Міжнародны дабрачынны фэстываль "Студэнцкія калядкі — 96". У залі Лінгвістычнага Універсітэту. Квіткі можна набыць перад пачаткам а 19-ай гадзіне.

Інфармацыйнае агенцтва

ЭКОПРЕСС

Інфармацыйнае агенцтва "Экопресс" працуе на рынку апэратыўнай фінансавай інфармацыі з 1993 году.

Сёньня мы прапануем нашым кліентам больш за тры дзясяткі інфармацыйных пазыцыяў, сярод якіх:

- курсы абмену наяўнай ***СКВ***,
- вынікі таргоў на міжбанкаўскіх
- валютных біржах,
- першасны і другасны рынкі ***ГКО***,
- рынак пазабанкаўскіх паслугаў і ***МБК***,
- афіцыйныя курсы валютаў, устаноўленыя Нацбанкамі іншых краінаў,
- ***фінансавыя навіны*** зь Беларусі, Расеі, краінаў СНД і Балты й шмат што яшчэ.

Даведкі па

Тэл. 239-45-19, 239-42-27, 239-45-08

Існуе ня менш як тры прычыны, зь якіх варта зьвярнуць увагу на нашую прапанову:

1. ***Цэны на інфармацыйныя паслугі ІА "ЭКОПРЕСС" - самыя нізкія з існуючых на сёньняшні дзень.***
2. *Нашыя абанэнты* ***самастойна фармуюць інфармацыйны пакет,*** *маючы магчымасьць у любы момант зьмяніць яго зьмест.*
3. *Інфармацыя прадстаўляецца па факсымільнай ці мадэмнай сувязі. Нашыя* ***спэцыялісты бясплатна ўстановяць*** *неабходнае* ***праграмнае забесьпячэньне і навучаць пэрсанал працаваць зь ім.*** *Тэхнічнае суправаджэньне на працягу ўсяго тэрміну дамовы гарантуецца.*

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА

ПВ | месца | Літэр

на газэту **63125**

НАША НІВА

Кошт падпіскі / перадпрас. _____ руб. _____ руб.

Колькасьць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

WHISKY

*) Матэрыял прадстаўлены Брытанскай асацыяцыяй спажыванья

Віскі — ня самы папулярны ў нашых спажыўцоў саграваль-ны напой. Аднак, як і любы тавар, ён мае сваіх прыхільнікаў, якім цікава будзе даведацца, якія адзнакі розным маркам віскі далі дэгустатары. Было прадэгуставана 20 гатункаў віскі. У асноўным гэта так званыя "зьмяшаныя" гатункі, але сярод іх ёсьць пара "солада вых" і адно — "ірляндзкае"*)

ЗЬМЯШАНАЕ ВІСКІ
(Blended whisky)

Гэты напой можа ўтрымліваць да пяцідзесяці розных відаў соладавага і зерневага віскі. Кожная марка мае ўласны букет. Складальнікі сумесяў з года ў год імкнуцца да нязьменнасьці смаку, каб кожны раз, калі Вы п'еце сваё ўлюбёнае віскі, яно павінна мець адзін і той жа, належны яму пах. Дэгустатары прыйшлі да высновы, што некаторыя маркі зьмяшанага віскі маюць больш ярка выражаны смак альбо пах.

Зьмяшанае віскі з надпісамі "Premium" і "De Luxe", як правіла, самыя дарагія, бо зьмяшчаюць вялікую колькасьць розных і больш вытрыманых соладавых віскі.

СОЛАДАВЫЯ ВІСКІ
(Malt Whisky)

Бутэлька, на этыкетцы якой зьмешчанае слова "malt" (солад) можа зьмяшчаць сумесь з соладавых віскі, зьраблены на розных заводах.

У адзінарным (single) соладавым віскі прысутнічае сумесь з розных віскі з аднаго завода, але якія адрозьніваюцца адно ад аднаго тэрмінам вытрымкі.

У параўнаньні са зьмяшанымі гатункамі, соладавае віскі, да прыкладу, у Вялікабрытаніі ўжываюць значна радзей. З-за іх дарагавізны ў людзей можа скласьціся ўяўленьне, што яны, адпаведна, і прыемныя на смак, аднак у ходзе тэсту дэгустатары не адда-лі перавагі нізодзін з апрабаваных марак.

Адрозьненьне на смак у прадукцыі прыкладна сотні нязьмяшаных у Шатляндыі заводаў па вытворчасьці віскі (такіх, як "Glenfiddich" і "Laphroaid") тлумачацца зусім не прысутнасьцю ў віскі розных інгрэдыентаў. Яны залежаць ад месцазнаходжаньня завода, умоваў надвор'я альбо спосабу абязводжаньня ячменя.

Так, напрыклад, кажуць, што менавіта дзякуючы марскім вятрам соладавыя віскі з выспаў (у прыватнасьці, з выспы Айлей) маюць рэзкі ёдавы прысмак. Адзначаны дэгустатарамі "тарфавы" прысмак узьнікае ў віскі ў сувязі з традыцыйнымі спосабамі абязводжаньня — гэта значыць "асалоджваньня" —ячнага зерня пры дапамозе паленьня торфу.

Вам таксама могуць сустракацца віскі з такімі надпісамі на этыкетцы: "Highland" ("краіна гор") альбо "Lowland" ("краіна раўнін"). Яны прыгатаваныя, адпаведна, альбо больш на поўнач, альбо больш на поўдзень ад умоўнай рысы паміж гарадамі Дандзі на ўсходзе і Грынак на захадзе Шатляндыі.

СЁЕ-ТОЕ ПРА ВІСКІ

** Назва напою "віскі" мае гэльскія карані: на гэтай мове шатляндзкіх і ірляндзкіх кельтаў "uisgue beatha" азначала "жывая вада".*

** Усе гатункі віскі павінны ўтрымліваць прынамсі 40 працэнтаў сьпірту.*

** Віскі павінны быць вытрыманымі ў дубовых бочках ня менш за тры гады.*

** "Шатляндзкім" віскі можа называцца толькі тады, калі яно перагнанае і вытрыманае ў Шатляндыі.*

** На бутэльках з напоямі, прыгатаванымі ў ЗША альбо Рэспубліцы Ірляндыя, слова "whisky" звычайна пішацца праз "e" —"whiskey".*

ЗЕРНЕВАЕ ВІСКІ
(Grain whisky)

Гатуецца з сумесі ячнага соладу і неасаладжальных злакаў, такіх як пшаніца альбо кукуруза. У яго больш сьветлы колер і меншая вытрымка (але ня менш за тры гады). Як і адзінарнае солада-вае віскі, адзінарнае зерневае гатуецца на адным заводзе. Але такіх віскі выпускаецца вельмі мала — больш часьць зь іх дадаюць у зьмяшаныя гатункі.

ІРЛЯНДЗКАЕ ВІСКІ
(Irish whiskey)

У адрозьненьне ад шатляндзкага, любое ірляндзкае віскі перагоняецца ня два, а тры разы. Дэгустатары палічылі, што адна зь лідуючых марак на рынку, "Jameson", мае больш мяккі арамат у параўнаньні з астатнімі апрабаванымі гатункамі. Ірляндзкае віскі гатуецца з сумесі асалоджанага і неасалоджанага зерня, а часам і іншых злакаў, напрыклад, кукурузы.

ІНШЫЯ ГАТУНКІ

Назва амэрыканскага віскі "бурбон" пайшло ад акругі Бурбон у штаце Кентукі. Сёньня яно выпрабляецца таксама ў штатах Тэнэсі, Індыяна і Ілінойс, а гатуюць яго не зь ячменю, як іншыя гатункі, а з жыта і кукурузы.

З гэтых жа злакаў гатуецца і канадзкае віскі. У параўнаньні з астатнімі гатункамі яно больш лёгкае на смак дзякуючы асабліваму, "бочачкаваму" мэтаду перагонкі зерневай сумесі. Найбольш вядомай зьяўляецца марка "Canadian Club".

Уэльскае віскі, хоць і зьяўляецца сумесьсю шатляндзкіх віскі, адрозьніваецца тым, што яго фільтруюць праз розныя тразы для наданьня спэцыфічнага арамату. Існуе толькі дзьве маркі гэтага гатунку — зьмяшанае віскі "Swn Y Mor" і соладавае віскі дзесяцігадовай вытрымкі "Prince of Wales".

НАША ПАРАДА

З 20 пратэставаных марак віскі дэгустатары выдзялілі чатыры. Усе яны аказаліся шатляндзкімі віскі зьмяшанага гатунку.

** Віскі маркі "Asda Old Scotch Whisky" ня толькі спадабалася дэгустатарам больш за астатнія, але аказаліся і самым танным. Таксама магчыма выдзеліць віскі маркі "White Horse Fine Scotch Whisky". Яго тарфавы прысмак і моцнасьць аказаліся вышэй за сярэдні ўзровень.*

** Дэгустатары лічаць, што смак віскі "The Famous Grouse Finest Whisky" лепей за большасьць астатніх марак — ён больш салодкі, але менш церпкі.*

** Дэгустатары аддалі перавагу смаку і паху віскі "Johnnie Walker Black Label 12-Year-Old Scotch Whisky Extra Special". Яны вырашылі, што інтэнсіўнасьць і пякучасьць смаку гэтай маркі — вышэй за сярэднюю.*

☞ ПРАДЭГУСТАВАНЫЯ МАРКІ

Спэцыялісты прадэгуставалі 17 марак віскі зьмяшанага гатунку (шэсьць зь якіх выпускаюцца самастойна фірмамі-ўладальнікамі сетак супэрмаркетаў і вытворцамі, якія ня маюць зарэгістраванай гандлёвай маркі), дзьве маркі адзінарнага соладавага віскі і адну марку ірляндзкага.

☞ ДЭГУСТАТАРЫ

Група дэгустатараў была складзеная з аматараў віскі з добра разьвітым густам, якія прызвычаеныя піць яго як у чыстым выглядзе, так і з вадой альбо з ільдом. Яны параўноўвалі дзьве маркі віскі за адзін раз і паведамлялі, якая зь іх спадабалася ім больш і чаму.

☞ ПАРАЎНАНЬНЕ

Кожная марка віскі параўноўвалася з усімі астатнімі па два разы. У кожным выпадку дэгустатары ня ведалі, якія менавіта маркі яны параўноўваюць на гэты раз.

☞ ПРАЦЭС ДЭГУСТАЦЫІ

Перад тым, як спрабаваць віскі, дэгустатары вярцелі яго ў спэцыяльным "нюхальным" келіху і рабілі носам глыбокі ўдых, каб ацаніць пах напітка. Пры дэгустацыі ў віскі дадавалі строга адмераную колькасьць крынічнай вады. Глыбока ўдыхнуўшы, дэгустатар набіраў поўны рот напою, але не праглынаў яго, бо гэта магло паўплываць на адзнаку наступнай маркі віскі.

☞ КРЫТЭР

Кожная марка віскі параўноўвалася на пах, церпкасьць, інтэнсіўнасьць і цукраватасьць смаку, пякучасьць, соладавасьць і тарфавы прысмак; акрамя таго, улічвалася меркаваньне пра напой увогуле. Як правіла, дэгустатары аддавалі перавагу таму віскі, у якога ім больш падабаўся пах, а таксама таму, якое, на яго меркаваньне, валодала больш інтэнсіўным смакам і мела соладавы альбо тарфавы прысмак.

ФІРМОВЫЯ МАРКІ ЗЬМЯШАНАГА ВІСКІ

"BELL'S EXTRA SPECIAL 8-YEAR-OLD SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выражаных асаблівасьцяў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Вельмі мяккае выключна прыемнае на смак, ніякай рэзкасьці". "Вельмі пячэ, гэта значыць вельмі моцнае"; "Дастаткова адчувальны масьляністы прысмак".

"THE CLAYMORE SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выражаных асаблівасьцяў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш тонкі смак, не такі тарфяністы і рэзкі. Надае адчуваньне дабрабыту"; "Ні то ні сё, прэсна і сумна"; "Трохі рэзкае і пратрыманае".

"THE FAMOUS GROUSE FINEST SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 5

Заключэньне дэгустатараў: Больш мяккае і саладчэйшае за астатнія.

Камэнтар дэгустатараў: "Цяжка ўтрымацца, каб непраглынуць", "Цудоўны лёгкі смак у спалучэньні з па-сапраўднаму адчувальным тарфавым і соладавым прысмакам".

"J&B RARE"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: Менш тарфяністае і моцнае і зь менш прыемным пахам.

Камэнтар дэгустатараў: "Значна лягчэйшае. Мае прысмак, які застаецца надоўга", "Больш лёгкае, добра збалянсаванае віскі з тонкім смакам і пахам"; "Трохі бяссмакавае, нягледзячы на шматабяцальныя пахі".

"STEWART'S CREAM OF THE BARLEY RARE SELECTED BLENDED SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "На зьмену першапачатковаму дастаткова лёгкаму смаку прыходзіць вельмі прыемны абвалочаны соладавы прысмак"; "Зашмат аддае соладам".

"TEACHER'S HIGHLAND CREAM"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Няма пякучасьці", "Вельмі насычанае і больш згладжанае віскі"; "Патрэбна зьберагчы для непажаданага кавалера Вашай дачкі. Слабое, бясцмакавае і непрыемнае (як і вышэй названы кавалер)".

"JOHNNIE WALKER RED LABEL OLD SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі —няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Ня моцнае, ня слабае, мяккае з павольна расьцякаючым цяплом. Прыемныя застаюцца адчуваньні"; "Грубая сіла"; "Вельмі тарфяністае"; "Вельмі насычанае".

"JOHNNIE WALKER BLACK LABEL 12-YEAR-OLD SCOTCH WHISKY EXTRA SPECIAL"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 5

Заключэньне дэгустатараў: Больш моцнае і пякучае, з вельмі прыемным арамат ам.

Камэнтар дэгустатараў: "Вельмі мяккае, амаль масьляністае". "Добра збалянсаванае, пякучасьць і моцнасьць ў спалучэньні з прыемнай сумесьсю прысмакаў", "Аглушае адчуваньні", "Зашмат пякучае".

"WHITE HORSE FINE OLD SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 5

Заключэньне дэгустатараў: Мацнейшае, больш моцны тарфавы прысмак.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш ярка выяўлены букет, прыемнае спалучэньне салодкаватасьці і тарфяністага прысмака"; "Некалькі рэзкаватае, няцёрпкае, але вельмі смачнае віскі, нягледзячы на ўсю сваю моц".

"WHYTE & MACKAY SPECIAL RESERVE"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш "кусачае", у цэлым — больш характэрнае, асабліва тарфавы прысмак", "Вельмі слабы смак, што ў ім ёсьць, так гэта гаркота".

НЕФІРМОВЫЯ МАРКІ ЗЬМЯШАНАГА ВІСКІ

"WILLIAM GRANT'S FAMILY RESERVE"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае; ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш лёгкае; уражаньне, што на смак яно менш пякучае, але цяпло ў роце застаецца"; "Мяккі, цёплы напой"; "Больш грубае на смак — таньней і горшай якасьці".

"ASDA-OLD SCOTCH WHISKY FINEST BLEND"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 5

Заключэньне дэгустатараў: Спадабалася практычна ўсім, але ярка выяўленых адрозьненьняў у яго няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Цудоўная сумесь торфавых смакаў, лёгкая саладкаватасьць"; "Больш моцны пах, больш пякучае, соладавы прысмак абвалоквае ўвесь рот".

"SAFEWAY FINEST SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі менш прыемны пах.

Камэнтар дэгустатараў: "Ёсьць нейкі прысмак "хіміі"; "Здаецца больш моцным, але на смак — прыемнае і ня вельмі пякучае"; "Больш мяккі і ня згладжаны смак".

"SAINSBURY'S BLENDED SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: Тарфяністы прысмак слабейшы, чым у астатніх.

Камэнтар дэгустатараў: "Мякчэйшы і менш пякучы, не адмовіўся б глытнуць яшчэ"; "Жахлівае, аддае мэдыцынай, нецікавае, проста пячэ і пакідае непрыемны прысмак".

"TESCO SPECIAL RESERVE"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш насычаны пах, мякчэйшае, соладавы прысмак мацнейшы"; "Адчуваецца крыху больш шырокі набор розных прысмакаў"; "Вельмі рэзкі, "камэрдыйны" тып моцнага віскі.

МАРКІ СОЛАДАВАГА ВІСКІ

"THRESHER — GLENSIDE FINE BLENDED"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: Больш рэзкае і пякучае, чым астатнія.

Камэнтар дэгустатараў: "Мяккі і ў той жа час моцна адчувальны "бочкавы" смак, але пакідае вельмі прыемнае адчуваньне"; "У роце захоўваецца рэзкі грубаваты прысмак".

"VICTORIA WINE — GLEN ROSSIE SELECT SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — менш прыемны пах.

Камэнтар дэгустатараў: "Такім я сябе ўяўляю добрае віскі". "Вельмі пякучае — забівае салодкі прысмак"; "Больш падзіцца для "сугрэву" зімой у гарах".

"GLENFIDDICH SPECIAL OLD RESERVE SINGLE, PURE MALT"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых адрозьненьняў няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш шырокі смакавы дыяпазон, застаецца смак садавіны, і ўсё гэта не хаваецца за яго мурамі"; "Ёсьць у ім штосьці такое дзіўнае, але што менавіта, не разумею".

ІРЛЯНДЗКАЕ ВІСКІ

"THE GLENMORANGIE SINGLE HIGHLAND MALT SCOTCH WHISKY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: На сярэднія адзнакі — няд-рэннае, ярка выяўленых асаблівых якасьцей няма.

Камэнтар дэгустатараў: "Больш моцны пах, рэзкі смак, лепшае на колер", "Больш складанае і цікавае"; "Увесь смак дастаткова моцна перабіваецца ледзянцовым арамат ам".

"JAMESON IRISH WHISKEY"

Рэйтынг смакавых якасьцяў: 2

Заключэньне дэгустатараў: Больш саладкаватае, мякчэйшае і менш пякучае.

Камэнтар дэгустатараў: "Менш церпкі і не такі пякучы"; "Уцэлым прыемны рэшткавы прысмак (кветкавы альбо травяны); "Дзіўны букет і рэшткавы прысмак траваў".

ГРАМАФОН.



СЯРГЕЙ ПАТАРАНСКІ

***
Разышліся сябры. Я застаўся адзін.
Ашалела матыль каля лямпы мігціць.
Ён хацеў да сьвятла, ён хацеў сьвет адкрыць,
а ў адказ атрымаў толькі боль. Я — адзін,
як і ён — я бязроднае шчасьце шукаў
у жанчынах, віне ды карцёжнай гульні,
але трапіў у пастку лісьлівай хлусьні,
у дуэлі з жыцьцём я прайграў.

АФРЫКАНСКАЕ
Рабочы саваны,
сядзем з табою ў сьвінцовы пыл сельскай дарогі,
скруці мне тытунёвай траўкі.
Пакурым, пасумуем аб мінулых каханых.

АНТАЛЁГІЯ БЕЛАРУСКАГА ПРЫКОЛА
***
Дзяўчына стаяла каля прыбіральні
з вачыма пазбытымі, кінутай веры,
дзе побач стамлёныя людзі гайсаюць
і прастытуткі стаяць у сквэры.
А бруднія пахі агойдвалі скуру
і зь ветрам над горадам пыл разнасілі.
Бамжы неданалкі съціскалі у скрусе,
ў кавярні крычалі аб грошах прапітых.
Дзяўчына, стаячая ля прыбіральні,
навошта стаіш ты, чаго ты жадаеш?
Дзяўчына ня стой, тут ня знойдзеш каханьня.
Рукі бізнэсмэна ты марна чакаеш.

ЖЫДОЎСКАЕ
Напіўшыся жыдоўскае гарбаты,
я з жыдоўкай іду ў сынагогу.
ў сынагозе сьпявалі мне кантры
па-жыдоўскаму, не па другому.
і ад страсьці абняў я жыдоўку,
пазабыўшы, што я ў сынагозе.
ўсё таму што напіўся гарбаты
па жыдоўскай вар'яцкай прыгодзе.

***
Натружаная бабуля
валіскай і чамаданам.
Натружаная бабуля
сьпяшаецца ноччу ў краму.
Пра гэтую чорную справу
бабуля нікому ня скажа,
бо ведае: вечную славу
здабудзе за ўчынак адразу ж.
Але ганарары і зваблі
бабулі старой непатрэбны.
Спатоліць былыя жаданьні
жадае бабуля сумленна.
Сузор'е чырвонага рака
ёй шлях карацейшы падкажа,
калі падланцужны сабака
саплівы свой нос не пакажа.
Ў сваёй замусоленай робе
ідзе яна як Мэльпамэна,
вялікую чорную бомбу
падкласьці пад бок бізнэсмэна.

ПРЫЛУЦКІ СЯРГЕЙ

ЗДАЛЁК
Ой, ты гаю галасісты!
Сваім пяшчотным ціхім сьпевам
Не трывож душу — сумую
Па прасторах Беларусі,
Па ледзь чутным шамаценьні
Адзінокае бярозы,
Што расьце ў краіне шчасьця,
Што сьпявае гімн свабодзе.
Ой, ты жоўтае калосьсе!
дзіця сонца й селяніна.
Залатым сваім валосьсем,
Плаўным съціплым калыханьнем
Мае думкі зноў вярнула
У край, дзе сэрца спачывае,
Дзе душой пакахаў я
Маладую Беларусь!
Бачу скрозь туман чужбіны
Як бягу па травах росных,
Гушчарах, імхом заросłых;
Як лячу на белых крылах
Насустрач сонцу;
Як праводжу журавоў у вырай.
Чую, як гучыць мой голас рэхам
Над Радзімай — над Палесьсем.
Бачу — край мой родны гіне
Ад рукі чырвоных катаў.
І сыноў зямлі ня міне
Адзінота ў чорных кратах.
Не прапусьціць іх зьнявага,
Не забудзе іх пагарда,
Але для хворай Беларусі
Яны застануцца сынамі.

ДЗЕ ТЫ, КАЛІНОЎСКІ?
Ня сьпіш ты, ведаю, ня сьпіш.
Ты ўсё жыцьцё аддаў змаганьню
І адышоў
З галавой у пятлі
Табе прызначаны быў
Цяжкі шлях паўстаньня.
Усю ноч, да раньня,
Ня бачыў ты ня сну, ня сноў
Ня траціў ніколі
Надзеі зь верай наіўнай, цьвёрдай,
Бел-чырвона-белай!
Радзімы гонар
Ты сьвету прад'явіў
І зьнік трагічна.
Беларусь
Камяком праглынула сьмерць.
Ды людзі кажуць: "Пасьля
Вяртаюцца героі ў сьвет
У другім абліччы."
Дзе ж ты,
Дапамажы гінучай краіне.
Яна цябе чакае.

АЛ. ТРАФІМ

ГОРАД СЬПІЦЬ
Уначы сьпіць, стаміўшыся, горад
Ад турбот мітусьлівага дня.
Як бязьмежнае, зыркае мора,
Зіхаціць у яскравых агнях.
Сьпяць дамы і пустыя касьцёлы
Над прыціхлай начною ракой.
Толькі сьветлыя ў небе анёлы
Сьцерагуць яго сон і спакой.
Спачывае брук стомленых пляцаў
Ад сьпякоты гарачага сонца.
Па пакоях прыгожых палацаў
Вартавыя шыбуюць бясконца.
Людзі сьпяць у паўзмрочных кватэрах
І пра шчасьце забыўшы і гора.
Ноччу цёмнай, як быццам пантэра,
Сьпіць да раніцы съцішаны горад.

ЧАРНЯКЕВІЧ ЮРЫ

+++
Беларусы! Вернымі будзьце
Бацькаўшчыне і гербу свайму
Аб гербах і сцягах другіх Вы забудзьце,
Толькі Пагоня прабудзе ад сну!
Разам зь ёй змагаліся дружна
Нашы браты ў старыя гады —
У Грунвальдзкай бітве, пад горадам Ворша,
Разам зь ёю перамаглі!
Так што, трымай, беларус,
Пакуль зможаш,
Герб наш славуты
І сьцяг наш сьвяты!

***
Размаўляць на мове трэба,
Вельмі трэба нам цяпер,
Бо сустрэчы зь ёю сёньня —
Толькі ў кнігах — вер-ня-вер.
Мова родная! Цябе
Забівалі і зьнішчалі
І аднак ты выжывала —
Дзякуй Вам, сяляне!
Дзякуй песьняры і Вам
Што родную палюбілі
І пісалі Вы на мове
Пра якую ўсе забылі!
Дзякуй усім, хто не баіцца
Не цурацца родной
Мовы нашай дарагой!
Дзякуй продкі, вельмі дзякуй!
Захаваці Вы сваю,
Мілагучную, жывую,
Мову беларускую маю!
Маю - і ўсіх беларусаў,
Маю - і ўсяго Сусьвету,
Маю - і Вашу, чытачы,
Нам трэба яе зберагчы!

АНДРЭЙ РЭЎТ

+++
Нібы прывідаў краіна —
Стаяць дрэвы ўсе ў сьнягу:
На галінах ялавінаў
Гурбы белага пуху.
І на дубе, што бязь ліська,
Аджывае доўгі век,
На чарах каля крыніцы,
Што спынілі хуткі бег,
На асінах гэтых стромкіх,
Што чарнеюць на ўзгорку —
Сьнег ляжыць на ўсім.
Прыгажэй за ўсіх бярозкі
Што да самай. Да зямлі,
Зьвесілі свае сярожкі —
Белай кветкай расьцьвілі.
Усё наўкол, нібы абута,
Усё ў белы сьнег закута.

В.ПСЭЎДОНІМ

Пра свабоду раба
Прысьвячаецца табе

Я раб САБЕ,
сваю душу
схаваў глыбока па кішэнях.
Кажу сабе,
сабе кажу,
што стаць разумна на калені.
Лепш растапіць
сябе
у днях,
спазнаць,
што значыць гэта —
шчасьце.
Ды толькі
сэрца
на нажах
мне хтосьці
падымае часта.
І ты ня кліч
пакуль
паэт
забіць таго, хто ўсім кіруе,
пакуль у сэрца пісталет —
кожны ў сваё —
не накіруе.
Хай дажываюць прэзыдэнты.
На іх ня хопіць нашых куль.
А перш чым стацца інсургентам,
забі
сябе
пакуль.

ЯНКА НАРАЧАНСКІ

+++
Як загадкава бывае, часам
Назіраць за зорным небам:
Іншы раз, як бы з жахам
Ад бясконцасьці прасторы...
Быццам я закалдаваны
У гэтым вінаваты зоры
Змалку, бо зачараваны
Дзіўным сьветам іх сузор'яў
Ускалыхнуў ён нібы ўсэрцы
Гаму цэлую пачуцьцяў,
Забываеш і аб сьмерці.
Колькі ж у нас жыцьцяў?
Ужо было і будзе можа многа?
Не, ня скажа сьвет плянэтаў
Дзе жылі: ад дзіця да старога
Зь якіх галяктыкаў і сьветаў?!
Мы прыйшлі сюды, цяпер
На Зямлю, нашу плянэту.

11 чэрвеня 1996 г.

МАТЭЙ ЛАГОДНЫ

+++
Скрыдлам чорным роспач трапеча
Сьніцца шэрасьці розная шэрасьць й галеча...
Хутка й зноўкі прывядуць
Натоўпу думкі шэрыя
На ўзвышша Чэрапавае.
Й стаяць там будуць
Думкі сьветлыя
І думкі чорныя разам,
Цьпікамі прыбітыя за рукі,
Да кіпарысавага жэрдзя прывітыя,
Абкораныя, роўныя колькі,
Будзем разам стаяць,
Пакуль не ператнорымся
У шэрую, аднолькавую масьць.

17.09.96

+++
Шаноча восень шэрымі дажджамі,
Сьцякаюць кроплі па зямлі
Сьмяецца восень над сьлязамі,
Што краскі лета пралілі.

16.09.96

ЛІСАХВЕТА, 10 ГОД

РОДНАЯ МОВА
Шануй ды паважай,
Кахай ды не апускай
Сваю родную, дарагую мову.
Як яна пяецца!
Як гучыць!
Слова ёй даецца не маўчыць.
Хто яе загразьне,
Хто ды замарлуе,
Той не Беларус, а бранза,—
Мову не шануе

25.11.96

ІРЭНА ЯНЧАНКА

Сабе я не знаходжу месца,
Абрыдлі вечныя размовы,
А як было... А як мо' будзе.
Усё гэта словы, толькі словы
А абыякавасьць навокал,
яна страшней за гнеў ці здраду,
Яе сьляды паўсюль. Кінь погляд
Наперад — яна ўдарыць ззаду.
Зьдзіўленьне, непаразуменьне,
А то і зьдзек, ды яшчэ злосьць
Звычайна чую у адказ я,
Калі спытаць штось давялося.
"Ды глупства — гэтыя ідэі,
Пра мову, годнасьць Беларусі".
Што жыць ня можа без надзеі
Як мы з табой — заўжды ў скрусе.
Ніхто ня хоча нават думаць,
Аб тым, што творыцца навокал.
Свабодай страўнік не напоўніць,
І здраду цяжка ўбачыць вокам.
А Незалежнасьць не сагрэе.
(Хоць з гэтым можна паспрачацца;
Калі наш сьцяг над намі рэе,
Лягчэй нам ўсім за розум ўзяцца.)
Але ж закон такі існуе,
Аб ім ўсе ведаюць спрадвеку:
Што калі дрэнна Ёй — Радзіме,
Ня будзе добра чалавеку.

17.07.96 г.

***
РОСПАЧ
Што адбываецца са мною?!
Ня веру болей у Удачу,
Сьмяюся, праз хвіліну-плачу.
(Ну, не фізычна, дык душою.)

І ўсё ня так, і усё ня тое...
Ня ведаю я, чым заняцца
І як мне верыць, спадзявацца,
Калі ўсё зганьбілі сьвятое.

Крычаць — дык хто мяне пачуе?!
А і пачуе — усьміхнецца
І зноў сьпіною адвярнецца,
Не зразумеўшы, што хачу я.
І сапраўды, ну што мне трэба,
І да чаго я ўсё імкнуся?
Але балюча мне, чамусьці,
Калі гляджу Радзіме ў Неба.

Гляджу, бы ў твар старому сябру,
Але пасьля адводжу вочы,
Чаму ўсе сьпяць спакойна ўночы,
А са сьцягоў лінаюць фарбы?..

І ўсё-ж я ў будучыню веру.
Малюся я аб Беларусі,
Каб не жыла, як я, у скрусе,
А годнасьці спазнала меру.
14.05.96 г.

МАЯ МАЛІТВА
Божа любы і магутны!
Да цябе малюся.
Дай жа шчасьця, лепшай долі
Маёй Беларусі.
Будзь жа літасьцівы, шчодры.
І ў тузе, ў спакусе
Хай жа выпрастаюць сьпіны
Браткі-беларусы.
Дай ім розуму, паболей
Годнасьці ды моцы.
Хай ніколі ды ня зьнікне
Вера ў сэрцах хлопцаў.
Вера ў будучыню нашай
Сьветлае Айчыны.
Для журбы калі ня будзе
Ні адной прычыны.
Хай цяпер усім нам цяжка,
Нацыя ня згіне.
Будуць Сонца, Мова, Людзі
Верныя Айчыне.

27.07.96

БРАНІСЛАЎ ПЯТКЕВІЧ

ЗРАЗУМЕЛА
Пабыла й я на сходзе,
Дзе ўсё ішло па модзе
Засавечаных гадзін,
Дзе разумным слыў адзін.
А астатніх дэлегатаў
Тут сабралі для мандатаў,
Што трымаюць свой булат
Для ўзмацненьня рук улад
Збор, засьвечаны маною,
Тут сабраў нямала гною,
Каб вышэйшаму закону
Узьвясьці сьцяну-заслону.
Хто па-воўчы ужо вые,
На сумленьне лье памыі
Інпадумца б'е пад дых
І у твар кідае чых.
Я зьбянтэжана глядзела,
Задранцьвела маё цела;
Па баках адзін харал:
Прэзыдэнту сто пахвал,
І як сонцу той асот,
Заглядае толькі ў рот.
Выхваляліся "славяне"
Завадзкія і сяляне
Пра няспынны тэмп, надой
Неразбаўлены вадой.
Убівалі: родны дах
Устатаюе нам манарх;
А парлямэнт наш ганебны,
Як на шоўк апратак зрэбны.
Я ўсьвядоміла, што душы
Прадаюцца тут за кушы.
І хваробу доўгай сьпячкі
Можна лечыць за падачкі.
І лісьлівасьцю памады
Можна красьці хвост пасады.
Я прыехала дамоў
І убачыла тут зноў:
І інфляцыю-пачвару,
І высокі кошт тавару,
Неараны дол палетак,
Згаладалых родных дзетак.
Увушшу струна іграе,
Што кранула злыдняў зграя.

14 лістапада 1996 года.

ІНЭСА ТАРАСАВА

АПАЛІТЫЧНЫ
Свабоды, годнасьці ды хлеба —
Для незалежнай Беларусі.
Апошні шлях вядзе да неба —
Іду, кахаю і малюся.

ЛІСАХВЕТА, ГАННА, АКСІНЬНЯ, КУЛІНА, НАСЬЦІЧКА

Першай Беларускай газэце з рысункамі

Наша Ніва — мілая сэрцу газэта,
Шчыра віншую цябе, як паэта,
Так, як павіншаваў бы цябе сёньня
Наша сіняя зорка Максім Багдановіч.
Жадаю ўсёй беларускаю душою
Так, як сонейка жадае вясною,
Апасьля лютай зімы
Абудзіць жывую прыроду,—
Служыце ж заўсёды
Усяму скрыўджанаму беларускаму народу.
Гэтыя словы былі надрукаваны
У Нашай Ніве дзевяноста год таму
Дык не зьмянілася амаль нічога, а чаму?
Таму, што ня ўсе беларускаю душою
адукаваны.
Каб сьлёзы ціха ў кутку не выціраць,
Трэба волю й свабоду
Кожнаму беларусу ў душы сваёй
прыдбаць!

Я веру, надыдзе час вясёлых мар,
Калі зразумее кожны беларус,
Што толькі ён тут гаспадар,
Ніхто, а толькі наш рахманы белы вус!

Нейкіх там дзевяноста
Наша Ніва —
Каня вогненнага
Залатая грыва,
Летапісца сівога —
Рука цьвярдая,
У самым росквіце
Ты дзеўча маладая,
Госпада Бога пячатка
Усім Беларусам —
Родная матка!

В.ЗАБАРОЎСКАЯ

Голас у абарону паэта Славаміра Адамовіча

Чым ты была, Беларусь мая родная?
(Я.Купала)
Чым жа ты стала ў свеце вялікім?
І ачмурэлай віхуры падзей...
Перад сьвятой Багародзіцы лікам
Куды завяла ты сваіх дзяцей?

Топча іх душы сваім чаравікам
Самы ўлюбёны (на сёньняшні дзень)
Перад сьвятой Багародзіцы лікам —
Кожны з нас для яго — што той пень.

Енчым, скуголім, заходзімся крыкам —
Толькі каму наша болька баліць...
Перад сьвятой Багародзіцы лікам
Сьлёзы ці кроў давядзецца нам ліць.

МІХАСЬ МАЛІНОЎСКІ

Пераклады вершаў Паўла Васільева
Ахвярую Славаміру Адамовічу

(частковы пераклад "Песьні аб пагібелі казачага войска")

І
Што жа ты, песьня мая,
Маўчыш?
Што жа ты, казка мая,
Маўчыш?
Нацягнутыя струны твае —
Камыш,
Вясёлыя хвалі твае,
Іртыш!
Вясёлыя хвалі твае
Ува льду,
Зь песьняй рука ў руку
Па лёдзе іду,
Зь ветрам рука ў руку
Сьлізгаю — бягу:
"Белыя бярозы расьлі
У сьняту",
Зь мілай рука ў руку
Съмяюся бягу.
Заручальным пярсьцёнкам
Агонь у сьнягу.
Цёплы шэпт чую
Дрыжыкі затойвае,
Халодная ільдзістая
Рука твая,
Хіба не прыпомніш ты
Мяне —
Ледзяны карунак
На акне.
Голуб мёртвай дзюбай
Да акна прырос,
А пяром паўлінавым
Аброс мароз.
(...)

1929-1930

***
Мой родны бацька стэп, прымі маю,
Афарбаваную сэрца гарачай крывёю,
Стэпавую песьню! Нахіліўшыся да
ўзгалоўя
Ўсіх траў тваіх, аднаго цябе пяю!

Да пявучага зьвяртаюся гуку,
Яго не пацьмянее серабро,
Так укладвай, о стэп, у сыноўю руку
Крывое ястрабінае пяро.

6 красавіка 1936

***
Зноўку ўдвух,
Але ня ўжо,
Чужых моваў віном п'яна,
Ты любіш ускананыя пасьцелі,
Мая мангольская княжна!

Дарэмна, вельмі можа стацца...
Я не сябрую з такою надзеяй.
Я цэлы век гатоў бадзяцца
Па хісткім лесьвіцам з табой,

І слухаць —
Як ты палка стогнеш,
Забыў скрыпучыя пасьцелі,
І рукі, ледзь далоняў вышэй
У цемрадзі апраметна цалаваці.

Люты 1934

ПАНЯДЗЕЛАК, 16

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 "Прарочая птушка". Д/ф.
8.30 Мультфільмы.
9.00 Музычны салён Элэаноры Язерскай.
9.35 Бон тон.
10.05 Тэлевізійны Дом кіно.
10.35 Цёмны пакой.
11.05 Аўтарскі канцэрт Э.Ханка.
15.00 Навіны.
15.10 "Ачкарык". М/ф.
16.00 ТБ — школе.
16.20 Студыя "Вакно".
17.05 На добры лад.
17.20 Пазнай сябе
17.50 "Ахоўваецца дзяржавай". Д/ф.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Музычная абойма".
19.05 "Крок".
19.35 "Гэтага мы не праходзілі..."
19.50 Беларускі дом.
20.20 Люстэрка.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 Музычны антракт.
22.05 М/ф "Знахар". С. 1.
23.15 "Галасы мінулага".
23.45 Навіны.

ОРТ

17.00 Навіны.
17.15 "Новая ахвяра".
18.05 Надвор'е.
18.10 Час пік.
18.35 Адгадай мэлёдыю.
19.00 "Мы".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.45 "Багз-2". "Паляванне за "Чырвоным Мэркурам".
21.50 Прэс-клюб.
22.45 Навіны.
22.55 М/ф "Мужчынская шчырасьць", "Панцыр".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

17.05 Тэхнадром імя І.П.Кулібіна.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант праўды.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.00, 23.00 Весткі.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Схаванай камэрай.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Прыз "Известий". Фінляндыя — Расея.
23.25 Тавары — поштай.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

13.00 Тэрмін адказу — сеньня.
13.30 Парады садаводам.
13.40 "Тэма для арганаў". Т/ф.
13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
14.10 "Гісторыя каханьня".
14.55 "Сугучча". Т/ф.
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
15.25 Міжнародны агляд.
16.10 "Убойны аддзел".
17.00 Кубак свету па фэхтаваньні.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялік фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.15 Як быць каханымі...
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Падзеі.
22.20 Спартовы агляд.
22.30 Гістарычныя вышукі.
23.10 "Тэлекампакт".

НТВ

5.00 Сеньня зранку.
9.00 М/ф "Гары і сын".
11.30, 13.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая "Часінка".
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 "Блакітнае дрэва".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Аварыя".
20.45 Доктар Угал.
21.35 Час сэрыялу. "Спадарыня сьледчы".
22.30 Часінка.
23.00 Сеньня апоўначы.
23.20 Шахматы.
23.25 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 17

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 "Музычная абойма".
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Абібок.
8.45 "Гэтага мы не праходзілі..."
9.00 ТБ — школе.
9.20 Акаляда.
9.50 Тураб'ектыў.
10.20 "Трапічная сьпёка".
11.50 "Маладзечна-96".
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.35 ТБ — школе.
16.00 Педагагічны экран.
16.45 Усё пра ўсё.
17.10 Востры вугал.
17.40 Музычны антракт.
17.50 Урокі Н.Наважылавай.
18.20 "Будзьце здаровыя".
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Музычная абойма".
19.05 Беларусь-Кітай.
19.40 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 "Знахар". С. 2.
23.20 Творцы.
24.00 Навіны.

ОРТ

11.00 Навіны.
11.10 "Мы і рынак".
11.50 М/ф "Пакет".
13.00 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Квар'етэ "Вяселая кампанія".
14.55 Мульцітролія.
15.10 Чароўны сьвет, альбо Сынэма.
15.40 "Карын і яе сабака".
16.05 ...Да 16 і болей.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.15 "Новая ахвяра".
18.05 Надвор'е.
18.10 Час пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 Тэма.
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.45 М/ф "Па тонкім лёдзе". С. 1.
22.25 Навіны.
22.35 "Па тонкім лёдзе". С. 2.
0.05 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Сьвет прыгодаў". Д/ф.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Мультфільм.
7.35 Ранішні экспрэс-2.
8.05 Рэтра-шлягер.
8.30 "Дарагая рэдакцыя..."
9.00 "Ведаць ня можаш долі сваей..." Д/ф.
16.20 Блек-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.15 Пункт апоры.
17.45 "Вяртанцы". Д/ф.
18.10 Ваша права.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 "На кані".
21.40 Прыз "Известий". Расея — Чэхія.
0.15 Хто на што здатны.
0.25 Гарачая дзясятка.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 "Гісторыя каханьня".
13.00 Тэрмін адказу — сеньня.
13.30 Парады садаводам.
13.40 "Тэма для арганаў". Т/ф.
14.15 "Убойны аддзел".
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
15.25 Тата, мама і я — спартовая сям'я.
16.10 "Чарадзей".
16.35 "Чорны кот".
17.05 Дзіцячае ТБ.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.20 Храм.
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Падзеі.
22.20 Спартовы агляд.
22.30 "Дысыдэнт". М/ф.

НТВ

5.00 Сеньня зранку.
9.00 М/ф "Рамуальд і Жульет".
11.00, 13.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая "Часінка".
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 "Блакітнае дрэва".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Чалавек на каленях".
21.35 Час сэрыялу. "Спадарыня сьледчы".
22.30 Часінка.
23.00 Сеньня апоўначы.
23.20 Шахматы.
23.25 Мэлямэнія. Пол Макартні.

СЕРАДА, 18

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 "Музычная абойма".
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 "Паляваньні ў чужой краіне". Д/ф.
8.30 Востры вугал.
9.00 ТБ — школе.
9.25 Кампутарны палігон.
10.00 "Трапічная сьпёка".
11.00 "Маладзечна-96".
12.15 Відзьма-нявідзьма.
13.15 "Блуканьне па пакутах". М/ф. С. 1 "Сёстры".
15.00 Навіны.
15.10 "Сінюшкін калодзеж". Мультфільм.
15.40 "Востраў натхненьня".
16.10 "А дзе мне ўзяць такую песьню..." Д/ф.
16.30 Беларускі мэрыдыян.
17.00 Крэда.
17.20 Госьці ў дом.
17.50 Майстэрня.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Музычная абойма".
19.05 Супэргол.
19.35 "Трапічная сьпёка".
20.35 "Хто гэта?"
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 "Жорсткі раманс". С. 2.
23.25 Крок.
23.55 Навіны.

ОРТ

8.00 Навіны..
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 "Парыскія тайны Эльдара Разанава".
9.45 "Клюб падарожнікаў".
10.30 "Сьнежныя майстры". Мультфільм.
10.35 Смак.
11.00 Навіны.
11.10 "Пад дахам сьвету".
11.55 "Маёр Віхар". С. 2.
13.10 "Казьляня". Мультфільм.
13.20 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Лега-га!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Карын і яе сабака".
16.05 Рок-урок.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.15 "Новая ахвяра".
18.05 Надвор'е.
18.10 Час пік.
18.30 "Джэнтэльмэн-шоў".
19.00 "Мая сям'я".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.45 М/ф "Прынцэса Карабу".
22.35 Навіны.
22.45 "Абоз".
23.35 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Сьвет прыгодаў". Д/ф.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
16.20 Блек-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.15 Астралегія каханьня.
17.45 "Вяртанцы". Д/ф.
18.10 Клюб губэрнатараў.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 "Бочка меду".
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 М/ф "Дваццаць дзён без вайны".
23.35 Год і век Дзьмітрыя Шастаковіча.
0.15 Музыка ўсіх пакаленьняў.
0.30 Хто на што здатны.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 "Гісторыя каханьня".
13.00 Тэрмін адказу — сеньня.
13.30 Парады садаводам.
13.40 "Восеньскі Ленінград". Т/ф.
14.15 "Убойны аддзел".
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
15.25 Асабістая справа.
16.10 "Чарадзей".
16.35 "Тэлекампакт".
17.15 Скарбы Пецярбурга.
17.35 Паказывае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.15 "Пажывем — пабачым".
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Падзеі.
22.20 Спартовы агляд.
22.30 "Палацавыя тайны".
22.55 "Дождж". Тэлеспэктакаль.

НТВ

5.00 Сеньня зранку.
9.00 М/ф "Варяцкі дом".
10.30 "Вуліца Сэзам".
11.00, 13.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая "Часінка".
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 "Блакітнае дрэва".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Спэцыялісты".
20.40 Расейскі альбом. Група "Чайф".
21.35 Час сэрыялу. "Спадарыня сьледчы".
22.30 Часінка.
23.00 Сеньня апоўначы.
23.20 Кавярня "Абломаў".

ЧАЦЬВЕР, 19

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 "Музычная абойма".
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 Вяскоўцы.
9.00 Телебом.
9.40 Мультфільм.
9.50 Каралеўскае паляваньне.
10.30 "Трапічная сьпека".
11.30 Госьці ў дом.
12.00 "Маладзечна-96".
13.15 "Блуканьне па пакутах". С. 2 "16-ы год".
15.00 Навіны.
15.10 "Белы слон". М/ф.
16.25 ТБ — школе.
16.55 "За Кушлянамі сьнег". Д/ф.
17.20 Адсэнал.
17.50 Урокі Н.Наважылавай.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Музычная абойма".
19.05 Крок.
19.40 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 "Жорсткі раманс". С. 2.
23.25 Крок.
23.55 Навіны.

ОРТ

8.00 Навіны..
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 "Парыскія тайны Эльдара Разанава".
9.45 "Клюб падарожнікаў".
10.30 "Сьнежныя майстры". Мультфільм.
10.35 Смак.
11.00 Навіны.
11.10 "Пад дахам сьвету".
11.55 "Маёр Віхар". С. 2.
13.10 "Казьляня". Мультфільм.
13.20 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Лега-га!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Карын і яе сабака".
16.05 Рок-урок.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.15 "Новая ахвяра".
18.05 Надвор'е.
18.10 Час пік.
18.30 "Джэнтэльмэн-шоў".
19.00 "Мая сям'я".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.45 М/ф "Прынцэса Карабу".
22.35 Навіны.
22.45 "Абоз".
23.35 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Сьвет прыгодаў". Д/ф.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
10.20 "Выспа загінулых карабляў". М/ф. С. 1.
16.20 Блек-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Ваш партнэр. "Стаўрапальполімэр".
17.15 "Цёмная" для Льва Рохліна.
17.30 "Вяртанцы". Д/ф.
18.00 Новае "Пятае кола".
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Рэк-тайм.
20.45 Надвор'е на заўтра.
20.55 Прыз "Известий". Расея — Канада.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Хто на што здатны.
0.05 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 "Гісторыя каханьня".
13.00 Тэрмін адказу — сеньня.
13.30 Парады садаводам.
13.40 "Сьвяцільнікі Эрмітажа". Т/ф.
14.15 "Убойны аддзел".
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 "Чарадзей".
16.35 Мультфільм.
17.05 Дзіцячае ТБ.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.15 Асабістая справа.
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Падзеі.
22.20 Спартовы агляд.
22.30 Дом кіно.

НТВ

5.00 Сеньня зранку.
9.00 М/ф "Напалеон". С. 1.
10.30 "Вуліца Сэзам".
11.00, 13.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая "Часінка".
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 "Блакітнае дрэва".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Драпежны агонь".
20.35 Расейскі альбом. Група "Мегаполіс".
21.35 Час сэрыялу. "Спадарыня сьледчы".
22.30 Часінка.
23.00 Сеньня апоўначы.
23.20 Шахматы.
23.25 М/ф "Кітайская рулетка".

ПЯТНІЦА, 20

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 "Музычная абойма".
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 "Яшчэ ня вечар..."
8.30 Аксамітавы сэзон.
9.00 ТБ — школе.
9.30 "Паехаў цягнік у Бульзыбар". М/ф.
10.35 Мультфільм.
10.45 Студыя "Калыханка".
11.15 "Трапічная сьпёка".
12.15 Люстэрка.
12.35 "Музыка бязь межаў".
13.15 "Блуканьне па пакутах". С. 3 "Пахмурная раніца".
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.40 Канцэрт мастацкіх калектываў БДУ.
16.45 "Крок".
17.05 Кантрасты.
17.35 Музычны антракт.
17.45 Чарнобыль: праблемы і рашэньні
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Музычная абойма".
19.05 Міжнародны кур'ер.
19.40 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 "Праз алівы". М/ф.
24.00 Навіны.
0.15 Акаляда.

ОРТ

8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.10 "Мая сям'я".
9.50 Пакуль усе дома.
10.25 Грай, гармонік любы!
11.00 Навіны.
11.10 Ад пятніцы да пятніцы.
11.55 "Маёр Віхар". С. 3.
13.20 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Не пазяхай!
15.20 М/ф "Пасыля дожджыка, ў чацьвер...".
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.15 "Новая ахвяра".
18.10 Надвор'е.
18.15 Чалавек і закон.
18.45 Поле цудаў.
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.45 М/ф "Стаўка больш, чым сьмерць".
22.35 Погляд.
23.20 Навіны.
23.35 М/ф "Правасудзьдзе закавулкаў".
1.15 Прэс-экспрэс

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Сьвет прыгодаў". Д/ф.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
10.20 "Выспа загінулых карабляў". М/ф. С. 1.
16.20 Блек-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Ваш партнэр. "Стаўрапальполімэр".
17.15 "Цёмная" для Льва Рохліна.
17.30 "Вяртанцы". Д/ф.
18.00 Новае "Пятае кола".
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 "Блукар". М/ф.
22.05 Эх, дарогі!
22.35 Рэпартэр.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.
0.15 Адамаў яблык.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 "Гісторыя каханьня".
13.00 Тэрмін адказу — сеньня.
13.30 Парады садаводам.
13.40 "Стадыён". Т/ф.
14.15 "Убойны аддзел".
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
15.25 Ток-шоў "Науздагад".
16.10 Чэмпіянат Расеі па міні-футболу.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.15 "Бяз назвы".
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Падзеі.
22.20 Спартовы агляд.
22.30 Як быць каханым.
22.55 Дзеньнік II Міжнароднага балетнага конкурса "Мая".
23.10 "Мрой". М/ф. С. 1.

НТВ

5.00 Сеньня зранку.
9.00 "Напалеон". С. 2.
10.30 "Вуліца Сэзам".
11.00, 13.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая "Часінка".
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 "Блакітнае дрэва".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 "Драпежны агонь".
20.35 Расейскі альбом. Група "Мегаполіс".
21.35 Час сэрыялу. "Спадарыня сьледчы".
22.30 Часінка.
23.00 Сеньня апоўначы.
23.20 Шахматы.
23.25 М/ф "Рыба-забойца".
1.10 Начны канал. Эратычныя шоў сьвету.

СУБОТА, 21

БТ

8.00 Навіны.
8.15 "Музычная абойма".
8.20 Сугучча.
8.40 "Маятнік".
9.25 Здароўе.
10.00 Урокі Н.Наважылавай.
10.30 Усё пра ўсё.
10.55 "Пудзіла". Мультфільм.
12.00 Сьвет прыроды і захапленьняў.
12.25 "Вока".
12.45 Многагалосьсе.
13.15 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
13.35 Каляж.
14.05 "З поваду мокрага сьнегу". Спэктакаль.
15.35 Чацьвертае вымярэньне.
16.15 Гісторыя каханьня.
16.35 "Зорка з зоракаю гаворыць".
17.15 IX Міжнародны фэстываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску.
18.15 Галерэя.
18.45 "Музычная абойма".
19.05 "Гол у Спаскую браму". М/ф.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.45 Музычны антракт.
22.00 М/ф "Эйр-Амэрыка".
23.45 Відзьма-нявідзьма.

ОРТ

6.45 М/ф "Чужыя лісты".
8.20 "Кампутарныя войны-2".
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра.
9.30 Не пазяхай!
10.00 Ранішняя пошта.
10.35 Смак.
11.00 Вяртаньне Трацьцякоўкі.
11.25 М/ф "Апавяданьне гра чэкіста".
13.00 Правінцыйныя гісторыі.
13.30 Пад знакам "Пі".
14.00 Навіны.
14.20 "Саюзмультфільм" прадстаўляе.
15.10 Ералаш.
15.45 "Вакно ў Эўропу".
16.15 "Кола гісторыі".
17.00 Навіны.
17.20 Надвор'е.
17.25 У сьвеце жывёлаў.
18.05 М/ф "Яго звалі Робэрт".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.55 Што? Дзе? Калі?
22.20 "Каламбур".
22.50 М/ф "Выгнанцы".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Лукамор'е.
7.25 Мультфільмы.
8.10 "Сьвет прыгодаў". Д/ф.
8.35 Па вашых лістах.
9.00 Кнігарня.
9.15 Парлямэнцкі тыдзень.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Тэлечасопіс "Здароўе".
10.30 Добрай раніцы.
11.00 21 кабінэт.
11.30 Ананімныя суразмоўцы.
12.00 Сад культуры.
12.30 Прасьцей простага.
13.00, 19.00, 23.50 Весткі.
13.20 "Beatles. Вялікая чацьверка". С. 3.
14.10 Нічога, акрамя...
14.25 Дэ факта.
14.50 Свая гульня.
15.20 Мы з НДІТу.
16.00 Прыз "Известий". Расея — Швэцыя.
18.25 На парозе стагодзьдзя.
19.35 Суботні вечар з Валянцінам Гневушавым.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 Зусім сакрэтна.
22.10 "Нявеста ў чорным". М/ф.
0.05 Праграма "А".

САНКТ-ПЕТЕРБУРГ

9.10 "Фаліянт".
9.25 Па рацэ плыве сякера.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 "Гонар маю".
10.40 "Неўтаймаваная Афрыка".
11.10 Ток-шоў "Науздагад". Уладзімір Машкоў.
11.40 Жарсьці-мардасьці.
12.10 Да 60-годзьдзя Пецярбурскага ТБ.
14.10 Мы і банк.
14.45 Расейская сядзіба.
15.10 Спартыўны агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 Мультфільм.
16.30 Дзіцячае ТБ.
16.45 Ад і да...
17.00 Іржавыя правады.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.20 "Танцуй, танцуй". М/ф. С. 1.
20.45 "Неўскі праспэкт". Т/ф.
20.55 Сьвецкая кроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.45 "Парад парадаў".
22.30 "Міраж". С. 2.

НТВ

7.00 Сеньня зранку.
9.00 М/ф "Іншаземка".
10.10 "Ад вінта".
10.30 "Зразумей мяне".
11.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 Хакей. Рэгулярныя матчы НХЛ. "Чыкага Блэк Хоўкс" — "Флорыда Пэнтэрз".
14.30 Панарама.
16.00 Кнігарня.
16.30 "Вялікая ілюзія. Вялікае вандраваньне ў Галівуд".
17.00 "Чалавек-павук".
17.30 "Я і мой собака".
18.00, 21.00 Сеньня ўвечары.
18.30 "Чалавек у масцы".
19.20 "Крымінальная Расея: сучасныя кронікі". "Ваўкалак".
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 М/ф "Выпускнік".
23.30 Шахматы.
23.35 Трэцяе вока.
0.20 Начны канал. "Плэйбой".

НЯДЗЕЛЯ, 22

БТ

8.00 "Незвычайны альпінізм".
8.20 "Опэра". Д/ф.
8.40 "Кочан".
9.05 Тэлебом.
9.45 Студыя "Калыханка".
10.15 "Усё нармальна, мама!".
10.45 Тураб'ектыў.
11.15 "Цыркі сьвету".
12.50 Студыя "Вакно".
13.15 "Вайна ў паветры".
13.40 Мост.
14.10 Вяскоўцы.
14.40 Залатыя ключы.
15.15 Вяршыня сьвету.
15.50 "Віншуем вас!"
16.50 "Алеў, Алеў". М/ф.
18.30 Кампутарны палігон.
19.05 Абібок.
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартыўны тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў "Карамболь".
22.00 М/ф "Зацямненьне".
0.10 Аксамітавы сэзон.

ОРТ

7.00 М/ф "Чук і Гек".
7.50 Ералаш.
8.30 Мультфільмы "Куды ідзе слана", "Кот у ботах".
9.00 Навіны.
9.15 "Непуцевыя нататкі" Д.Крылова.
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Раніцняя зорка.
11.00 Вайсковы кур'ер.
11.30 Грай, гармонік любы!
12.00 Відавочнае-неверагоднае.
12.30 "Падводная адысэя каманды Кусто".
13.25 Сьмехапанарама.
14.00 Навіны.
14.20 "Запрашэньне да музыкі".
14.55 Клюб падарожнікаў.
15.40 Мультфэерверк.
16.25 "Адзін на адзін".
16.55 Надвор'е.
17.00 М/ф "Мусульманін".
18.00 Час.
19.40 "Ніка-96".
23.00 Футбольны агляд.
23.35 Навіны.
23.45 М/ф "У чаканьні лепшага".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Мультфільмы.
7.30 Пілігрім.
8.00 Лята-мільён.
8.15 Прысяга.
8.40 Вуснамі дзіцяці.
9.15 Раніцняя зорка.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Расейскае лета.
10.55 Прыз групы "Сава".
11.00 Чалавек на Зямлі.
11.30 Кнігарня.
12.00 Тэлетэатар. І.Бабель. "З адэскіх расказаў".
12.30 Прасьцей простага.
13.00, 23.15 Весткі.
13.20 "Beatles. Вялікая чацьверка". С. 4.
14.15 Нічога, акрамя...
14.25 Караоке па-расейску.
15.00 Зоркі балетнага конкурса "Мая".
16.10 Футбол бязь межаў.
16.40 Ва ўсіх на вуснах.
17.00 Чароўны сьвет Дысэя.
18.00 Багема. Л.Філатаў.
19.00 Люстра.
19.55 Надвор'е на заўтра.
20.40 Рэпартаж ні пра што.
20.15 "Каханае жанчына механіка Гаўрылава". М/ф.
21.45 "Улоўка-22".
22.40 У Ксюшы
23.30 Царская ложа.

САНКТ-ПЕТЕРБУРГ

8.35 Ацаляльнае слова.
9.10 Тата, мама і я — спартовая сям'я.
9.35 Стыль жыцьця.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Овартайм.
10.35 "Неўтаймаваная Афрыка".
11.05 Мультфільм.
11.20 Таяндыя — краіна вады". Д/ф.
11.40 Флету быть.
12.10 "Міс, мой Міс". М/ф.
14.05 Яшчэ адна Расея.
15.10 "9 дзён да Новага года".
15.40 Мультфільм.
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.25 "Танцуй, танцуй". С. 2.
20.20 Сьпявае Валеры Лявонцьеў.
20.55 Ва ўсіх на віду.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.20 "Паглядзім".
22.35 "Міраж". С. 3.

НТВ

7.00 Сеньня зранку.
9.00 "Дзень анела". Х/ф.
10.10 "Ад вінта".
10.30 "Зразумей мяне".
11.00, 15.00 Сеньня ўдзень.
12.00 М/ф "Вялікія манэўры".
13.50 НТВ-плюс.
14.00 "Дзікая прырода".
16.00 "Ключы ад форта Баяр".
17.30 "Сто да аднаго".
18.00 Сеньня ўвечары.
18.30 "Амэрыканскі дзядуля". М/ф.
20.00 Выпікі.
21.10 М/ф "Далікатасы".
23.00 Лепшыя шоў і варыеты сьвету.

№ 37 (75)

КІНО. МЕНСК

16.12 – 22.12

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* – Чатыры пакоі 16-22 – 16.30 Канец сьвету 16-22 – 18.30, 20.30 Для дзяцей Чынгачгук – Вялікі Зьмей 16-22 – 14.30

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* - Дзікая парачка 16-19 – 14.30 (ільготны) 17.30 20 – 14.00 (ільготны) 15.30 21-22 – 14.30 (ільготны) Патаемная асалода (эратычны фільм) 16-19 – 16.00, 19.00, 20.30 20 – 17.00, 18.30 21-22 – 18.40 Дыскатэка для моладзі 20-22 – 20.00 Для дзяцей: Дыскатэка 21-22 – 16.00

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* - Карына, Карына! (сямейная камэдыя) 16-21 – 14.30 22 –14.30 (ільготны) Гудбай, Эмануэль (заключная сэрыя са знакамітага эратычнага сэрыялу) 16-22 – 16.30, 18.40, 19.50, 21.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Усьмешка" 17, 21-22 – 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка 19 – 21.00 Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30" 20 – 20.30 Кіна-дыска-шоў для дзяцей і падлеткаў 22 – 15.00

ДРУЖБА Дэтэктыў КІД, 11-12 – 18.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для моладзі, 15-16 – з 20.00 па 23.00 Начная інфармацыйна-забаўляльная праграма, 15-16 – з 23.00 па 5.00 Штодзень працуе відэабар з 12.00 па 23.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* - Да дня беларускага кіно: Альпійская баляда 18 – 11.00 Франка (паводле раману Э.Ажэшка "Хам"), На сустрэчы з кінагледачамі – В.І.Садаль, пісьменнік, літаратуразнаўца, рэдактар тэлечасопіса "Роднае слова") 22 – 12.00 Кінапраграма па прафілактыцы СНІДу: Анты-СНІД. Гэта жахліва (і іншыя дакумэнтальныя фільмы) 18-19 – 13.00, 14.30 Жанчына ў полымі (эратычная мэлядрама) 16-22 – 16.00, 20.00 Глыбінная зорка (фантастыка) 16-17, 20-21 – 14.00, 18.00 18-19, 22 – 18.00 Для дзяцей: Казка пра цара Салтана (мультфільм) 20 – 10.00, 21 – 12.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* - Прыгадаць усё 16-22 – 11.00, 18.40, 20.30 Двое: я і мой цень 16-22 – 12.00, 16.20, 20.20 Дрэнныя дзяўчаты 16-22 – 15.00, 17.00 Заля індыйскага фільма: Пэрлы (2 сэрыі) 16-22 – 14.00, 18.00 Для дзяцей: Кіналектар "У сьвеце казак" 16 – 13.00 Ляплянлзкія казкі 17-18 – 10.30 К/л "Сьветлафор" 19 – 10.20, 10.30, 13.00 Маленькая чараўніца 20-22 – 11.00 Відэапаказ: Герой-каханак (камэдыя) 16-22 – 18.00 Дрэвы праклятых (фільм жахаў) 16-22 – 14.00, 16.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* - Чорны вэльм 16-20 – 15.00, 19.00, 21 - 15.00 (ільготны), 19.00, 22 – 14.00 (ільготны) 15.50 Сьмяротная блізкасьць 16-21 – 17.00, 21.00, 22 – 21.00

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* - Праз каналізацыю 17-20, 22 – 15.00, 21 – 15.00 (ільготны) Канец сэксуальнага дыктатара 17-22 – 16.50, 18.30 Відэапаказ 16-17, 19 – 16.00, 18.00, 20.00, 18, 20-22 – 16.00, 18.00 Для дзяцей: Мы з Вулканам 17 – 13.30 Мама 22 – 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* - Целаахоўнік на лініі агню 16, 18 – 17.10, 21.00, 22 – 16.30, 20.30 Пад адзеньнем нічога 16, 18 – 19.20, 22 – 18.40 Сьвяточная вечарына, прысьвечаная Дню беларускага кіно: Прэм'ера новай работы кінастудыі "Беларусьфільм": Бег ад сьмерці 17 – 18.30 Першы міжнародны фэстываль блюзу: Блюз жыве ў Менску 20-21 – 17.00 Для дзяцей: Дыскатэка "Лімпапо" 22 –12.00 Міс Новы год (мультфільм) 22 – 14.30

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* - Сабакі пекла (стэрэафільм) 9-13 – 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 14-15 – 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Глыбінная зорка 9-15 – 13.00; 17.00, 21.00 Карына, Карына! 9-15 – 15.00, 19.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* - Бэйб 16-22 – 16.30 (ільготны, цана білета – 3000 руб.) Нясуць мяне коні 16-22 – 18.00, 21.20 Да дня беларускага кіно: Высокая кроў (рэжысэр В.Тураў) 17 – 12.30 (дабрачынны) Для дзяцей: Кіналектар "Сьвет жывой прыроды"17 – 10.00 Кіналектар "Дастаеўскі на экране" 17 – 14.30 Кіналектар "Плянэта юных" 18 –14.30

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* - Правая і левая рука д'ябла (у галоўных ролях Бад Спэнсэр і Герэнс Хіл) 16-21 – 15.00, 17.00, 22 – 15.00 Кінаклюб "Гімэнэй" Балеро 16, 18-22 – 19.00 Да дня беларускага кіно: Памяці народнага артыста СССР В.Турава. Пункт адліку 17 –19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма 18-20, 22 – 21.00, 21 – 2.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для падлеткаў 22 – 16.00 да 18.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* - Скрозь час 16 18 – 13.00, 17.00 19 – 11.40, 17.00 20 –15.00 21-22 – 14.00 На халяву 16 – 15.00 17 18 – 15.00, 19.00 20 – 13.20, 17.00 21-22 – 15.40, 17.20 Чырвоная пустэча (2 сэрыі) 16 – 19.00 Для дзяцей: Гэты нягоднік Сідараў 16-18 – 10.00 Скарб рыцара Мілёты 16-18 – 11.30 Пугала з паддашнага вакна 19 – 15.00, 20 – 10.00 Сакрэтны ўказ імпэратара 20 – 11.30 21-22 – 12.10 Пастка для котак 19 – 10.00 21-22 – 10.30

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* - Праз каналізацыю 9 – 15.00 (ільготны), 20.30; 11-12 – 15.00, 20.30; 13-15 – 15.00 Жанчына ў полымі 9, 11-15 – 17.00, 18.40 Відэа-дыска-шоў для падлеткаў 11 – 18.00-21.30 Клюб знаёмстваў «Для тых, каму за 30» 12 – 20.00-24.00 Музычна-забаўляльная праграма 13-15 – 20.00-24.00 Музычна-забаўляльная відэапраграма 9 – 18.00 22.00 У кінатэатры працуе відэабар. У кінатэатры працуе кавярня «Малютка» 14 – 11.00-16.00 Для дзяцей: Мультзборнік 11-12 – 10.30; 14 – 12.00; 15 – 13.30 К/клюб «Казка» 12 – 12.00 К/клюб «Падлетак» 12-13 – 15.00 К/клюб «У дапамогу настаўніку»: Злачынства й пакараньне 11 – 14.00

РАКЕТА *(Рабочы зав., 3, тэл. 260-620)* - Эмілія 16-17 – 17.00, 20.30 21-22 – 16.20, 19.50 Тры мушкетэры 16-19 – 18.40, 21 22 – 18.00 Відэапаказ 16 18 –16.50, 19.00 21-22 – 15.30, 17.40 Для дзяцей: Лятальны карабель (мультфільмы) 21 22 – 15.00

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* - Недараваны 16-20 – 16.00, 19.30, 21-22 – 14.00, 17.30, 21.00 Бай, бай, бэбі 16-20 – 18.00, 21.30, 21-22 – 16.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* - Непераўзыдзеныя злодзеі 16-17, 19-21 – 14.30 Маладая лэдзі Чатэрлей-2 16-17, 19-22 – 16.30, 18.00, 19.30, 21.00, 18 –16.30, 19.30, 21.00 Да беларускага кіно: Канец бабінага лета 17 – 18.00 Для дзяцей: Марозка 18 – 14.30 Давід і Сэндзі 19 –13.00 Вялікія прыгоды Зора 22 – 14.30

СЬЦЯГ *(Вялікаморская, 3, тэл. 211-009)* - Прынц зь Нью-Ёрку 16-17, 20-22 – 16.20 Максымальнае паскарэньне 16-17, 20 – 18.00, 21-22 – 12.20, 18.00 Заручаныя страхам 16-17, 20 – 20.00, 21-22 – 14.00, 20.00 Для дзяцей: Дзе ты, батра 16 – 14.30 Вершнік без галавы 17 –14.30 Дванаццаць месяцаў 18, 20 – 10.30 Невыпраўляльная фантазёрка 21 – 11.00 Малы, але ўдалы 22 – 11.00

УДАРНІК *(Жукоўскага, 15б, тэл. 259-630)* - Уікэнд за мільён 16-22 – 15.30 Па-за законам 16-22 – 16.50 Каханьне і магія 16-22 – 18.30 Для дзяцей: Горад майстроў, Кэці 18 – 14.00 Зборнік мультфільмаў 21-22 – 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ *(пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297)* - Недатыкальныя 16-22 – 11.30, 15.15, 19.00, 21.00 Стан сэрца 16, 18-22 – 13.30, 17.15 17 – 17.15 Да дня беларускага кіно: Сын за бацьку 17 – 13.30

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* - Махнаты сарцаед 16-20 – 12.00, 17.40 21-22 – 11.00, 17.40 Эйр Амэрыка 16- 20 – 15.40 19.00 21-22 – 12.20, 19.00 Заручаныя страхам 16-20 – 21.00 21-22 – 14.20, 21.00 Для дзяцей: Некалькі дзён з жыцьця Абломава (2 сэрыі) 16 – 13.30 Каша зь сякеры 17 – 14.30 Бяз сонца 18 – 13.30 Злачынства і пакараньне (2 сэрыі) 19 – 13.30 Белы Бім Чорнае Вуха 20 –13.30 Інфармацыйна-забаўляльная кінапраграма для навучэнцаў 6-9 класаў 21-22 – 16.30-19.00 (кошт квітка – 5700 руб.)

16 і 18 сьнежня — канцэрты Данчыка Фота Ул.Шлапака

ТЭАТАР імя ЯНКІ КУПАЛЫ

16 і 19 сьнежня — "Ажаніцца — не журыцца",
18 сьнежня — "Лес".
Малая сцэна.
17 сьнежня — *Малы тэатар* "Скарыніч"

ДОМ ЛІТАРАТАРА

16 і 18 сьнежня — канцэрты Данчыка.

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛЯ ФІЛЯРМОНІІ

16 і 18 сьнежня — канцэрты Данчыка.
16 і 17 канцэрты — І Форум творчай моладзі "Музыка надзеі",
19 сьнежня нямецкі арганіст Зігфрыд Леман — заходнеэўрапейская арганавая музыка часоў барока і рамантызму, калядныя творы Баха.

ЗАЛЯ КАМЭРНАЙ МУЗЫКІ

17 сьнежня — канцэрт камэрнай музыкі І.Мана, Р.Шумана, А.Сымона, М.Глінкі.

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛЯ "МЕНСК"

19 сьнежня — Канстанцін Райкін з артыстамі тэатра "Сатырыкон" а 19-й гадзіне.

ТЭАТАР ОПЭРЫ І БАЛЕТУ

19 сьнежня — "Нуда",
17 сьнежня — вечар старадаўніх рамансаў.

РАСЕЙСКІ ТЭАТАР

17 сьнежня — "Хто твой каханак, Жазэфа",
19 сьнежня — "Неверагодныя прыгоды салдата Чонкіна".

"ВОЛЬНАЯ СЦЭНА"

17 сьнежня — тут пройдзе кабарэ-дэтэктыў "Чорны квадрат".

ТЭАТАР МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ

18 сьнежня — "Капялюш Напалеона",
19 сьнежня — "Жанчына-кажан".

ДОМ АФІЦЭРАЎ

16 сьнежня — маскоўскі тэатр "Современник" спэктакаль паводле п'есы Гібсана "Двое на арэлях" з удзелам Алены Якаўлевай. Пачатак а 19 гадзіне.

ВІДЭА

16 сьнежня

НОВЫЯ ВІДЭАФІЛЬМЫ:

"ТОЙ, ХТО БОЛЬШ ПЯШЧОТНЫ"

Казахстан, 1996, 97 хвіл; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: А. Растоцкі, А. Ліванаў. Рамантычны баявік-прыгоды. Сучасны закаханы джыгіт ад пачуцьця непадзельнага каханьня зрываецца з гаўбца каханай і аказваецца ў лякарні. У адной палаце зь ім знаходзіцца старажытны стары, да якога ў адзін цудоўны ранак прыходзіць замежная дэлегацыя...

2. "АПОШНІ ПРОВАД"

1996, 96 хвіл, The Final Cut; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: Сэм Эліёт, Аманда Пламэр. Баявік-трылер у стылі фільма "Зьмеценыя агнём". Былы камандзір сапэрнага атрада Джон Пірс вядзе адважную схватку і мудрагелістую гульню супраць загадкавага і таямнічага падрыўніка-прафэсіянала...

3. "ТРАЦІЦАВАЯ ШКОЛА"

1996, 82 хвіл, Demolition High; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: К. Хайм, Д. Кобэр, Э. Цік. Баявік-трылер. Звычайную школу захапіў краважадныя тэрарысты. Дарослых і абслугоўвальны пэрсанал заперлі ў актавай залі, а некалькі падлеткаў, выпадкова апынуліся ў непатрэбны час у непатрэбным месцы, імкнуцца па меры магчымасьці супрацьстаяць вераломным плянам злодзеяў...

4. "АСАБЛІВАСЬЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАЛЯВАНЬНЯ-2 АЛЬБО АПЭРАЦЫЯ "З НОВЫМ ГОДАМ!"

Расея, 1996, 110 хвіл; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: Леанід Ярмольнік, А. Булдакоў. Сьмешная навагодняя камэдыя. Практычна прамы працяг самай пасьпяховай камэдыі сэзона "Асаблівасьці нацыянальнага паляваньня". Усе ўдзельнікі папярэдняй сэрыі рознымі неверагоднымі шляхамі трапляюць на бальнічны ложак напярэдадні новага года, г.зн. увечары 31 сьнежня. Да іх дадаўся пасьпяховы бізнэсмэн (актор - Леанід Ярмольнік), які хаваецца ад рэкета і атрымаў траўму ад роднай міліцыі. У фільме зьявіліся яшчэ некалькі новых пэрсанажаў. Дзеяньне прасоўваецца па накатаным сцэнары: спачатку ўсе напіваюцца да згубы пульсу, а затым весяляцца разам. Пад раніцу кампанія нават праапэравала і паставіла на ногі аднаго безнадзейнага хворага, чым усяліла ў апошняга веру ў "нашую" мэдыцыну, а ў гледачоў – упэўненасьць, што, дзейнічаючы разам, магчыма горы зьвярнуць! З Новым годам, шаноўнае спадарства!

5. "ДОМ, ТАМ ДЗЕ ХАРТ"

1996, 83 хвіл, Home Is Where Hart Is; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: Леслі Нільсан, Эрык Крыстмас. Забаўная крымінальная камэдыя з удзелам неперажыдзенага коміка Леслі Нільсана (нагадайце кінасэрыял "Зь пісталетам нагала"!). Нейкая мэдсястра - дзяўчына на імя Бэл – вырашыла хутка разбагацець. Лепшы спосаб для дасягненьня жаданай мэты - выйсьці замуж за састарэлага мільянэра! Падыходзячы старыкашка-мільярдэр (!) з грашыма знойдзены, Бэл патрэбная толькі ў час (дзядулі Сліму Харту ўжо больш за 100 гадоў) падвесьці яго да аўтара...

ФІЛЬМ-БЛІЦ:
/на студыю TONvideo паступілі/

"Вастраў доктара Маро" (The Island Of Dr. Moreau) фантастыка. У ролях: Марлён Брандо, Вэл Кілмэр);

"Ваяр справядлівасьці" (Warrior Of Justice) фантастыка-баявік. У ролях Рычард Лінч, Ёрга Агняноўскі);

"Крадзеж" (The Heist) баявік-дэтэктыў. У ролях Пірс Бронсан, Том Скэрыт);

"Пампезнае каханьне" (The Pampatus Of Love) камэдыя. У ролях: Мія Сара, Дэвід Краер);

"Хлусьлівая мэта" (Liese Target) баявік. У ролях: Майкл Дудзікоф, Біл Уільямс);

"Сталёвыя целаахоўнікі" (Steel Bodyguards) баявік. У ролях: Бола Янг, Джет Лі).

***Фільмы прадстаўленыя студыяй "TON video"*

Сьвітанак сустракала ля тэлевізара Тоня ВІДЗЯНКОВА

ПРЫСАДА ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ:

ЛІШНЯЯ ВАГА СУПЭРЗОРАК

Джон Травольта.

– Як толькі ні называлі Джона Травольту. Вось і Нора Эфрон, якая здымала яго ў "фантазіі" "Michael", сказала, што ён "поўнасьцю памяшаўся на ежы". А як сам Джон адносіцца да гэтай адзнакі? "Са словаў Норы, я ем 11 разоў у дзень. Але мне б не хацелася, каб яна казала пра гэта часопісу "Premiere",- кажа Травольта, набраўшы прывабную вагу, здымаючыся ў карціне. Роўна столькі ён важыў, калі граў у "Бульварным чытве". Тым ня менш актор стойка абараняе сваю дыэту. "Я аддаю належнае лёгкім закускам, якія нельга назвать сапраўднай ежай. Калі я прыходжу на здымачную пляцоўку, то выпіваю апэльсінавы сок і, магчыма, зьядаю якісьці сьняданак. І гэта ўсё, што я дазваляю сабе на раніцу. Ужо пасьля 10 гадзіны я пачынаю адчуваць невялікі голад, таму пры выпадку заказваю сэндвіч. Пасьля 4 гадзіны падыходзіць час ланчу, але я ем доволі сьціплы ланч. Прыкладна каля 4-ай гадзіны дня я люблю, каб усе крыху пачаставаліся і задаволілі сябе. Многія выказваюцца за торт. Аднак я стрымліваюся ад спажываньня цукру".

Сыльвэстар Сталонэ.

–"Як толькі Джон (Травольта) набраў вагу, узьляцеў на верхавіну папулярнасьці і перастаў рызыкаваць, ён стаў першаклясным акторам,– кажа Слай.– Хоць ён і да гэтага быў выдатным акторам, але тут раптам ён стаў яшчэ большым". Відавочна, што добра для аднаго жанатага чалавека, таксама нядрэнна і для другога.

Здымаючыся ў гэты момант у "Паліцэйскай тэрыторыі" (Copland), Сталонэ набраў лішніх 30 фунтаў і яго вытрымка дала трэшчыну. "Жахлівая рэч, якую я знайшоў, гэта тое, што я згубіў здольнасьць поўнасьцю уваходзіць у вобраз героя",– кажа актор. Першы тыдзень здымак Сталонэ біў лынды, не працаваў, апраўдваючыся тым, што зноў набыў вагу. "Гэта ўсё былі адгаворкі. Нарэшце я быў упэўнены, што ўсё жыцьцё гэтым толькі і займаўся. Але, калі я зьбіраюся граць гэтага хлопца, мне неабходна замаўчаць і перастаць апраўдвацца і скардзіцца на тое, як я выглядаю, быць верным свайму пэрсанажу. Адзін час мне ўжо здавалася, што ў мяня няма такога адчуваньня, як славалюбства, але потым я ўсьведаміў, што ў той час, калі я займаўся сур'ёзна "бодыбілдынгам", тады гэтае славалюбства і зьявілася ў мяне". Сталонэ заяўляе, што спрабуе не набіраць вагу хоць бы пад час пяці бліжэйшых месяцаў.

Перажывала за куміраў Тоня ВІДЗЯНКОВА

САМАЕ СЬВЕЖАЕ ЗЬ ВІДЭАХІТОЎ
TON video
т. 233-92-30

ЧАРОЎНЫ ЗАГАР

/Саляры Кетлера/

Улетку ў невыносную сьпёку мы ўсе імкнемся на пляж, да вады, каб адпачыць і набыць чароўны, прывабны загар. Бо кожны з нас хоць аднойчы выпрабаваў на сабе магічную і прыемную для навакольных сілу "стомленага" сонцам загарэлага цела. Прыемна пасьля водпуску прыступіць да працы і ўвесь час чуць ад калег і знаёмых выкрыкі зачараваньня, выкліканыя Вашым шыкоўным загарам, бо і Вы самі адчуваеце сябе ўпэўнена, так як цяпер маецца велізарны зарад энэргіі і рашучасьць разабрацца з усімі існуючымі праблемамі. Неаднаразова ў хвіліны спакою Вам будзе зноў і зноў бачыцца пяшчотнае сонца, пяшчотная водная гладзь і жоўты пляжны пясок. Ня выключана, што Вы зноў захочыце наступным летам акунуцца ў такі прыемны стан бестурботнасьці і прыгажосьці. Але затым чакаць так доўга?! Лепшыя навукоўцы сьвету і спэцыялісты аб'ядналі свае ўмовы і стварылі саляр. Безумоўна, нават мільёнам саляр не заменіць сонца, проста эпоха прагрэсу дае нам магчымасьць адчуць цяпло і эфэктыўнасьць маленькага штучнага сонейка ў любы зручны для нас час. Сонца напаўняе нас энэргіяй, робіць задаволенымі жыцьцём і актыўнымі, ад яго мы атрымліваем жаданы прывабліві загар. Адыходзячыя ад сонца альбо з саляра ультрафіялетавыя промні паляпшаюць наша самаадчуваньне, якое залежыць ад біяхімічных працэсаў, бо сонца ўплывае на важныя гарманальныя працэсы, паляпшае абмен рэчываў, павялічвае супраціў арганізму, дапамагае пераадолець стрэс. У правільным дазаваньні сонечны сьвет можа

зьнізіць крывяны ціск, садзейнічаць утварэньню эрытрацытаў, можа рэгуляваць узровень цукру і халестэрыну ў крыві. Супакойваюцца болі ў суставах, зьнікае адышка. Дзякуючы салярам ад Кетлера Вы становіцеся незалежнымі ад надвор'я: цудоўны настрой, цудоўны загар, калі Вы гэтага пажадаеце. Больш таго, вядома, што штучнае сонца лье на Ваша безабароннае цела вялізны спэктар розных промняў. Але толькі два віды промняў пакрываюць загарам скуру — гэта мяккія ультрафіялетавыя а-промні, якія не выклікаюць раздражненьня скуры, і агрэсіўныя б-промні, якія садзейнічаюць яе пачырваненьню. У салярах ад Кетлера ўстаноўленыя магутныя інсталяцыйныя люмінісцэнтныя лямпы, якія маюць на шмат разоў больш моцнае ультрафіялетавае карыснае а-выпраменьваньне, чым штучнае соцна, а шкоднае б-выпраменьваньне прафільтраванае і паніжанае да мінімума. Бліскучыя алюміневыя рэфлектары, разьмешчаныя пад вуглом, садзейнічаюць раўнамернаму прыгожаму загару бакавых частак цела. Акрамя таго, усім вядома, што твар і цела загараюць не аднолькава хутка, бо скура твару звыклая да больш інтэнсіўнага штодзённага апраменьваньня. Каб дасягнуць раўнамернага загару ўсяго цела, неабходна больш інтэнсіўнае апраменьваньне ў вобласьці твару. Таму высокаякасныя саляры Кетлера забясьпечаныя інтэгруючымі прыборамі для загару твара, якія дазваляюць дасягнуць неабходнага раўнамернага эфэкту. Саляры ахалоджваюцца магутнымі вэнтылятарамі, так што пад час прыняцьця сонечнай ванны валадарыць прыемны клімат. Вы толькі закрыйце вочы і дазвольце Вашаму багатаму ўяўленьню прадставіць бязвоблачнае неба, залаты пясок і шум прыбою. Да таго ж Вы маеце магчымасьць зрабіць сюрпрыз родным і знаёмым, а таксама выклікаць фурор, зьявіўшыся на вечарынцы альбо навагоднім балі з загарам малочна-шакаляднага адценьня. Будзьце ўпэўныя, уся ўвага прысутных сканцэнтруецца на Вашай асобе, захапляльныя погляды толькі пацьвярджаюць, што Вы па-каралеўску чароўная і прывабная. Падаруйце сабе ўвагу і зачараваньне навакольных! Скарыстайцеся новымі прафэсійнымі паслугамі спэцыялістаў АП "Усход" — салярамі Кетлер у спэцыялізаваных кабінэтах цырульняў N 54 /вул. Даўгабродзкая, 9а/, N 13 /вул. Сурганава, 8/. Дастаўце сабе задавальненьне!

ЗДАРОЎЕ І ПРЫГАЖОСЬЦЬ ВАШАЙ ФІГУРЫ

/Міястымулятары/

Ці чулі Вы пра новыя сродкі, якія дазваляюць трымаць сябе ў тонусе? Калі не, то вельмі шкада, бо гэтыя прыборы, распрацаваныя ў Францыі, ужо зьявіліся ў салёнах-цырульнях ЛП "Усход" у Менску. Французкія жанчыны амаль заўсёды ва ўсе часы былі эталёнам прыгажосьці, жаноцкасьці і сэксуальнасьці. Французкія мужчыны, напэўна, вырашылі дапамагчы ўсім жанчынам сьвету выглядаць ня горш за суайчыньніц і распрацавалі шэраг прыбораў (міястымулятараў), якія аблягчаюць цудоўнай палове чалавецтва нагляд за сваёй фігурай і прыгажосьцю. Міястымулятары вытворчасьці вядомай французскай фірмы Gezanne зьяўляюцца адной з апошніх распрацовак сусьветна вядомай сэрыі "Электронныя прыборы для здароўя і прыгажосьці" і прызначаныя для карэкцыі фігуры, інтэнсіўнага зьніжэньня вагі, павелічэньня эластычнасьці і пругкасьці скуры. Асноўная мэта стварэньня гэтых прыбораў — аказаньне дапамогі людзям, якія жадаюць выдатна выглядаць, але ў якіх проста няма часу наведваць трэнінгзалі, курсы масажу, заняткаў аэробікай альбо шэйпінгам. Прынцыпы работы новых прыбораў даволі простыя —"пасіўныя" практыкаваньні мышцаў пад дзеяньнем электрычных імпульсаў спэцыяльнай формы, якая вызначае рэжым аптымальнай нагрузкі для скарачэньня і расслабленьня Вашых мышцаў. Зьмены, якія адбываюцца пры гэтым у мышцах, поўнасьцю аналягічныя працэсам, якія адбываюцца ў мышачных тканках пры інтэнсіўных занятках спортам. Праца Вашых мускулаў пад дзеяньнем міястымулятараў садзейнічае паляпшэньню забесьпячэньня крывёю, зьнішчэньню тлушчавых адкладаньняў, у тым ліку цэлюліта ("апэльсінавай коркі"), і павелічэньня агульнага тонуса арганізму. Адным з выдатных магчымасьцяў гэтых прыбораў зьяўляецца тое, што акрамя чыста касмэтычнага эфэкту (падцягваньне мышцаў, зьніжэньне лішняй вагі, амалоджваньне скуры), яны аказваюць і ярка выражаны лекавы эфэкт пры нэўралёгіях, бяссоньні, рэўматызме. Усё гэта дае нямала дадатковых вынікаў: умацаваньне сардэчна-сасудзістай сыстэмы, інтэнсіўны вывад шлакаў, павышэньне пругкасьці і эластычнасьці скуры, і — выдатнае самаадчуваньне плюс добры настрой. Шматлікія экспэрымэнтальныя дадзеныя і практыка мэдыкаў падцьвердзілі заключэньне аб высокай эфэктыўнасьці міястымулятараў французскай фірмы Gezanne. Ужо сёньня Вы маеце магчымасьць зьвярнуцца ў касмэтычны кабінэт цырульні N 155 /пр. Машэрава, 41/ АП "Усход" і, параіўшыся з дасьведчанымі і кваліфікаванымі спэцыялістамі, адчуўшы на сваім целе дзеяньне гэтых унікальных французскіх міястымулятараў. На практыцы Вы зможаце ўпэўніцца ў магчымасьці захаваць сваю маладосьць і прыгажосьць на доўгі час. Адчуйце сябе Дасканаласьцю!

ЦУДОЎНАЯ ТЭРАПІЯ

/Біястымулятары/

Валасы — лепшае ўпрыгожаньне ўсялякага чалавека. Доўгія, кароткія, прамыя, закручаныя, сьветлыя альбо цёмныя - жаночыя валасы прыгожыя толькі тады, калі яны здаровыя. Трымаючыся моды, жанчыны фарбуюць свае валасы, начэсваюць, робяць хімічную завіўку, мыюць кожны дзень галаву, ня думаючы пра наступствы, але аднойчы даведаюцца, што валасы сталі ломкімі, тонкімі, згубілі папярэдні бляск. А мужчыны! Любяць нагадваць прымаўкі тыпу: "Волас доўгі, ды розум кароткі", але вельмі ўважліва сочаць за сваімі валасамі блізкія да адчаю, заўважаючы першыя прызнакі парадзеньня шавялюры. Кідаючыся тайком купляць розныя ласьёны, вычварным вобразам укладаюць валасы, каб замаскаваць "здрадлівыя" залысіны, а тыя, у каго застаецца зусім мала валасоў, адпускаюць бараду і вусы.

Адмараньне і выпадзеньне валасоў адбываецца ўвесь час, але пры некаторых захворваньнях, няправільным даглядзе і ў выніку іншых прычынаў выпадзеньне валасоў можа стаць значным. Сучасная навука і тэхналёгія дасягнулі адпаведнага прагрэсу і ў папярэджаньні выпадзеньня валасоў. Распрацавана некалькі мэтадаў лячэньня з прымяненьнем спэцыяльных прыбораў. Самы даступны і эфэктыўны прыбор зь іх Stimu Vit. Дзеяньне прыбора Stimu Vit заснаванае на лёгкім масажы цемені, стымулюючы рост валасоў. Рэзультаты ад прымяненьня гэтага прыбора пераўзышлі ўсе чаканьні: паляпшаецца мікрацыркуляцыя ў цеменевай вобласьці, узмацняецца прыток кісларoду і спажыўных рэчываў тканкам, што, у сваю чаргу, садзейнічае росту валасоў!

Каб палепшыць агульны стан чалавечага арганізма і ўмацаваць яго імунную сыстэму спэцыялісты-касмэтолягі апошнім часам прымяняюць палярызаваны сьвет Цэптар-Біёніка. Лінейна-палярызаваны сьвет узьнікае пры пераламленьні натуральнага сьветлавага промня, які праходзіць скрозь прызмы і крышталі з асаблівым чынам арацаванымі паверхнямі. Адлюстраваны ад паверхні сьветлавы прамень мае ўласцівасьць палярызацыі. Распаўсюджваючыся ў адной плоскасьці, гэты прамень узьдзейнічае на клеткі, адсюль тыя праходзяць у рух, а гэта ні што іншае, як біястымуляцыя арганізма. Палярызаваны сьвет выпрабляе рэарганізацыю клетак скуры (амалоджвае), павялічвае патэнцыял электрычнага поля клетак, робіць іх трывалымі і садзейнічае насычэньню кіслародам. Цэптар-Біянік заслугоўвае Вашай увагі як прыбор, з дапамогай якога можна дамагчыся пазбаўленьня маршчынаў, пігмэнтных плямаў, рубцоў, бародавак і іншых сьлядоў, якія застаюцца на скуры пасьля пашкоджаньня, а тасама прызнакаў яе старэньня. Палярызаваны сьвет Біянік-лямпы пранікае на 2 і больш сантымэтраў у глыб тканак, актывізуючы функцыі клеткі і абменныя працэсы. Скура ачышчаецца і выглядае здаровай і сьвежай (павялічваецца магчымасьць урымліваць вільгаць). Практыка прымяненьня Цэптар-Біяніка паказала, што прыбор эфэктыўна дапамагае і лечыць:

а) Скурныя захворваньні: запаленьне, кросту, лішай, дэрматыты, псорыяз, алергію, інфэкцыі, апёкі рознага паходжаньня і абсцэсы;

б) Саматычныя болі: артрозы, рэўматызм, артрыты, мігрэні, трафічную язву ног, спартовыя і іншыя траўмы і пераломы, галаўныя болі, абумоўленыя эмацыйным напружаньнем і запаленьнем верхніх дыхальных шляхоў;

в) Прафіляктыка і зажыўленьне: адкрытыя раны, апёкі рознага паходжаньня, ацёкі, вострыя расьпіратарныя захворваньні, прастуда,

алергічны катар і многія іншыя захворваньні;

г) Прымяняецца ў касмэтычных мэтах: для зьнішчэньня маршчынаў, пігмэнтных плямаў, шрамаў, рубцоў, іншых сьлядоў пашкоджаньня скуры, а таксама прызнакаў яе старэньня. Калі людзей пытаюцца, што для іх важней за ўсё ў жыцьці, як правіла, можна пачуць: маё здароўе і самаадчуваньне; але пра сябе кожны думае: і прыгажосьць. Калі ж спытаць, што яны робяць для свайго здароўя, то адныя толькі усьміхаюцца і паціснуць плячыма, а іншыя адкажуць, што чытаюць артыкулы пра тое, як захаваць здароўе, набываюць розныя крэмы і зайздросьцяць тым, хто турбуецца пра сябе па-сапраўднаму.

Кожнаму з нас необходна памятаць, што мы самі ў адказе за сваё здароўе. Мэдык можа дапамагчы нам справіцца з хваробай, але ён не нясе адказнасьці за нашае здароўе і прыгажосьць. Таму Вы самі павінны турбавацца пра сябе. Многія мары могуць зьдзяйсьняцца ў Вашым жыцьці, калі ў парадку ўсе зьвеньні ланцуга посьпеху: праца — заробак — імкненьне — здароўе.

Запрашаем Вас наведаць касмэтычны кабінэт цырульні N 155 /пр. Машэрава, 41/ АП "Усход". Да Вашых паслугаў лепшыя біястымулятары і масажэры. З Вамі працуюць спэцыялісты толькі высокай клясы. Коштыдаступныя. Патурбуйцеся пра сябе!

№ 37 (75)

БЕЛАРУСКІ НЕПАДЦЭНЗУРНЫ ДРУК

Каталёг пэрыядычных ды працяглых выданьняў 1971-90 гадоў

Дадатак

1. БЮЛЕТЭНЬ КАМІТЭТА "ГАЛАСУЮ ЗА БЕЛАРУСЬ": Маладачанская рада БНФ "Адраджэньне". — [1990]. — 8'. — 4 с. — (машынапіс + ксэра).

Вядома пра два нумары выданьня, што выйшлі ў 1990 г. Рэдакцыйны склад не пазначаны. Наклад невядомы. Эмблематыка: "Пагоня" на шчыце. Дэвіз: "Жыве Беларусь!" на апошняй старонцы выданьня. Фармат — 1/8 аркуша.

Надрукаваныя сьпісы дэмакратычных дэпутатаў і рэкамэндацыі да правядзеньня выбараў.

Дадатковая інфармацыя — Алесь Капуцкі.

2. ВЕСТКІ: ваўкавыскіх сяброў БНФ "Адраджэньне". — 1990. —№1. — 8'. — 8 с., іл. — Друк: "Belsamizdat" — накл.: 800 асобнікаў.

Газэта ваўкавыскіх сяброў Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" "Весткі" пачала выходзіць у лістападзе 1990 г., праўдападобна, выйшаў усяго адзін нумар. Выданьне дзьвюхмоўнае. Рэдакцыйны склад невядомы. Пазначаны наклад наўмысна зьменшаны. Эмблематыка і дэвіз адсутнічаюць. Мастацкае аздабленьне: напісаныя мастацкім шрыфтам тытул, загалоўкі артыкулаў, рамкі і ілюстрацыі. Фармат — 1/8 аркуша.

Друкавліся матэрыялы палітычнага, нацыянальнага ды гістарычнага кірунку.

3. КОНТАКТ: Информационный бюллетень Минского еврейского культурного общества. — Минск. — 1989. — 60 с. — (фота).

1989: 1, 2, 3, 4.

У фондах Архіву адсутнічае.

4. ЛІТАРАТУРА. — [Менск]. — [1989-1990]. — 16'. — 46-64 с. — (машынапіс + ксэра).

1989: вып. 1; 1990: вып. 2.

Выйшла ўсяго два выпускі выданьня. Рэдакцыйны склад не пазначаны, наклад невядомы, выходныя зьвесткі адсутнічаюць. Мастацкае аздабленьне: назва выданьня на вокладцы і загалоўкі некаторых матэрыялаў напісаныя мастацкім шрыфтам.

Фармат — 1/16 аркуша.

Друкуюцца літаратурныя творы.

5. МАДРИГИН = СТУПЕНИ / Союз Еврейской Молодёжи и Студентов. — Минск. — 1990 (5750). — 8'. — 4 с., іл. — (камп. + ксэра).

Першы нумар выданьня выйшаў у красавіку 1990 г. на расейскай мове. Рэдакцыйны склад не пазначаны, зьвесткі пра наклад адсутнічаюць. Мастацкае аздабленьне: напісаньне тытулу і загалоўкаў мастацкім шрыфтам, рамкі і ілюстрацыі. Выданьне мае эмблематыку. Фармат — 1/8 аркуша.

Друкуюцца матэрыялы на габрайскую тэматыку, інфармацыя.

6. ПАРСУНА / М.Скобла, С.Адамовіч, А.Калюта (мастак), А.Гуцаў, А.Дзялендзік. — [1988]. — 4'. — 50 с., іл. — накл.: 7 экз. — (машынапіс).

Адзіны нумар часопіса "Парсуна" выйшаў, праўдападобна, у 1988 г. Выданьне было машынапіснае, аб'ём — 50 старонак, надрукавана на паперы фарматам А4. Мастацкае аздабленьне: лякаваная вокладка шэрага колеру з чырвонай паласой, ілюстрацыі. Фармат — 1/4 аркуша.

Друкаваліся творы літаратурна-мастацкага, публіцыстычнага накірунку, таксама існавала сатырычная старонка.

У фондах Архіву адсутнічае. Дадатковая інфармацыя — М.Скобла.

7. РАНІЦА: выданьне маладачанскага аддзяленьня БНФ "Адраджэньне". — [Маладзечна]. — [1989]. — 8'. — 2-4 с. — (машынапіс).

Газэта "Раніца" пачала выходзіць з 1989 г. Рэдакцыйны склад не пазначаны. Мова — беларуская, арыгінальныя матэрыялы і перадрукоўкі зь іншых выданьняў друкаваліся на расейскай мове. Першыя нумары выданьня былі аддрукаваныя на машынцы на аркушах паперы фарматам А4 праз адзін інтэрвал. Тытулы №1 і №2 напісаныя чырвонай фарбай пры дапамозе трафарэта. Эмблематыка — "Пагоня". Аб'ём выданьня — 2-4 старонкі. Фармат — 1/8 аркуша. Наклад ня высьветлены.

Друкаваліся матэрыялы, якія адлюстроўваюць рэгіянальныя падзеі, а таксама гістарычнай і палітычнай тэматыкі.

Дадатковая інфармацыя — Алесь Капуцкі.

8. РАНІЦА: інфармацыйны бюлетэнь суполкі "Грамада" — групы падтрымкі БНФ "Адраджэньне" Менскага раёну Беларусі / Ю.Пятроўскі. — Сеньніца. — 1989. — 8'. — 2 -4 с. — накл.: 25 асобнікаў. — (машынапіс).

У архіве маюцца N24-25 , якія выйшлі ў красавіку 1989 г. Праўдападобна, што "Раніца" зьявілася працягам газэты "Грамада". Выданьне машынапіснае, аддрукаванае з аднаго боку сінім колерам на паперы фарматам А4 праз 1/2 інтэрвала. Бюлетэнь мае дэвіз: "Загляне сонца і ў нашае ваконца". Мова выданьня — беларуская, правапіс — дарэформавы. Шрыфт машынкі — расейскі, таму адсутнічае "ў". Пазначаны наклад — 25 асобнікаў.

Друкаваліся матэрыялы палітычнага і нацыянальнага зьместу.

9.РОКАШ: Газэта Прыазерскай гарадзкой рады ТБМ імя Францішка Скарыны (Джэзказганскай вобл. Казахстана) / С.Суднік, І.Супоненка, А.Аўчыньнікаў, В.Грамадка, С.Пахучы, А.Мазураў, С.Цьвірка. — 1990-92. — 4'. — 4 с., іл. — накл.: 150 асоб. — (камп.).

"Рокаш" выдаваўся беларускімі вайскоўцамі ў Казахстане са жніўня 1990 г. Да кастрычніка 1992 выйшла ўсяго 15 нумароў і адзін сьвяточны выпуск, прысьвечаны 73-м угодкам БНР. Склад рэдакцыі зьмяняўся. Мова выданьня — беларуская, правапіс — парэформавы. Мастацкае аздабленьне: назва выданьня выкананае вялікімі літарамі чырвоным (у асобных нумарах — чорным) колерам, ілюстрацыі. Эмблематыка — "Пагоня", а над ёй радкі зь верша М.Багдановіча. Дэвіз: "Жыве Беларусь!" Фармат — 1/4 аркуша.

Друкаваліся матэрыялы нацыянальнага і палітычнага зьместу.

* * *

Пасьля публікацыі ў "Шуфлядзе" папярэдніх частак Каталёгу пэрыядычных ды працяглых выданьняў Беларусі Архіў Найноўшае Гісторыі пачаў атрымліваць лісты ад нашых чытачоў з удакладненьнямі, прапановамі, а таксама з самімі выданьнямі. Усім нашым карэспандэнтам выказваем падзяку.

Алег Дзярновіч

Пацьвярджэньне набыткаў:

Сьпіс асобаў, якія перадалі ў фонды Архіву Найноўшае Гісторыі новыя матэрыялы:

Сяргей Ёрш *(Слонім)* — Белорусская трибуна.

Алесь Капуцкі *(Маладзечна)* — Бюлетэнь камітэта "Галасую за Беларусь"; Раніца *(Маладзечна).*

Севярын Квяткоўскі *(Менск)* — Рокаш; Раніца *(Сеньніца).*

Невядомы *(Ваўкавыск)* — Весткі.

Архіў Найноўшае Гісторыі выказвае падзяку ўсім ахвярадаўцам.

бібліятэка

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:



1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 40.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 10.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 30.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 10.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 35 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с.20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** —Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.
22. **Жана Зрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі.** — Менск: Эўрафорум-БФС, 1996.– 400 с. 35 000 БРБ.
23. **Унія: часопіс хрысьціянскага сумоўя. №4 — 1995.** — 48 с. 15.000 БРБ
24. **Жан-Батыст Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён (палітычнае жыцьцё і міжнародныя адносіны).** — Менск: БФС —«Крыніца», 1996. — 384 с. 25 000 БРБ.
25. **П'ер Брунэль, Клёд Пішуа, Андрэ-Мішэль Русо. Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.** — Менск: БФС — "Эўрафорум", 1996. — 30 000 БРБ.
26. **Клаэс Г. Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.** — Менск: БФС — БГАКЦ, 1996. — 30 000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Арсеньнева Н. Яшчэ адна вясна: Выбр. вершы / Укл. і прадм. А.Сямёнавай; фота А.Клешчука. — Менск: Маст. літ., 1996. — 271 с. — (Галасы беларускага замежжа) 1000 ас. ISBN 985-02-0086-3.

Бабосов Е. Чернобыльская трагедия в её социальных измерениях. — Менск: Право и экономика, 1996. — 151 с. 500 ас. ISBN 985-6194-45-8.

Дэбіш В. Лісты ад Марыі: Вершы / Прадм. Н.Мацяш. — Менск: Маст.літ., 1996. — 118 с. — (Першая кніга паэта). 750 ас. ISBN 985-02-0273-4.

Панютин В. Наёмный труд в сельском хозяйстве Беларуси. 1863-1914 г. / Под. ред. П.Петрикова — Менск: Навука і тэхніка, 1996. — 142 с. ISBN 5-343-01352-X.

Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-уклад. Г.Гарадко, У.Лебедзеў, В.Ляшук. — Менск: "Асар", 1996. — 624 с.: іл. 187 150 ас. ISBN 985-6070-23-6.

Тегако Л., Белоокая Т. Хиромантия без тайн. — Менск: ПКП "БОФФ", 1996. — 88 с. 800 ас. ISBN 985-430-002-1.

Философия: Учебное пособие / Под редакцией Н.Жукова — 3-е изд., испр. и доп. — Менск: ООО "НТЦ АПИ", 1996. — 328 с. 5 000 ас. ISBN 985-6344-05-0.

Цётка. Вершы / Уклад. В.Хлебавец; Прадм. А.Лойкі. — Менск: Маст. літ., 1996. — 214 с.:іл. 1500 ас. ISBN 5-340-00589-5.

Чарказян Г. Караваны гор: Лірыка. Пер з курд. — Менск: Маст. літ., 1996. — 446 с. 1000 ас. ISBN 985-02-0203-3.

НАВІНКІ

У сэрыі "Адкрытае грамадзтва" выйшла новая кніга:

Клаэс Г. Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё: Філязофія палітыкі і супольнасьці. – Менск: БФС – БГАКЦ, 1996.

Клаэс Рын праводзіць разьмежаваньне паміж дзьвюма формамі дэмакратыі. Аўтар выступае ў падтрымку канстытуцыйнай дэмакратыі, якая, на ягоную думку, лепшым чынам адпавядае патрабаваньням этычнага жыцьця. Паралельна гучыць абгрунтаваная крытыка плебісцытнай формы дэмакратыі, якая, надаючы паўнату ўлады большасьці, падрывае маральную прыроду чалавека.

КАСЭТЫ — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 30.000 БРБ):



1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (т.т. 1-4)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (т.т. 1-5).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).
26. **Андрэй Мельнікаў. Гэта - Мы!** (1996).
27. **NRM.** Одзірыдзідзіна (1996).
28. **ANDREJ MIELNIKAŬ.** Kamiani majho vohnišča (1991-1994).
29. **ANDREJ MIELNIKAŬ.** Pieśni vyhnańnia (1991-1993).
30. **ANDREJ MIELNIKAŬ.** Uspamin (1994-1995).
31. **ANDREJ MIELNIKAŬ.** Salam Saŭkam (1993).
32. **VALZYNA CIAREŠČANKA** (1991-1995).
33. **ЛІЦЬВІНЫ.** 5 сакавіка (1996).
34. **БЕЛАРУСКАЯ СЫМФАНІЧНАЯ МУЗЫКА** (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў "Нашай Нівы"

У рэдакцыі "Нашай Нівы" Вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні:

№1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць ксэракопію любога іншага нумару.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

ЛІТОЎСКІ СТАТУТ

У Менск завезеныя т.2 і т.3 віленскага акадэмічнага выданьня **Першага Літоўскага Статуту** 1529 г. Том другі ўяўляе сабой факсімільнае перавыданьне Статуту; том трэці — старабеларускі, старапольскі і лацінскі тэксты Статуту сучаснай графікай.

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

У Менск завезеныя т.6 і т.8 **Літоўскае Метрыкі** — збору дакумэнтаў Вялікага Княства Літоўскага — выданьня цікавага як для спэцыяліstаў, так і для аматараў гісторыі.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі - тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

Ці таленавітае ваша дзіця?

Канешне, усе бацькі лічаць, што іхняе дзіця самае лепшае, разумнае, таленавітае. І гэта правільна. Неталенавітых, ні да чаго ня здольных дзяцей проста няма, ня можа быць. Але вось зразумець, у якой менавіта галіне дзіця можа найбольш поўна раскрыць свае здольнасьці, не заўсёды атрымліваецца ў час, і магчымыя памылкі, расчараваньні.

Прапануем Вам тэст, складзены псыхолягамі для дзяцей 7-13 гадоў, ён дапаможа праверыць Вашыя ўласныя назіраньні і вызначыць, у чым менавіта таленавіты Ваш дзіця ад нараджэньня, да чаго яго цягне.

Не адчувайце сябе расчараваным, калі вынікі тэсту не адпавядаюць Вашым чаканьням: дзіця мяняецца, у яго ўсё наперадзе. І тым больш ня варта лічыць малога нечым асаблівым, калі вынікі будуць цудоўнымі.

Памятайце, наш тэст — не сур'ёзнае навуковае дасьледаваньне, а паўгульня, паўжарт. І ўсё-такі варта сябе праверыць!

Такім чынам, адкажыце "так" ці "не" на наступныя пытаньні.

Кожнае "так" дае адзін бал.

1. Ці здараецца дзіцяці знаходзіць незвычайнае прымяненьне нейкаму прадмету?

2. Ён мяняе свае схільнасьці?

3. Ці любіць маляваць абстрактныя карцінкі?

4. Ці любіць маляваць уяўныя прадметы?

5. Ці любіць фантастычныя гісторыі?

6. Ці складае аповесьці ці вершы?

7. Ці любіць выразаць цікавыя фігуры з паперы?

8. Ці зрабіў калі-небудзь тое, чаго ня ведаў, ці тое, чаго не існуе?

9. Ці бывае ў яго жаданьне што-небудзь перарабіць на свой густ?

10. Ці баіцца цемры?

11. Ці вынайшаў калі-небудзь новае слова?

12. Ці лічыў гэтае слова зразумелым без тлумачэньняў?

13. Ці спрабаваў перастаўляць мэблю на свой густ?

14. Ці была ўдалай гэтая задумка?

15. Ці выкарыстоўваў калі-небудзь рэч не паводле прызначэньня?

16. Ці магло Вашае дзіця зусім малым адгадваць значэньні розных словаў?

17. У выбары вопраткі ён кіруецца ўласным густам?

18. Ці ёсьць у яго ўнутраны сьвет, недаступны навакольным?

19. Ці шукае тлумачэньня таму, чаго не разумее?

20. Ці часта просіць патлумачыць незразумелыя зьявы?

21. Ці любіць чытаць кніжкі без ілюстрацыяў?

22. Ці вынаходзіць уласныя гульні і забавы?

23. Ці памятае і распавядае свае сны ці перажыванні?

Падсумуйце балы.

Ад 20 да 23 балаў. Вашае дзіця вельмі кемлівае, здольнае мець уласнае гледзішча на навакольнае, і варта дапамагаць яму ў гэтым.

Ад 15 да 19 балаў. Вашае дзіця не заўсёды выяўляе свае здольнасьці, ён знаходлівы і кемлівы толькі калі чым-небудзь зацікавіцца.

Ад 9 да 14 балаў. У дзіцяці назіраецца вялікая кемлівасьць, дастатковая для многіх галінаў ведаў, дзе неабавязковы ўласны погляд на рэчы. Аднак для заняткаў творчай дзейнасьцю шмат чаго не хапае.

Ад 4 да 8 балаў. Вашае дзіця праяўляе творчае мысленьне толькі пры дасягненьні істотнай для яго мэты, ён больш схільны да практычнай дзейнасьці.

Менш за 4 балы. Дзіцяці не хапае вынаходніцтва, але яно можа дасягнуць посьпеху як добры выканаўца нават у складаных прафэсіях.

КУПОН Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча

Адрэса, тэлефон

Тэкст:

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с. 71

НАША НІВА

НАДРУКУЕМ, ПАМНОЖЫМ

блянкі, візытоўкі, рэклямовыя ды інфармацыйныя ўлёткі.

Хутка — 1.000 асобнікаў за 10 хвілінаў. Тонна — ад 190 рублёў за копію. На паперы якое зоўгодна шчыльнасьці і на картоне.

Тэл. 39-78-49



У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 35):

Кошты на менскіх рынках: Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Спажывец: Тэст: Натуральныя віны (ІНФ. №31); Тэст: Стэрэамагнітолы і музычныя міні-цэнтры (ІНФ. №32); Тэст: Каляровыя фатастужкі (ІНФ. №34); Тэст: Зімовыя аўтапакрыўкі; Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №35) Тэст: посуд Zepter, Winston, IMCO (ІНФ. №36).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Апэрацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24) Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах; Як разглядаецца скарга на сваю дзяржаву (ІНФ.№32); Сучасная вытворчасьць трунаў у Італіі; 15 карысных парадаў для спальні (ІНФ.№34); Міжгароднія тэлефонныя коды (ІНФ. №36)

Шуфляда: Кроніка дэмакратычнай апазыцыі і палітычных рэпрэсіяў у Беларусі (ІНФ.№32); Беларускі непадцэнзурны друк (ІНФ.№33-36).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24-26, 33).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-36).

Беларусь і сьвет: Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21); Дыпляматычны корпус у Менску (ІНФ.№27-29, 34).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17); Пералік указаў прэзыдэнта РБ, прызнаных КС РБ незаконнымі (ІНФ.№33).

Беларускі кампутар: Кірыла, Мятод ды іншыя (ІНФ.№35)

Як абыграць Астапа Бэндэра



Каб Вас не падманулі, пры заключэньні дамовы з будаўнічай установай, раім Вам зьвярнуць увагу на некалькі момантаў. Калі Вы будзеце пасьлядоўнымі і патрабавальнымі, то хутчэй за ўсё не патраліце ў непрыемную сытуацыю. Бо наўрад ці адшукаецца будаўнічая фірма, якая прадугледзіць усе Вашыя "страховачныя" пытаньні.

1. Дамова павінна быць заўсёды адной. На вытворчасьць усіх будаўнічых работ, якія плянуюцца, павінна быць заключаная адзіная дамова з дакладным указаньнем тэрмінаў іхняга заканчэньня. Інакш "паплыве" і агульная сума Вашых выдаткаў, і час будаўніцтва.

Раім зьвярнуць увагу: У сярэднім, аднапавярховы дом з мансардай (паўтары паверхі) агульнай плошчай 100 м2 будуецца "пад ключ" з улікам надвор'я каля 1,5 месяцаў.

2. Патрабуйце санкцыяў. У дамове павінны быць абавязкова ўказаныя штрафныя санкцыі да падрадчыка за парушэньне тэрмінаў будаўніцтва. Гэта неабходна, нават калі Вы перакананыя ў сумленнасьці будаўнікоў.

Раім зьвярнуць увагу: Тыповыя санкцыі — 1% у дзень ад кошту недаробак за кожны дзень пратэрміноўкі, пачынаючы з шостага. Пяць "лагавых" дзён даюцца на прастой пры магчымых неспрыяльных умовах надвор'я (пасьля заканчэньня кладкі і ўзьвядзеньня даху надвор'е на будаўніцтва не ўплывае).

3. Сьмета — вельмі важны дакумэнт. Уважліва пастаўцеся да сьметы працы і зафіксуйце агульны кошт у дамове. Сьмета павінна быць складзеная па этапах з указаньнем унутры кожнага этапу ўсіх відаў работ і іхняга кошту, а таксама кошту будматэрыялаў і дадатковых выдаткаў фірмы: накладных, плянавых, непрадбачаных і інш. Зьвярніце ўвагу на разьлік НДС.

Раім зьвярнуць увагу: Сярэдні кошт мэтра забудаванай плошчы пры правядзеньні агульнабудаўнічых работ на сёньня вагаецца каля адзнакі 400 даляраў. Кошт аздабленьня індывідуальны ў залежнасьці ад Вашых патрабаваньняў. Устройства аўтаномнай каналізацыі з чатырохмэтровым выграбным сыфонам не перавышае 2500 даляраў і залежыць ад аддаленасьці дома.

4. Правярайце ўсе кошты. Будаўнічая ўстанова разам з разьдзіманьнем уласных даходаў, як правіла, "накручвае", таксама на кошце работ і будматэрыялаў. Прычым, калі бягучы кошт апошніх агульнавядомы і Вы маеце магчымасьць таргавацца, то з коштам працаў складаней.

НАШАЯ ПАРАДА

Калі Вы адчуваеце сябе неспэцыялістам у гэтай галіне, то мае сэнс абмеркаваць расцэнкі са спэцыялістамі. У прыватнасьці, экспэртызу дапамогуць Вам правесьці ў таварыстве спажыўцоў.

5. Доля фірмы не павінна быць занадта важкай. Дамагайцеся, каб доля накладных і іншых выдаткаў фірмы не перавышала 35% ад агульнага кошту дамовы. Досьвед паказвае, што фірмы ідуць на зьніжэньне сваёй долі да 25%.

Раім зьвярнуць увагу: Пры разьліку гэтай лічбы памятайце, што выдаткі такога кшталту "накручваюцца" на ўсю папярэднюю суму (разьлік нарастальным вынікам): калі кошт работ і матэрыялаў склаў, напрыклад, 50 млн. руб., то накладныя выдаткі ў памеры 20% складуць яшчэ 10 млн. руб., а якія-небудзь "непрадбачаныя выдаткі" ў памеры 10% будуць разьлічвацца ўжо не ад 50, а ад 60 млн. руб.

Не забывайцеся на інфляцыю. У дамове пажадана зафіксаваць прывязку да якой-небудзь разьліковай адзінкі (базе). Як правіла, гэта курс даляра на момант заключэньня дамовы. Потым разьліковая адзінка будзе неабходная пры вызначэньні сапраўдных выдаткаў па этапах работ і ацэнцы кошту недаробак.

Калі ж такой прывязкі няма, а разьлікі адбываюцца ў рублях па бягучых коштах, то зьвярніце ўвагу на артыкул у дамове "разьвіцьцё базы". Гэты паказчык выкарыстоўваецца для індэксацыі выдаткаў: ён адлюстроўвае ўзровень росту коштаў на час дзеяньня дамовы, зь якім Вы пагаджаецеся, падпісваючы сьмету.

7. Разьлік любіць парадак. Зьвярніце ўвагу на парадак разьліку. Поўная перадаплата недапушчальная. Агульнапрынятым варыянтам ёсьць наступны. Заказчык у момант падпісаньня дамовы аплочвае 50% ейнага кошту. Далей, па заканчэньні кожнага этапу, кошт якога вызначаецца сьметай, выплочваецца ейная другая частка. Тады па заканчэньні будаўніцтва і падпісаньня акта здачы-прыёмкі за Вамі застаецца доўг у памеры паловы кошту апошняга этапу.

8. Будаўніцтва — гэта найперш улік. Па заканчэньні кожнага этапу патрабуйце падпісаньня акта, які пацьвярджае заканчэньне працы і ейную поўную аплату ("працэнтоўкі"). Майце на ўвазе, што калі падрадчык перавысіў сьмету выдаткаў пры захаваньні зацьверджанага аб'ёму работ, то гэта ягоныя страты, і патрабаваць ад Вас іхняй кампэнсацыі ён ня мае права. У выпадку скарачэньня аб'ёмаў працы па тым ці іншым этапе Вы мусіце заплаціць менш, чым меркавалася.

9. Дамову павінны падпісаць абодва бакі. Патрабуйце, каб будаўнічая фірма падпісала праект. Вас жа ў ім распісацца прымусяць абавязкова. У Вас на руках павінны застацца, як мінімум, арыгіналы дамовы, сьметы выдаткаў і праекту.

10. Давярай — але правярай! Вызначыце тэрміны правядзеньня кожнага этапу і ў пэрыяд будаўніцтва часьцей наведвайце "аб'ект". Тады Вы прасочыце адпаведнасьць рэальных аб'ёмаў работ і якасьці матэрыялаў — дамоўным.

Раім зьвярнуць увагу: Досьвед паказве, што на заключэньне дамовы, узгадненьне праекта і сьметы выдаткаў, а таксама прывязку да месца з выездам на мясцовасьць губляецца некалькі дзён і сьпешка тут недарэчная — Вы не галошы купляеце.

У гэтым выпуску «Шуфляды» мы пачынаем друкаваць сабраныя й апрацаваныя Сяргеем Ёршам са Слоніма ўспаміны сведкаў трагічных падзеяў другой сусьветнай вайны ў Беларусі, а таксама ў першыя гады пасьля яе. Гэта аўтарскія запісы ўспамінаў іншых людзей і таму яны прадуглежваюць пэўныя акцэнты. Часам у гэтых успамінах прысутнічае такі сацыялягічны пласт, які выходзіць за рамкі пэўнай гістарыяграфічнай канцэпцыі і прыводзіць да перасячэньня нацыянальнай і савецкай рэальнасьцяў, што можа спрычыніцца да карэкцыі стэрэатыпных уяўленьняў. **ADz.**

Партызанскімі сьцежкамі

Ці быў справядлівы ў Садоме? На Слонімшчыне такі быў. Пра яго дагэтуль ходзяць легенды. І старыя сяляне запэўніваюць мяне, што асабіста былі зь ім знаёмыя. Толькі сапраўднага імя гэтага камандзіра савецкага партызанскага атраду яны ня ведалі. «Мікалай Мікалаевіч» — пад гэтым імем быў вядомы на Слонімшчыне і Ружаншчыне маёр Канстанцін Нішчанкоў.

Упершыню пра маёра Нішчанкова і яго трагічны лёс я прачытаў у кнізе партызанскіх успамінаў «Буг в огне», якую выпадкова знайшоў у вайсковай бібліятэцы. Пазьней, звольніўшыся з войска, я пачаў зьбіраць пра яго зьвесткі, аднак да апошняга часу ня ведаў, што ваенны лёс К.Нішчанкова цесна зьвязаны са Слонімшчынай. Прайшоўшы партызанскімі сьцежкамі, нечакана для сябе я натрапіў на сьлед гэтага партызанскага камандзіра.

К.Нішчанкоў нарадзіўся 17 чэрвеня 1906 году ў Пецярбурзе. Яго бацька, афіцэр расейскай арміі, загінуў на пачатку Першай сусьветнай вайны, а маці памерла ў 1919 годзе. Косьця Нішчанкоў трапіў у дзіцячую працоўную калёнію, вядомую пад назовам «Чорны Манастыр». У 1922 годзе ён паступіў у вайсковую вучэльню, па заканчэньні якой пачаў сваю службу ў Чырвонай арміі. Напярэдадні нямецка-савецкай вайны Нішчанкоў быў ужо маёрам, камандзірам 15-га стралковага палку 49-й стралковай дывізіі, якая дыслякавалася каля Берасьця. У першыя дні вайны полк гераічна стрымліваў пераважальныя сілы нямецкай арміі, але быў абкружаны і амаль палкам зьнішчаны...

Увосень 1941 г., пасьля ўцёкаў зь лягеру ваеннапалонных, К.Нішчанкоў прыйшоў у невялікую вёсачку Старыя Дзявяткавічы на Слонімшчыне. Там ён і жыў да вясны 1942 году ў хаце Марыі Казушчык. Васьмідзесяцігадовую спадарыню Марыю, ужо зусім нямоглую, я знайшоў у доме састарэлых. Задрыжэлі яе рукі, калі яна ўзяла ў мяне фатаздымак Нішчанкова. Паволі вярталіся ўспаміны пра тыя страшныя ваенныя гады:

— Жыў ён у мяне, гэта Мікалай Мікалаевіч. Яны хадзілі бедныя, абадраныя, галодныя, і хто шкадаваў, браў іх да сябе. А ў мяне гаспадара не было, а трэба было дроваў нарыхтаваць, і я яго ўзяла... У мяне дзеці малыя былі. Думаю, што хоць ён і паранены, але нейкая данамога будзе. Пабыў ён у мяне толькі шэсьць месяцаў — пайшоў у партызаны...

У гэтай жа вёсцы апынуўся яшчэ адзін акружэнец — капітан Мікалай Бабкоў. Вясной 1942 году, пасьля таго, як немцы загналі ўсім «васточнікам» зьявіцца ў горад для «рэгістрацыі», Бабкоў і Нішчанкоў падаліся ў лес. З былых чырвонаармейцаў і савецка-партыйных працаўнікоў яны арганізавалі партызанскую групу зь 10-15 чалавек. Так пачалася савецкая партызанка.

Жыхар вёскі Старыя Дзявяткавічы Ўладзімер Жыгар успамінае:

«Як чалавек Мікалай Мікалаевіч быў вельмі справядлівы. Добры ён быў чалавек, выключна добры. Ён абараняў людзей, асабіста нас абараніў. Каб не Мікалай Мікалаевіч, расстралялі б маю сям'ю... Бабкоў быў камандзірам атраду, а Мікалай Мікалаевіч камісарам, але мелі яны аднолькавую ўладу.

Прыйшлі аднойчы. Хтосьці падказаў, што ў нас ёсьць некалькі вуляў пчолаў. Прыйшлі і кажуць: «Мёд давай! Весь отдавай, сколько есть!..» Маці не хацелася ўвесь аддаваць, бо трэба было нечым дзяцей карміць, і яна прынесла толькі некалькі бутэлек.

— Увесь, болей няма. — кажа.

— Праўду говоришь? — пытаецца Бабкоў.

— Праўду.

— Если найдём ещё — расстреляем!

— Расстрэльвайце...

Вось якая наіўная жанчына.

Мёд хутка знайшлі і прынесьлі. Бабкоў камандуе: расстраляць! Усе партызаны маўчаць, хоць, можа, і хацелі, каб расстрэльвалі, а Мікалай Мікалаевіч сказаў: «Нет, не надо расстреливать!» Бабкоў зноў даў каманду, але Мікалай Мікалаевіч не адступіў. Усё ішло да бойкі паміж імі, але Бабкоў ўсё ж саступіў, і нас не расстралялі...»

Маёр Нішчанкоў увосень 1942 году арганізаваў свой партызанскі атрад. Былыя партызаны ўспамінаюць, што пайшлі ў лес, паслухаўшы палымяную прамову Нішчанкова, які асабіста праводзіў вярбоўку ў вёсках. Ён зрабіў стаўку на беларусаў, маючы досьвед службы ў польскім войску. Няведама адкуль зьявіўся назоў атраду — «Імя Кірава», магчыма, ён быў дадзены значна пазьней партыйцамі, раскіданымі з самалётаў. У той час, як правіла, савецкія партызанскія атрады называліся паводле імя камандзіра.

Партызанка ў Заходняй Беларусі была розная: савецкая, польская, беларуская, украінская. Толькі савецкія партызаны ня мелі цэнтральнага кіраўніцтва, і гэта прыводзіла да таго, што некаторыя атрады сталіся звычайнымі рабаўніцкімі бандамі. На Берасьцейшчыне і на Слонімшчыне савецкую партызанку спрабаваў кантраляваць колішні выпускнік Віленскай беларускай гімназіі, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б Язэп Урбановіч («Максім»), які арганізаваў Антыфашыстоўскі камітэт. Ён быў вельмі папулярны сярод насельніцтва, але да яго ня мелі даверу савецкія дэсантнікі, якіх шмат зьявілася на Палесьсі: яны ўважалі Урбановіча за «нацдэма». Пазьней «Максіма» абвінавацяць і ў сувязях з «нацыяналістычнай бандай», як называлі чакісты адзелы незалежнае Беларускае народнае партызанкі. Праўдападобна, цесныя кантакты з народнаю партызанкаю падтрымліваў маёр К.Нішчанкоў. Адзін зь беларускіх атаманаў ужо на эміграцыі пісаў пра яго як пра аднаго з камандзіраў народнае партызанкі.

Масква не магла пагадзіцца з тым становішчам, якое займала савецкая партызанка ў Заходняй Беларусі. Вясной 1943 году пачалася крывавая акцыя разьбраеньня беларускіх і польскіх атрадаў савецкімі партызанамі і дэсантнікамі. Дагэтуль яшчэ мала напісана пра злачынствы на Берасьцейшчыне палкоўніка Рыгора Лінькова («Льдоў»), які выконваў спэцыяльнае сакрэтнае заданьне П.Панамарэнкі. Адной зь першых ахвяраў палкоўніка стаў Канстанцін Нішчанкоў.

Галоўнай задачай Лінькова было зьнішчэньне камандаваньня Беларускае народнае партызанкі, але не пашкадаваў ён і савецкіх камандзіраў. Першым у яго штаб быў выкліканы маёр Нішчанкоў.

Марыя Іванаўна Казушчык расказала мне пра сваю апошнюю сустрэчу зь «Мікалаем Мікалаевічам»:

«Прыехаў ён да мяне і кажа: «Что-то меня вызывают. Больной начальник прилетел. Что будет — не знаю...» І не вярнуўся ўжо. Забіў яго той «лётчык»... Харошы быў чалавек, шкада. Стаяў за ўладу і ня ўгледзеў той улады...» Да гэтага часу спадарыня Марыя ўпэўненая, што Лінькоў быў нямецкім шпіёнам. Адкуль ёй ведаць, што гэта быў заслужаны партызан, герой Савецкага Саюза?!..

На сустрэчу зь Ліньковым Нішчанкаў прыехаў толькі са сваім ад'ютантам Юзікам Кузецкім. Іх разьбралі, і Лінькоў кожнага забіў стрэлам у патыліцу... У 1947 годзе ў Маскве выйшлі ягоныя «мэмуары», у якіх ён інакш апісаў гэтую сцэну: «Я привёл в порядок пистолет... поднял его и прицелился майору в переносицу... Я всадил в него три пули подряд». Лінькоў тлумачыць свае дзеяньні тым, што Нішчанкоў быў п'яніцай і не кантраляваў свайго атраду. Праўда, некалькімі бачынамі ніжэй ён піша, што найбольш баязьлівы склад людзей быў у атрадзе імя Кірава.

Наступнаю ахвярай Лінькова павінен быў стаць камандзір атраду «Савецкая Беларусь» капітан Бабкоў, якога таксама запрасілі на «сустрэчу». Але Бабкоў застаўся жывы, бо ўзяў з сабой некалькі дзясяткаў верных хлопцаў, узброеных кулямётамі і аўтаматамі. Аднак падначаленца «пасланцу Масквы» прыйшлося. З усіх савецкіх партызанскіх атрадаў палкоўнік Лінькоў забраў найлепшых партызанаў з аўтаматычнаю зброяй: яны павінны былі ахоўваць яго. А сам «Льдоў» са сваімі дэсантнікамі пачаў тым жа спосабам распраўляцца ўжо з камандзірамі народнае партызанкі...

Доўгі час я ханеў даведацца, ці спрабаваў хто з партызанаў адпомсьціць за забітага камандзіра. Былы сувязны атраду К.Нішчанкова Сьцяпан Янушка на маё пытаньне адказаў:

— Якая помста? Усе баяліся! Як ты не падначаліься савецкаму кіраўніцтву? Цябе адразу расстралялі б!..

Толькі калі мы разьвітваліся, ён ня вытрымаў і выказаў набалелае:

— Гэтых свалачэй (чэкістаў) трэба цяпер усіх паўбіваць, як яны пабілі гэтых людзей чэсных!..

Сяргей Ёрш

Дакумэнт пра невядомае паўстаньне

Філія абласнога дзяржаўнага архіву ў г.Магілёве. Фонд №30 «Прапойскі РК КПБ(б)». Вопіс 1 А. Справа №124 «З рознымі плянамі і справамі» (1929-1930), а. 40. май 1930

У першыя гады пасьля Кастрычніцкага пераваротy 1917 г. адбыліся ўзброеныя паўстаньні супраць бальшавіцкай улады ў Вяліжы, Гомелі, Чавусах, Горках, Воршы і г.д. Усе яны былі часткай плянаванага на 1919-20 г. усебеларускага паўстаньня.

У філіі абласнога дзяржаўнага архіву г. Магілёва ёсьць матэрыялы Прапойскага РК КПБ(б) за 1920-30 г. (цяпер Слаўгарадзкі раён Магілёўскай вобласьці). У адной са справаў захоўваецца данясеньне райаддзелу міліцыі ў райкам з аналізам палітстановішча раёну напярэдадні суцэльнай калектывізацыі (травень 1930). Данясеньне ўяўляе сабою старонку друкаванага на машынцы тэксту бяз подпісу. Апрача аналізу палітычнага настрою жыхарства раёну на 1930 г., яно зьмяшчае зьвесткі аб Прапойскім паўстаньні супраць савецкай улады 1919-20 г. У савецкай гістарыяграфіі антыбальшавіцкі рух называўся «бандытызмам». Але ў нашым выпадку сама міліцыя ацэньвае сялянскі выступ як «паўстаньне».

З тэксту відаць, што паўстаньне ахапіла тэрыторыю васьмі зь дзесяці сельсаветаў раёну (гл. мапу, складзеную згодна зь межамі с/с на 1932 г.).

У кастрычніку 1996 г. я наведаў гэтыя мясьціны. Захавалася і вёска Жалезенка, нягледзячы на адсяленьне шэрагу суседніх вёсак з прычыны высокай радыяцыі. Захаваўся нават масток у вёсцы па дарозе з іванішчавічаў, які згадваецца ў дакумэнце. Толькі жывуць у Жалезенцы ці адносна маладыя людзі, ці тыя, што прыбылі туды ў пасьляваенны час. У сельсавеце сакратар, жанчына ўжо сталага веку, пацьвердзіла мне, што вёску Жалезенку заснавалі «западнікі» – перасяленцы з Заходняй Беларусі, якія самі выкарчавалі лес, высушылі балоты, апрацавалі глебу. Таму й цанілі працу і тое, што яна дае. Невыпадкова якраз у гэтай вёсцы знаходзіўся штаб: яе жыхары катэгарычна не прымалі бальшавіцкіх рабункаў. Вось прозьвішчы заснавальнікаў вёскі: Гоевы, Грамыкі, Пухоўскія, Грахоўскія, Іваноўскія. Большасьць зь іх пазьней была «раскулачаная». А раскулачвалі, паводле ўспамінаў Ганны Кураленкі (1922 г.н., па бацьку Варэньнікава), за тое, «... што гусей па многу было, кароў шмат мелі, садочкі...»

Пэўныя зьвесткі пра паўстаньне ў спадарыні Ганны засталіся ад бацькі, ведае пра паўстаньне з аповедаў сваёй маці і член-карэспандэнт АНБ І.Марчанка. Але гэтых сьведчаньняў вельмі мала. Няма пакуль зьвестак пра кіраўнікоў паўстаньня, пра тое, як яно душылася, невядомыя прозьвішчы палеглых герояў.

Дакумэнт аб Прапойскім паўстаньні 1919-20 г. друкуецца ўпершыню (цалкам захаваная мова арыгіналу).

Ігар Пушкін

Гістарычны нарыс выкананы ў рамках праекту "Адна памяць - Усходняя Эўропа". © Архіў Найноўшай Гісторыі, 1996.

KALANDAR

16 śnieżnia

Naradzilisia: niamiecki kampazytar Ludwig van Beethoven (1770-1827); biełaruski paet i filozaf Źnič (1939), sapraŭdnaje prozvišča jakoha Aleh Biembiel i biełaruski skulptar Valarjan Januškievič (1891).

17 śnieżnia

Ničoha asablivaha nie adbyłosia.

18 śnieżnia

Naradziŭsia Joseph John Thompson (1856-1940), anhielski navukoviec, adkryvalnik elektronu i laureat Nobelcŭskaj premii ŭ halinie fizyki za 1906 hod.

19 śnieżnia

U hety dzień... naradzilisia Leanid Brežnieŭ (1906-82), saviecki kiraŭnik, jaki ŭładaryŭ z 1964 h. až da śmierci; francuskaja śpiavačka Edith Piaf (1915-63).

20 śnieżnia

U hety dzień... naradziŭsia Jazep Jadkoŭski (1890-1950), biełaruski archeolah i numizmat.

21 śnieżnia

U hety dzień... naradzilisia: Iosif Stalin (1879-1953), saviecki dyktatar; biełaruski kampazytar Mikałaj Aładaŭ (1890-1972); biełaruski piśmieńnik Ivan Čyhrynaŭ (1934).

22 śnieżnia

U hety dzień... naradziŭsia italjanski kampazytar Giacomo Puccini (1858-1924).

Сяржук Сокалаў

* * *

О, тыя акты: «Акты затрыманьня»!
Сядзяць мянты, як вожыкі ў
тумане,
Начальнік — бог, ды моляцца
графе,
Дзе·трэба напісаць, чаму ты —
фе!..

Спытаўся Віктар: «Што я дзе
парушыў?
Ці што зламаў? Чаму сядзець тут
мушу?
Ці што парваў? Скажыце мне,
прашу».
І мент сказаў: «Ты мне парваў
душу!»

«Дык вось і напішыце, калі ласка,
Што вы свае спаўнялі абавязкі,
А я на вас наводзіў жахі-страшы
Тым, што ірваў і пляжыў душы
вашы!»

* * *

О, Судны дзень — такая справа —
Яна нікога не міне
І побач зь левым сядзе правы
У псыхлякарні на судне!

* * *

Куды бяжыш, бяссэнсіца-жыццё?
Куды нясеш мяне на плыткіх
водах?
Якіх чарговых глупстваў адкрыццё
Рыхтуюць мне наступнасьці
прыгоды?

Балюча думаць, што яшчэ жывы!
І хочуць думкі вечнага спакою!
Іду на вы, з самім сабой на вы,
У карны меч уліўшыся рукою.

Пакінь, мой лёс, змагацца за мяне,
Ты ўсё зрабіў, а я табе ня дзячыў
І не шкадую — не хачу іначай.

Адно малю — разьліцца у вясьне,
Хай восень мной азорыцца,
адплача,
І забыццё наводмаш паласьне...

* * *

Што меў? Што маю? І што — буду?
У прышласьць радасна гляджу —
Там болей тхлані, болей бруду,
Непадуладнага дажджу.

Што меў? — Надзеі спадзяваньні,
Нашчэнт дзяцінныя глузды,
Высакародных парыванъняў
Намарна жытыя гады.

Што маю? — Сам сябе такога,
Жаданьне жыць, як набяжыць,
Ня мроіць і не варажыць.

Ды ля бацькоўскага парога,
Пачуўшы ўзбочнае: «Нябога...»
Бяз жалю голаў свой злажыць.

* * *

Рыфмы кулямі я наладую,
(Замаруджу — сабе ж і збрыджу)
Ёсьць бязбацькавічы,
іх — шкадую,
Безайчыньнікаў — ненавіджу.

Вобраз вызьверыцца ў вабрэзе
І графіт адсушэе ў порах,
Ёсьць бязмоўны, які ня лезе,
Антымоў — безумоўны вораг.

Ёсьць няшчасны — псыхічна
хворы,
Але ёсьць і вар'ят сьвядомы,
Клацну ўраньні радком-затворам,
Не баньдзюк жа ўначы я, дома!

І сплятуцца у словы гукі,
Тахт затахкае кулямётам.
У бязьдзедавічаў — унукі,
Ў антыдзедавічаў — ніхто там...

Спалі — ўсталі, ня чулі — ўчулі,
Што за прышласьць, якую мроіш,
Заганяе свой верш у рулю
Той, хто з Сокалаў —
вечны Воюш.

* * *

Можна ляжаць на ляўрах.
Столькі год за плячыма.
Прагнуць час і здароўе
Спакою і цішыні.
Толькі ў халодных аўрах
За сьпінай ляжыць Айчына
Белая ад бяскроўя,
Чорная ад хлусьні.

І не змаўкае творца,
Годна гучыць над краем
Голас балючай праўды,
Гаючай надзеі сьпеў.
Таму і ня сьпяць дазорцы
З логава воўчай зграі,
Бог бы іх пакараў, ды
Народ яшчэ не дасьпеў...

Дыхае ў сьпіну моладзь,
Крок да таго, каб разам,
Толькі зусім ня проста
Стаць на пярэдні край.
Там галаледзь і холадзь,
Там мужны адказ паразам,
Там вечны адбой пагостам
Для змагароў за край.

Андрэй Дынько

PRIVATE WRITER

навэля

Ён расплюшчыў вочы і скалануўся. Па абабітай шоўкам сьцяне паўзьлі сухія цені. Два твары глядзелі на яго зь цемры. Ад мужчыны ў нясьвежым парыку з падмаляванымі вачыма патыхала таннымі запалкамі і нечым душным, мабыць, пудрай. Стомленыя вочы жанчыны сьвяціліся маўклівай пагрозай; з-пад румянаў праглядалі заўчасныя маршчакі. Такіх кабетаў ён часта бачыў у Пецярбурзе. Яны выходзілі з мэтро і сядалі ў машыны.

Ён адчуваў яшчэ чыесьці позіркі, апрача позіркаў гэтага палобнага да мазура героя-каханка і ягонай спадарожніцы. Ён не памыляўся. Нсўзабаве пачуліся гукі Гайднавай «Мэсы». Курчыліся блішчастыя кветкі, сатканыя сухотным ліёнскім майстрам. Енчылі скрыпкі. Твары не зварухнуліся. Цені марудна сьціскалі кола. Уступіла флейта. Адкуль? Яго аж пранізала, калі з-пад парыка нерухомага загрымаванага зуха высьлізнула кропелька поту, упала на левую руку. Рука засьвяцілася і павольна пацягнулася ўверх. «Мэса» сьціхла. Блішчэў пярсьцёнак зь зялёным камянём. Мезены палец крыху падрыгваў. Куточкі рота паволі расьцягваліся ў жорсткай усьмешцы. Раптам далонь успыхнула і прарэзала павєтра, аблачынка пылу пырснула зь лядашчага парыка, грымнула іншая мэлёдыя, губы разьляцеліся:

La ci darem la ma-ano, la mi dirai di si-i-i...

«Дон Жуан», гэта «Дон Жуан»! Мазэта не фальшывіў, але відаць было, што ён ня вельмі абазнаны з партыяй, бо ён не падкрэсьліваў la. Раптам ізноў захоп хор Гайдна. Дон Жуан не адступіў і з жахлівай пяшчотай цягнуў сваё... non e lonta-ano, andia-am, mia bella, da qui-i... Скрыпкі стараліся, напіналі свае жалезныя галасы, нібы нараджаліся яны не са старога цёплага дрэва, што стала мёртвым галіёнам, каб на глыбокім дне дачакаша рукі майстра, а зь недаломкаў рыцарскай зброі. Здані Вэрдзі і Гайдна сьпяшаліся зірнуць на страшнае суперніцтва. Так калісьці нявеста ў крывавым вэлюме рвалася ад скрыпак да бубнаў... Хор быў нябачны і ўпэўнены. Бяскроўныя вусны саліста хапалі паветра. Прывідныя пальцы лашчылі ядваб. Vie-e-eni!

З кожным гукам цемра сьцякала ўсё ніжэй. Голыя плечы, галюсенькія плечы салістаў. Сплецены з валасоў цяжкі ланцуг. І толькі на плячы жанчыны гаматная барбарская фібула. Бязьлітасныя вочы. Даўжэзныя драўляныя трубы, якімі калісьці віталі Сьвятога Ільлю, апошні ўспамін дзеславага дзяцінства. Ясеневыя і альховыя палескія трэмбіты. Vie-e-eni! Гэтага «Kyrie eleison» трэмбітай не перажыць.

А жанчына, а жанчына таксама набліжаецца, сьпяваючы. Фрывольныя мушкі падымаюцца на бязрадных, нібы служанчыных грудзях. Які фарс, які агідны фарс! Выконваць «Kyrie eleison» на жалезных скрыпках, хаваць хор за заслонай ночы, ахутаць млосьцю маляванае жалобы дзясяткі апранутых у чорнае, у нядзельнае, вачэй, ахінуць сьцены шоўкам і прыслаць забойцаў у выглядзе дуэта з «Дон Жуана». Ён разгадаў іх, ха-ха! Крывавы вэлюм, трэмбітны сок, трэмбітны сок, атрутная смага, бязродны цмок, рукі палступных гледачоў, замест артыкестру загон зьвяроў.

Хітра прыдумваюць. Калі быў бы толькі хор альбо толькі Мазэта, ён пасьпеў бы зацугляць рытм, асядлаць яго, уцячы. Калі б тады, калісь-калісьці, бубен згадзіўся грукаць, вясельле адбылося б. Пад адную ж скрыпку не патанцуеш. Немагчыма схапіць рытм сярод гладкай шаўковай сьпякоты.

Felice ben sare-ei, ma puo burla-armi anco-or... кі-ірые элейсан...

Дзьве тэмы спляліся ў вар'яцкі габэлен. Хор гучаў глуха і няроўна, як прыбой на добрым моры. Каханкі прыступалі ўсё бліжэй. Ён адчуваў іх. Адкуль яны даведаліся, што ў ягоным жыцьці было тры «Кірые»: з Моцартавага «Рэквіему» ў Чырвоным касьцёле; той «Кірые», што ён сьпяваў самому сабе, крадучыся з аўтаматам узбоч шэрай сьцяны; і тое, што прамаўляў пасьля маўчаньня чорны незнаёмец у капліцы Маці Божае Нястомнай Дапамогі? Якая подлая прыдумка: акружыць дзьвюма мэлёдыямі, загнаць у лябірынт жалобы і пажады. Што яны робяць? Яны сьмешныя. Прэч, няхай не набліжаюцца, не дакранаюцца...

Той прыкладае юрлівую руку да валасатай грудзі, маўляў, вер мне, andia-am; тая разводзіць рукамі, нібы ў роздуме, і яе прагныя грудзі пакалыхваюцца, vorrei e non

У мінулых нумарах «НН» мы зьмясьцілі эсэ амэрыканаскага мультымэдыйнага пісьменьніка Ральфа Лабрэгліі, дзе ён распачаў дыскусію пра прыгожае пісьменства ў эпоху кампутараў ды лязэрных дыскаў. Ральф Лабрэглія — адзін з тых, што горача вітаюць надыход новай эры ў працы літаратара, але існуюць і іншыя, процілеглыя падыходы.

КНІГА І

Альбо ці задушаць сродкі мультымэдыя

Надыход эры мультымэдыя вядзе да таго, што шматтомныя энцыкляпэдыі ці даведнікі, якія бясконцымі шэрагамі стаяць на паліцах бібліятэк, робяцца амаль анахранізмам. Іх выцясьняюць электронныя канкурэнты на кампакт-дысках, што могуць ня толькі паказваць карцінкі, але й гаварыць і дэманстраваць цэлыя фільмы. Такая сытуацыя непакоіць многіх з тых, што былі традыцыйна залежныя ад друкаванага слова, асабліва выдаўцоў. Сярод такіх людзей паэт Свэн Біркерц.

Нядаўна ён выпусьціў кнігу пад назвай «Гутэнбэргавы элегіі. Лёс чытаньня ў электронную эпоху» (Sven Birkerts, The Gutenberg Elegies: The Fate of Reading in an Electronic Age (Boston: Faber and Faber, 1994)). Ужо з самой назвы відаць нэгатыўнае стаўленьне «традыцыйнага» літаратара да пераходу на новыя кібэрвяршыні літаратурнай творчасьці. Кніга прадстаўляе вельмі выразны пэсымістычны погляд на будучыню друкаванага на паперы мастацкага слова, а сам аўтар уяўляецца гэткім апошнім з магіканаў, які захоўвае традыцыі вялікіх продкаў, што ня мелі ніякіх кампутараў і пісалі свае вечныя творы пры дапамозе гусінага пяра. Газэта «The Washington Post» нават назвала кнігу Біркерца пісьменьніцкім плачам па літаратуры і ўсім, што мае да яе дачыненьне. Свэн Біркерц разважае пра тое, што раптоўны пераход ад кнігі да кампутарнага манітора вядзе да зьбядненьня культуры грамадзтва і да страты ягоных апошніх эстэтычных каштоўнасьцяў. Аўтар горача заклікае не



vorre-ei... Той нават не пагаліў валасоў пад пахамі, а ўжо зазыўна цягне руку:

— Lo cangerei tua so-orte!

— Non so-on, piu fo-orte, non so-on piu fo-orte...

— Vie-e-eni!

«Прысыпалі сябе пудрай і паклікалі плакальнікаў, каб тыя ўпрошвалі зьлітасьціўіца паўвенскага, паўбізантыйскага Гайднавага Бога», — думаў ён, ліхаманкава шукаючы паратунку ад мінатаўра.

Раптам яму стала съмешна, ён узгадаў бітву пеўня з чарапахай. Голы, абпырпаны певень з грэбнем, прысыпаным пудрай, і чарапаха з гурмай абыякавых скрыпачоў на карку памірыліся, каб разбудзіць няўдзячнага гледача. Ха-ха! Але музыка не давала яму заплюшчыць пачырванелых ад няспаньня вачэй.

Ён жа ваш private writer, ён заўсёды пісаў пра вас, а вы не даяце яму нават хвіліну падрамаць. Варта яму было толькі заплюшчыць вочы, і вы ўжо насклікалі поўную залю хімэраў, і вы ўжо лавай зьдзскаваша зь ягонай нядужасьні і самотнасьці. Вы так ляцелі помсьціць яму, што нават не насьпелі апрануцца, і цяпер, калі вы возьмецеся за рукі і будзеце сыняваць фінал свайго дуэта пра суцяшэньне болю пнатлівага каханьня, перабіваючы «Kyrie eleison», засьвецянь рампу, і вы будзеце стаяць перад ім, распаленыя шалам свайго харапства, правільнасьці і спрыту, нават не саромеючыся сваёй галоты. Вам пляваць, што ён так дорага заплаціў за гэтую абабітую кантрабандпай мярэжай лёжу, каб магчы заставацца ў цішы сярод залатых птушак і срэбнага кавылю хоць зрэдчас... Спыніце музыку, спыніце зьдзек, каты! Пакіньце яго ў спакоі, дайце яму заснуць, алсунуць дзьверы ў сярэднявечнае дзяцінства. Ён ваш private writer, але ён так і не палюбіў быць слухачом у вашым тэатры. Выпусьціце яго з двухколернай музыкі вашага жыцьця.

Ён вар'ят, а вы заўсёды масце рацыю, але вы яго ня вартыя.

Андрэй Дынько

Андрэй Антонаў

Коніка злавіў
у пылу прыдарожным.
Радасьць лайдацтва.

Зьлізваю з пальцаў
сок апэльсіну. Людзі
бягуць кудысьці.

Стары палітон
з шафы дастаў. Каштан у
кішэні — ссохлы.

Падае сьнег. У
календары шукаю
сёньняшні дзень.

Прачнуўся. Ці то
ранак, ці то вечар. Вокны
ў ліпкім тумане.

Нат служаўся. Так
падобны гэты бармэн
на майго бацьку.

Сустрэла з буськай.
Пытае: «як ты?». Стой ды
ўзгадвай яе імя.

КАМПУТАР

традыцыйную друкаваную кнігу

адмаўляцца ад «мастацва чытаньня кнігі».

Біркерц падае істотнае адрозьненьне паміж друкаванымі кнігамі і он-лайнавымі (даступнымі праз Інтэрнэт) тэкстамі (ён пагардліва называе апошнія «дакумэнты»), лічачы, што розьняцца яны ня проста, як «новае» і «старое». Аўтар перакананы, што існуе істотнае адрозьненьне, як фізычнае, так і псыхалягічнае, а гэта беспасярэдне ўплывае на тое, што і як успрымае чалавек.

У сваіх аргумэнтах супраць бяздушных і неэстэтычных кампутарных гіпэртэкстаў Біркерц спасылаецца на свой уласны жыцьцёвы досьвед. Ён прыгадвае, як у дзяцінстве любіў чытаць кнігі, як пазьней працаваў мэнэджэрам у кнігарні, як пачаў пісаць, як выкладаў літаратуру і мастацтва літаратуры ва ўнівэрсытэтах. Абапіраючыся на свой досьвед выкладчыка, Біркерц заўважыў, што студэнты, якія наведваюць ягоныя заняткі, усё болей і болей адвучваюцца заглыбляцца ў зьмест: яны страцілі здольнасьць суадносіць розныя тэмы, што закранаюцца ў кнізе, бачыць «стрыжневую канву» сюжэту, перасталі суадносіць гісторыі пэрсанажаў са сваім уласным жыцьцём. Біркерц адзначае нязьдольнасьць вучняў уважліва сачыць за разьвіцьцём аўтарскай думкі ў традыцыйных літаратурных формах. Асноўную адказнасьць за гэта Біркерц ускладае на электронныя сродкі перадачы інфармацыі, дзе матэрыял, перадвызначаны для чытаньня, не чытаецца, а прабягаецца (скануецца), дзе паток інфармацыі перавышае здольнасьць яе ператраўленьня, крытычнага асэнсаваньня і засваеньня.

Для Біркерца розьніца паміж чытаньнем кнігі — фізычнай структуры, дзе прысутнічае рэальны матэрыяльны аб'ект і тэкстура, і тым жа самым матэрыялам у электронным выглядзе палягае ў спосабе інтэракцыі чытача з гэтым матэрыялам. Аўтар «Гутэнбэргавых элегіяў» настойвае, што розьніца ня толькі ў дазнаньні і стылі пісьменьніка, але ў тым, што он-лайнавая падача тэксту робіць уважлівае засяроджаньне на ім, развагу і глыбокае асэнсаваньне амаль немагчымым. Біркерц піша: «Мудрасьць можа выжыць толькі як культурны ідэал, дзе існуе магчымасьць вэртыкальнай сьвядомасьці. Мудрасьць ня мае нічога агульнага са зьбіраньнем і ўпарадкоўваньнем фактаў — гэта азбучная ісьціна. Мудрасьць — гэта ўменьне бачыць «скрозь» факты, гэта здольнасьць пранікнуць за існуючыя законы і ўзоры. Яна мае дачыненьне да нечага большага, чымся проста зьмест —да бачаньня вялікай карціны, што паказвае імкненьне чалавека да жаданьня пранікнуць за межы вечнасьці. Для таго, каб чалавек бачыў ня проста інфармацыю, трэба, каб ён мог зазірнуць за тое, што стаіць за такой інфармацыяй... Адна рэч — зьбіраць факты, разьмяшчаць іх поруч зь іншымі фактамі паводле пэўнай схемы, але зусім іншая рэч — на самоце паразважаць пра гэтыя факты, дазволіўшы, каб голыя факты выклікалі пэўны разумовы ці душэўны рэзананс».

Можна сказаць, што «Гутэнбэргавы элегіі» зьяўляюцца баявым клічам да прыхільнікаў традыцыйнага мастацтва бараніць добрае і вечнае, якое вось-вось раздушыць «бяздушная электронная тэхналёгія».

Уладзімер Баранч

Чэслаў Мілаш

НЯЯРКАЯ КРАСА НІГІЛІЗМУ

Звычайны нігіліст

Найперш былі патрабавальныя розумы, што займаліся літаратураю й мастацтвам; затым іхні сьветапогляд пранікаў спаквапя ва ўсё шырэйшыя колы, аж нарэшце стаў уласнасьцю масавае культуры, то бок апазнавальным знакам звычайных розумаў. Заняло гэта нейкіх сто пяцьдзесят галоў.

Опіюм для народу

Рэлігія — гэта опіюм для народу, бо тым, што пакутуюць ад болю, прыніжэньня, хваробы, няволі, абяцае яна нагароду ў пасьмяротным жыцьці. Пры мэтамарфозе, сьведкамі якой кожны з нас, можа быць наадварот. Сапраўдны опіюм для народу — гэта вера ў нябыт пасьля съмерці. Вялікае ўцеха вынікае з таго, што за сваё сьвінства, апушчэнства, баязьлівасьць, забойства мы ня трапім пад суд.

Наадварот

У Польшчы сытуацыя сьведчыць пра перамену. Некалі была скептычная, моцна пазытывісцкая інтэлігенцыя і пабожныя людзі, што запаўнялі касьцёлы. У недалёкай нават будучыні можа быць іначай: хрысьціянства, якое змагаецца з паўсюднай няверaю, акажацца зацяжкім для масаў і бальшыню сваіх вернікаў захавае толькі сярод самых адукаваных.

Трыюмф звычаю

«Ён чытаў Сведэнборга». Съмех, бо насамрэч польская інтэлігенцыя ня любіць думаць пра рэлігію. Калі яна прызнаецца ў сваім каталіцызме, то робіць гэта ў нацыяналістычных і мэсіянскіх мэтах. Групы, якія цікавяцца рэлігійнай літаратураю, застаюцца на другім пляне.

Рэлігія і палітыка

Ёсьць такія, якія выбіраюць хутчэй Нішто, чымся рэлігію зь яе палітычным злом. Досьвед паказвае, што чалавек агортваецца ўзьнёсласьцю, чыстасьцю й высакароднасьцю высокае сфэры духу, каб выглядала, нібыта ён ня ведае, што робяць ягоныя рукі. Толькі калі б каталіцызм быў вольны ад гэткае дваістасьці, ён меў бы права ўпікнуць праваслаўю злачынствы Караджыча.

Пасьля зьдзяйсьненьня

Прарок эўрапейскага нігілізму Фрыдрых Ніцшэ з гордасьцю гаварыў: «Мы, нігілісты», — і акрэсьліваў, якой будзе «найскрайнейшая форма нігілізму». Гэта «погляд, згодна зь якім усякая вера, усякая перакананасьць у тым, што нешта адпавядае праўдзе, будзе пры патрэбе фальшывай толькі таму, што няма сапраўднага сьвету». Ніцшэ нават называў гэты погляд «боскім спосабам думаньня». Ён ставіўся з пагардаю ня толькі да хрысьціянства, але й да вельмі блізкага хрысьціянству будызму, а для Шапэнгаўэра меў пагардлівы эпітэт «дэкадэнт».

Ніцшэ, пэўне, ня быў бы задаволены, калі б мог пабачыць, для чаго цягам ста гадоў служылі ягоныя творы. А бязьмежная адвага бунтара, якой так ганарыўся? Што ж маем пасьля яе сёньня, калі патрэбная адвага, каб сьцьвярджаць нешта процілеглае?

Бедны Шапэнгаўэр

Чаму Шапэнгаўэр павінен быць філёзафам, прозьвішча якога паяўляецца, як сто гадоў таму, калі гаворка йдзе пра нігілізм эўрапейцаў? Шапэнгаўэр не заслугоўвае на гэта хаця б з прычыны высокага месца, якое займаюць у ягонай філязофіі сьвятасьць і мастацтва. А ў той меры, у якой ён залежны ад рэлігіі Далёкага Ўсходу, вывальненьне азначае ў яго збавеньне ад цяжару кармы. Толькі ў фальклёры літаратурных каўняў Нірвана была нішточтвам.

Рогат

Цынікам, якія рагочуць, убіваючы людзям у галовы, што няма ні дабра, ні зла, што жыцьцё — гэта грызьня зблытаных у клубок пацукоў, нельга сказаць: «Асуджаеце сябе на вечныя мукі», —бо съмяюцца яны зь веры ў жыцьцё пасьля съмерці. Можна аднак сказаць: «Асуджаеце сябе на выйгранку, і гэта будзе для вас дастатковай карою».

Задужа проста?

У 1873 годзе выйшлі «Д'яблы» Дастаеўскага, і ўсё там было ўжо сказана. Бо рэвалюцыя ў Расеі мела быць справаю інтэлігенцыі, нігілістычныя розумы якой дасьледаваў Дастаеўскі. Ленін быў блізкім крэўнікам герояў раманаў пісьменьніка. Калі Ленін зрабіў у 1917 годзе пуч (гэта быў пуч, штурм Зімняга палацу дастварыў на экране Эйзэнштэйн, таксама інтэлігент), здабыць уладу над Расеяй не перашкодзіў яму ніякі супраціў у розумах.

Прароцтва

Уладзімір Салаўёў у сваім творы «Тры размовы» (1900) піша пра сэкту дзірамольцаў у Расеі. Выдзяўбалі дзірку ў сьцяне хаты і маліліся да яе: «Сьвятая дзіра». Гэты культ нішточтва (задумаю аўтара была сатыра на талстоўства) рыхтаваў няпчасьці Расеі і Эўропы пры адроджаным агрэсіўным ісламе (хто, апрача Салаўёва, асьмельваўся прадбачыць такія рэчы?).

Ці ня будзе Нішто, сьвятая дзіра ў розумах заходняй Эўропы, спакусаю для ісламскага фундамэнталізму, які ў імя Бога выступае ўжо ня супраць іншаверцаў, а супраць людзей, пазбаўленых усякай веры?

Пераклаў Юрась Бушлякоў

PROMENADE

Паверыць у казку

Парыж — горад, у які прыяжджаюць шукаць надзвычайнае. Але ці можа зьдзівіць казка, калі вядома, што яна казка? Парыж — казка, якую наўперад ведаеш ці не на памяць. У гэтым горадзе сапраўды можна рушыць у любым кірунку, і патрапіць да сусьветнай славутасьці.

Хтосьці выходзіць да Вежы Эйфэля, хтосьці — да дамавіны Напалеона. Я неспадзявана спаткаў Нотр-Дам дэ Пары. Калі я ўбачыў Сабор, ўзгадаў хлопчыка-манаха з рамана Місімы «Залаты Храм». Хлопчык спаліў найвыбітнейшую ў Японіі бажніцу, бо ня вытрымаў іспыт прыгажосьцю. Думка ўсплыла, калі я заўважыў, як зухава нэгры-падлеткі ганяюць бляшанку з пад «кока-колы» проста перад парталам Нотр-Дам. Экзотыка, якой ня прагнеш.

Сабор цудоўна глядзіцца ў любы час дня, але лепей знаёміцца зь ім у нядзелю ўвечары, калі запальваецца каляровая падсьветка. Тады можна ўбачыць, як маладыя парыжане гуляюць у прыкметнасьці гораду. Гэта файнае відовішча, калі некалькі маладых параў, уладкаваўшыся на парапэце над Сенай на фоне Нотр-Дам, чыняць адмысловую пантаміму, дзеля настрою, не за грошы. А з прамэнаднага кацеру іх асьвятляе безьліч фотамаланак. Турысты радуюцца. Удзельнікі казкі гуляюцца ў казку... Парыж уражвае шточасова, але толькі аднойчы на некалькі хвілінаў я паверыў у сапраўднасьць. Гэта быў вобраз аднога з сумных парыскіх сюжэтаў.

Пон-Нэф — найстаражытны мост Парыжу. Ён злучае Ліль дэ ля Сітэ — востраў-«калыску» — з астатнім горадам. Тут Напалеон упершыню ў сьвеце ўжыў шрот падчас аднога з «разгонаў дэманстрацыі», тут да сярэдзіны XVIII ст. месьціўся парыскі «гандлёвы цэнтар», які ўрэшце ляснуў у Сену...

Гэты мост бачыў ці ня ўсё жыцьцё Парыжу. Для мяне ён — месца гісторыі «Закаханых з Пон-Нэф» у фільме Леа Каракса. Як толькі я ўбачыў гэтую грандыёзную пабудову, я ўзгадаў, што Пон-Нэф прыцягвае да сябе самагубцаў з усёй Эўропы. «Убачыць Парыж і памерці», гэтыя словы прыгадваюцца зь вясёлай усьмешкай, калі ахінаесься ў сьвята жыцьця на вузкіх вулках сярэднявечнага Парыжу.

Шчыра кажучы, рэальнае адчуваньне сьвята жыцьця ўзьнікае толькі на Манмартры. Ня ў той яго частцы, дзе, як кажуць парыжане, можна за дзень навучыцца размаўляць па-японску, бо ля славутай царквы Сакрэ-Кёр не прыпіхнуцца сярод японцаў, паўднёвых карэйцаў, немцаў, і, натуральна, амэрыканцаў. І не ў заходняй частцы гары, цалкам занятай прадстаўнікамі «найбяднейшай часткі сярэдняй буржуазіі», ціхай і чыстай. Гара Манмартр вельмі вялікая, прынамсі, настолькі, каб быць падобнай да мадэлі ўсяго Парыжу. Калі вы жадаеце адчуць сапраўднае сьвята жыцьця, лепш за ўсё выбраць нядзельку, і ўвайсьці ў Манмартр з боку Паўночнага Вакзалу. Вы ўбачыце барахолку кшталту тых, што йснавалі ў Менску па вайне, вы адчуеце пах марыхуаны, вы заўважыце як паліцыянт п'е каву разам зь нейкім хіпаном... Немагчыма адразу зразумець прычыну сьвяточнасьці атмасфэры. Бо ж і бойка ў вас на вачох успыхнула, і алканы праз крок «страляюць» франк на

піва, і бруд, бруд наўкола... Але. Тут няма месца штучнасьці. Тут кожная ўсьмешка — шчырая, кожнае слова адпавядае думцы. Тут пагроза рэальная, а дапамога — ад сэрца. Тут зьбіраюцца патэнцыйныя самагубцы Пон-Нэф.

Хоць раз у жыцьці чалавек перажыве адчуваньне, блізкае да яснавідзтва. Калі момант ісьціны наступае перад зьдзяйсьненьнем падзеі. Раней хаця б на імгненьне. Такое адчуваньне, калі я паверыў у важнасьць і сапраўднасьць падзеі, я меў у Парыжы аднойчы ля Пон-Нэф.

Дзяўчына сядзела на вузенькім бардзюрчыку па-за балясамі маста проста над сярэдзінай ракі. Яна абхапіла рукамі каленкі, апусьціўшы галаву долу. Даўгія валасы вольна луналі ў паветры. Было цёмна, але вечаровае асьвятленьне яшчэ не ўключылі, адно на даляглядзе вымалёўваліся агні вярхушкі Эйфэлевай Вежы. Я амаль бег да дзяўчыны, ажно дух захоплівала ад таго, што проста зараз магу ўбачыць, як ейная далікатная фігурка сягне ў ваду...

«Вы жадаеце ўпасьці ўніз?!», — недахоп лексыкі робіць пытаньне неакрэсьленым. Дзяўчына ўскідвае на мяне адурэнна прыгожыя вочы і праз колькі сэкундаў разумее сэнс пытаньня —ў вачох БЯЗЬМЕЖНАЕ зьдзіўленьне. Разгаварыліся. Дзяўчына з паходжаньня мараканка, з шасьці гадоў стала парыжанкай. Вучыцца ў мастацкім ліцэі, што побач з маім гатэлем, недалёка ад Пэр ля Шэз.

Размаўляем пра архітэктуру, і пра тое, што парыжане ня ў стане адчуць усю прыгажосьць свайго горада... Што да майго пытаньня, то большага зьдзіўленьня яна ўжо даўна не перажывала. «Дзякуй табе, іншаземец невядомай мне краіны. Удачы табе ў нашым дзіўным непаўторным горадзе. У тым, што ён такі, я толькі што яшчэ раз ўпэўнілася». На гэтых словах да яе падыйшоў малады мараканец, яны абняліся і сышлі. Я паглядзеў у ваду Сены. Сапраўды, які ж парыжанін будзе кідацца ў такі бруд? У Парыжы паміраюць эстэтычна й мудрагеліста — атачэньне абавязвае. А для сучаснай парыскай моладзі скокаць з Пон-Нэф — банальна да пошласьці.

А магчыма яны памыляюцца. Сапраўдныя каштоўнасьці не старэюць.

Севярын Квяткоўскі

MCDONALD'S У МЕНСКУ

Сотая краіна

Адкрыцьцё трох першых фірмавых закусачняў McDonald's у Менску выглядала ўрачыста. Бакі дэманстравалі згоду, і таму дзьве прычыны: для кампаніі McDonald's Беларусь — сотая краіна, дзе ўкладаюцца грошы ў работу фірмавых экспрэс-рэстаранаў; для Рэспублікі Беларусі — гэта трэці буйны (памерам 25 мільёнаў даляраў ЗША) інвэстыцыйны праект пасьля «Форду» і «Кока-колы». Аднак нягледзячы на сьвята, падрыхтаванае для неразбэшчаных сэрвісам беларусаў, застаюцца праблемы: перамовы для ўзгадненьня умоваў разьвіцьця сеткі рэстаранаў паміж урадам Беларусі і кампаніяй «McDonald's Central Europe» зацягнуліся, не прывёўшы да адзіных падыходаў адносна тэксту мэмарандуму пра паразуменьне, непадпісаньне якога абарочваецца адсутнасьцю ўзаемных гарантыяў. Калі замежнае прадпрыемства «Рэстараны McDonald's» не атрымае абяцаных ільготаў на ўвоз абсталяваньня і паўфабрыкатаў, зынакшаша цяперашнія цэны і пад сумневам будзе будаўніцтва чацьвертага рэстарану ў Менску ў ажыўленым раёне чыгуначнага вакзалу.



Першая партыя мяса для пухнатых гамбургераў была прывезеная зь Нямеччыны. Відаць, з экалягічных меркаваньняў. Шляхетна паводзіць сябе McDonald's, ня вельмі — беларускі бок: замежнае прадпрыемства вымушанае купляць валюту на Міжбанкаўскай валютнай біржы на свабодных таргах, плацячы за яе не паводле курсу Нацыянальнага банку. Ці высакародная справа рызыка — пра гэта скажа пазьней дырэктарка рэстаранаў McDonald's у Менску Карэн Бішап, якая цяпер адзначае: «Мы выдатна разумеем, зь якою мэтай рызыкуем, і лічым гэта абгрунтаваным». Цікавы такі факт: ужо падчас рамонту спэцыялістам давялося перапляноўваць канструкцыю ганку ў рэстаране на праспэкце Скарыны, 23. Так вырашыў мэр Менску. Першапачатны варыянт не адпавядаў сваёю вышынёй ветру і даўжыні спадніцаў беларускіх красуняў. Ну як не падаць цывілізаванаму сьвету экзатычнай навукі цноты.

Тры рэстараны, адзін зь якіх замяніў у цэнтры Менску сапраўдную дзіру, працуюць. Юнакі й дзяўчаты з вышэйшаю адукацыяй старанна пакуюць традыцыйны асартымэнт рэстарану і пакуль яшчэ з усьмешкай прапануюць яго менчукам. Першай пад'ела прадстаўнічая кампанія — мэр Менску Ярмошын, кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Мясьніковіч, старшыня Нацбанку Вінынікава, міністар прадпрымальніцтва і інвэстыцыяў Сазонаў і шматлікія іншыя. Юбілейнасьць Беларусі для McDonald's і жаданьне апошняга надзейна ўладкавацца тут — а ёсьць пляны адкрыць рэстараны ў Гомелі, Горадні й Берасьці — паўплывалі на пастанову кампаніі зрабіць нашай сталіцы прэзэнт — машыну хуткай дапамогі.

Будучыя сталыя кліенты — жыхары Менску сабраліся на ўрачыстае адкрыцьцё рэстарану апоўначы зь 9-га на 10-га сьнежня. Іх было шмат: тысячы. Пры ўваходзе ў рэстаран на праспэкце Скарыны, 23 ахвотнікаў стрымліваў амон. Не абышлося без дубінак. Праўда, ня ўсім трапіў запаветны бігмак за адзін даляр.

Ну а пільны беларускі прэзыдэнт у апублікаваным 11 сьнежня інтэрвію ў газэце «Русский курьер» — органе шавіністычнага расейскага Нацыянальнага адзінства — адзначыў, што начную акцыю каля рэстарану спляновала апазыцыя, сабраўшы людзей з мэтаю дыскрэдытацыі Беларусі празь нібыта бясплатныя катлеты. Аляксандар Лукашэнка паведаміў таксама, што апазыцыя меркавала пачань бойку з аховай прэзыдэнта, бо была інфармацыя, што кіраўнік дзяржавы возьме ўдзел у адкрыцьці рэстарану. Але ж не, першы беларускі прэзыдэнт закусачняў не адкрывае.

Між іншым, фаерверкі ўначы напалохалі пацыентаў недалёкага шпіталю, што на Чырвонаармейскай. Людзі падумалі там, што пачынаецца вайна. І ў горадзе танкі. Вайна, калі й пачалася, то за цывілізацыю. Пачатак мінулага тыдня запамятаецца паломніцтвам каля дэмакратычных замежных рэстаранаў — людзей там было больш, як на масавых акцыях у абарону дэмакратыі.

Агата Гетэман

Калі глянуць на нашыя абшары з аблокаў, то руіны старажытных замкаў пабудуюцца ў малюнак імклівае маланкі. Як бы мы не глядзелі на малу Беларусі, ці сёньняшняе, ці колішняе, яна ўсё адно нагадвае хмару. Хмару, працятую маланкай...

Можа ў гэтым і быў нейкі знак таго, што Беларусь — краіна навальніцаў.

У кожнага з нашых замкаў быў свой лёс. Найчасьцей трагічны — іх сотні разоў бралі ў аблогі, палілі, руйнавалі дашчэнту... Ад навальніцы да навальніцы іх ледзьзве пасыпявалі падымаць з друзу. Многія замкі так і не ўзьняліся, а за савецкім часам пераўтварыліся ў зьдзірванелыя крушні, альбо не пакінулі па сабе нат знаку...

Але некаторым замкам пашанцавала датрываць да тае пары, калі зь іх парабілі навучальныя дапаможнікі для дзяцей ды прынады для турыстаў, яны патрапілі на плякаты, буклеты, календары.

Што гэта за замак? Зь якімі імёнамі ён зьвязаны?

Сяргей Харэўскі

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Л.С. зь Ліды. Апавяданьні маглі б быць надрукаваныя, калі б Вы даслалі нам першы, а не другі асобнік машынапісу.

В.З. з Гомеля. Казачка хоць і праўдзівая, але загладкая, літаратурна нецікавая.

В.Н. з Горадні. Рэпартаж з адкрыцьця фотавыставы без ілюстрацыяў можа быць апрацаваны хіба што ў радыёперадачы.

Наступны нумар "Найшай Нівы" выйдзе 30 сьнежня 1996 г.

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу ніву" абавязковая. Наклад 5100. Нумар падпісаны ў друк 19:00, 15/12/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №1851. Кошт свабодны.